НАША НІВА

Беларуская газэта *Вільня №13. 1993*

СЬМЕРЦЬ ГЕТМАНА Вінцэнта-Гасеўскага. Фрагмэнт беларускай гісторыі XVII стагодзьдзя — у пераказе Генадзя Сагановіча: За што жаўнеры забілі свайго ўлюбёнага каманьдзера?..

БЕЛАРУСКІЯ ПАЛЯЎНІЧЫЯ АДДЗЕЛЫ (егерская служба) ствараюцца з кандыдатаў у грамадзянства БНР — на правох паляўнічых таварыстваў пры філіях Беларуска-Кельцкага Зьвязу. Маюць узбраеньне — паляўнічыя стрэльбы, а таксама сабакаў — ірляндзкіх сэтэраў, што найлепш дачуваюць каманду па-беларуску. Перамяшчаюцца на раварох і пеша. Маюць ранжыр. *(Са Статуту БПА)*

МІЛАРАД ПАВІЧ Хазарскі слоўнік. Фрагмэнты трох кніг пра прынцэсу Атэх (IX стагодзьдзе), якая, магчыма, была першым аўтарам гэтага слоўніка, — упершыню па-беларуску.

Лёнданская лекцыя прэзыдэнта БНР



Апавяданьне

У ЦІШЫНІ НАЧЫ

С.Пхоў

Позна ўначы не хадзеце па вуліцы! Там гуляе грубая сіла й гаспадарыць гвалт. Іх законы незразумелыя, а ўчынкі заўжды нечаканыя. Іх вочы тояць прыцягальны жах, падобны да вусьцішнай бездані чорнага неба, а боязь сустрэцца зь імі вабіць нібы магнэс!

І таму я выходжу на вуліцу позна ўначы.

Мне здавалася, што я добра ведаю гэты горад, кожны будынак, кожную шыльду па-над вакном. Але цяпер усё выглядае інакш. І ў гэтай нязнанасьці я адчуваю злавесны сэнс.

Вулічны страх спакваля дасякае да самага сэрца. Спачатку вас ахінае змрок, пасьля вы заўважаеце, што на вуліцы пуста. Але гэта падманлівая пустата, яна ўся працятая напружаным чаканьнем, якое даводзіць да панікі, да істэрыі!

Я іду па вуліцы Вежы — паміж скрывуленых камяніц, што затаіліся ў цемры — да вежы. Недзе тут хаваецца грубая сіла. У цішы я чую кожны скрып маіх чаравікаў. Больш няма ані гуку на гэтым шляху між зачыненых дзьвярэй і вакон. Толькі ў дварох чуваць пранізьлівыя каціныя віскі — так падобныя да няўцешнага дзіцячага плачу. І гэта зусім невыносна — дзіцячыя крыкі ў пустым горадзе, які сьпіць.

Я насьцярожваюся, я думаю: вось, зараз выйдуць яны і толькі зірнуць на мяне — я адразу страчу і голас і рух. Я здранцьвею ўвесь і, вядома, нічога ня здолею сказаць ў адказ. Мне прасьцей было б напісаць. Але ж яны не чытаюць нічога ніколі, тым болей цяпер. Яны паводзяць сябе так, быццам усё тут належыць ім. Магчыма, мне трэба неяк абвергнуць іхнюю нахрапістую пэўнасьць. Але як? Хай бы яны адразу пачыналі біцца, — я б паказаў ім, на што я здатны. Хай бы нават загінуў. Але сам распачаць не змагу. І крычаць ім якіясь абразы — так невыносна!

Сонная вуліца бліжай да вежы робіцца ўсё больш напружанаю — Усё, што тут ёсьць, усё творыць гэты псыхоз: самотныя ліхтары адкідаюць марнае сьветліва, рэдкі дождж блішчыць на каменьні дзікага бруку, крывыя муры старажытных дамоў усьміхаюцца ці рагочуць ці крычаць чорнымі бяззубымі ратамі сваіх выгбаў, нібы квазімоды, — іхні жах памнажае іхняя старажытнасьць. Вусьціш вечнага гораду зноў нагадвае мне сказ пра пачвару, што калісь хавалася ў сутарэньнях пад вежай.

Пачвара забівала людзей паглядам. І пагляд яе быў падобны да бездані чорнага неба — прыцягальны й сьмяротны. Шмат людзей загінула ад яе забойчых вачэй. Але аднойчы людзі паслалі ў сутарэньні злачынцу-сьмяротніка. Ён марудна ішоў цёмным каменным праходам. І калі пачвара выскачыла з-за павароткі, каб забіць яго сваім жахлівым паглядам, ён павярнуўся да яе сьпінаю. А на сьпіне ў яго было прымацаванае люстэрка. Пачвара сустрэлася вачыма сама з сабою. Жудасны лямант разарваў цішыню начы. І ўсё скончылася...

Ад успаміну мяне працяла халодным потам. І тут у першым паверсе

Працяг на старонцы 4.

Ад Рэдакцыі

Дзёньнік прыватнага чалавека

* * *

Чалавек сам мусіць знаходзіць сабе працу, жытло й месца ў грамадзтве... Гэты згодны з прыродаю прынцып — ня што іншае як парафраза натуральнага адбору — ўсталёўваецца сёньня ў краіне, якая, колькі сябе помніць, кіравалася чымсь адваротным. Напэўна, калі й магчыма перавучыць народ — на гэта патрэбныя час і настаўнікі. Але няма ні першага, ні другога. Ад савецкага чалавека застаўся толькі аптымізм, зь якім прымаюць новую ўстаноўку і людзі, і кіраўнікі. Чалавек балянсуе на мяжы беспрацоўя, голаду й жабрацтва, але пры гэтым ён — *за* такія перамены. Ён зноў верыць у лепшае заўтра, хоць ніхто гэтае заўтра не будуе, ніхто ня ведае, як яго будаваць. Ён безаглядна верыць у дзяржаву. У яго зусім аслабленая воля да свабоды, незалежнасьці й жыцьця. Урэшце як яму рэалізаваць такую волю — няўчэпістаму, няўпартаму, няцьвёрдаму. Ён і паміраць будзе зь вераю ў нешта лепшае... Робячы ўстаноўку на натуральны адбор, дзяржава мусіла б гартаваць у чалавеку волю да выжываньня й якія-небудзь самыя элемэнтарныя зубы.

* * *

Пушкіна любяць цытаваць у адказ на пытаньне, чым адрозьніваецца чалавек ад жывёлы: гістарычнай памяцьцю, маўляў... А сёньняшнія жабракі на вуліцах выклікаюць жывёльную гідлівасьць. Яны сядзяць на кожным мэтры (я думаю — таксама ж мафія! Падзялілі праспэкт. Можа, і свае разьмяркоўшчыкі ў іх ёсьць і свой рэкет), яны — каля кожнага шапіка (варта табе ўзяць бутэльку напою, як тут жа падскоквае які-небудзь экс-піянэр ці замызганы дзядзька ці цётка прапітая: «бутылочка вам не нужна будет?»). Яны ўсе гавораць па-расейску. Толькі адна кабетка каля тытунёвага шапіка — уся ў нейкіх дзівосных тэатральных апранахах, густа нафарбаваная — нязьменна па-летувіску й нязьменна вінавата просіць кожнага разу 10 талёнаў. Гэткі акультураны варыянт жабрацтва... Спачатку я падумаў, што жабрацтва вяртае людзей у стан жывёлаў. Але ж у жывёлаў жабрацтва няма. І гэта якраз мая гідлівасьць — жывёльная. Так што Пушкіна можна дапоўніць — чалавек адрозьніваецца ад жывёлы яшчэ й жабрацтвам. Непрыемнае адкрыцьцё. Жабракі — вынік адмены натуральнага адбору. Большасьць зь іх або не знаходзяць сабе прымяненьня, альбо нішто іх не сарамаціць, альбо — для нямоглых — няма падтрымкі дзяржавы. Ідэалёгія нацыяналізму мела б шанцы і ў гэтай справе. Нацыя-сям'я саромелася б такой зьявы й знаходзіла б прымяненьне моглым і падтрымку нямоглым, урэшце, самі жабракі саромеліся б жабраваць. Здаецца, у РБ (асабліва не ў сталіцы) сёньня яны саромеюцца больш, чым у Вільні.

У падмурку цывілізаванага парадку ляжыць пачуцьцё прыстойнасьці.

* * *

Нельга разважаць пра тыя ці іншыя моўныя нарматывы, пра моўную рэформу і ўдасканаленьне правапісу пакуль у дачыненьні да мовы існуе маральная праблема. Датуль уся гэтая публічная мітусьня з «тарашкевіцамі»-«наркомаўкамі», развагі пра няўрымсьлівых пачаткоўцаў, якія «хочуць вылучыцца», пра «мову дыяспары», пра тое, што й Ластоўскі зь Лёсікам былі ў прынцыпе супраць мяккага знаку, што «народ не прывык» і г. д. — усё гэта акты ў дачыненьні да мовы амаральныя. Варта было прызнаць злачынную дзейнасьць Сталіна, як адразу прыціхлі публічныя шукальнікі ягоных «станоўчых бакоў». А было ж — і вайну выйграў, і краіну зрабіў вялікай дзяржавай, і не згуртаваліся б вакол яго лепшыя галовы... Было, што пра кожнага «ворага народу» й «замежнага шпіёна» думалі — нешта ж ёсьць — нават калі гэта брат твой ці сябра. Было, пакуль ворага й шпіёна не рэабілітавалі. Тое ж адбываецца і з мовай. Дагэтуль яна нерэабілітаваная. Дагэтуль разважаюць — а мо й праўда, нешта ёсьць? «Нешта ёсьць» у той пастанове СНК, так падобнай на прысуд тройкі.

Што можа быць «нешта» ў мовы, акрамя здраднікаў? Мараль тут простая, як прамень. Пастанова СНК 1933 году мусіць быць прызнаная рэпрэсіяй і адмененая. І толькі пасьля ўжо з поўным маральным правам можна на ўсе галасы абмяркоўваць, замяняць, дасканаліць, а каму хочацца — то й прыніжаць «дыяспару», якая гэтую мову захавала і асуджаць прагавітых пачаткоўцаў. Маралі ня можа быць толькі ў дачыненьні да мовы як «средства общения». Мова-средство — рэч безадказная, безабаронная і ўвогуле нежывая. Але ёсьць яшчэ мова-маці. Прыйдзе час, і яна спытае найперш па маральных рахунках.

Лёнданская лекцыя

Прэзыдэнта БНР Міколы Абрамчыка аб прыродным багацьці Беларусі

Апрача партфэлю з дактрынамі, нотамі й мэмарандумамі, прэзыдэнты маюць звычайна і сваю «казку» — свой варыянт сьветлае будучыні свайго краю. Гэта тое, што сьніцца ў снох і дзеля чаго ўласна й падымаюцца на барацьбу палітыкі, войскі, людзі. Быў свой варыянт аптымізму і ў дзеячоў БНР — падстава безумоўнае веры, што незалежная, свая Беларусь — патэнцыяльна адна з багацейшых краінаў сьвету. Частка гэтага палітычнага эпасу — лёнданская лекцыя Прэзыдэнта Міколы Абрамчыка. Цікавая псыхалягічная асаблівасьць — гэта разуменьне беларускае гаспадаркі, выказанае не эканамістам, а гаспадаром. Гэтак лёгка валодае ён матэрыялам. У Абрамчыка-гаспадара яшчэ ня выпрацаваўся той глыбокі ўнутраны недавер да беларускае незалежнасьці, эканамічных патэнцыяў і ўласных гаспадарчых магчымасьцяў, які спрэс заўважны ў цяперашніх кіраўнікоў Беларусі. Яго лекцыя — гэта аповесьць пра мару, — верагодную і шчырую. Да таго ж гэты тэкст — рэдкі прыклад футуралягічнага прагнозу, які з часам толькі набывае сваю каштоўнасьць, бо штось спраўджваецца, штось не, а штось забылася ды вартае напамінку.

Рэдакцыя «НН» дзякуе жонцы Прэзыдэнта сп-ні Ніне Абрамчысе-Ляўковіч, якая перадала нам гэты матэрыял для публікацыі, а таксама сп. Сьцяпану Дуж-Душэўскаму, які прывез гэты матэрыял з Парыжу.

Стыль і правапіс аўтара збольшага захаваныя. Друкуецца зь нязначнымі скарачэньнямі.

Лёндан, аўдыторыя ЗБВБ,
3 жніўня 1947 г.

Дарагія Сяброўкі й Сябры.

Сяньня раніцай Ваш вельмі паважаны Старшыня запрапанаваў мне паехаць за Лёндан, каб крыху асьвяжыцца й пакупацца. Выйшаўшы з царквы, кажа: «Не. Было б лепей прачытаць даклад... хлопцы просяць». Прыняў гэта я зь вялікім задавальненьнем.

Паверце, Дарагія, што такая гутарка з Вамі мяне асабіста яшчэ больш асьвяжае, чым якія-небудзь прагулкі ці купаньні.

Калі толькі станаўлюся насупраць Вашай грамады, што ўселася з паважнымі тварамі — мяне адразу электрызуе нейкая асаблівая сіла. Ваш атлетычны выгляд, Вашая вайсковая здысцыплінаванасьць і запраўды гэтак шчырая сямейна-сяброўская дружба стварае адразу атмасфэру, у якой на ўсю шырыню грудзей так лёгка й прыемна дыхаецца.

Думка аб тым шляху, які бальшыня з Вас прайшла ад Сібіру праз Монтэ Касіно, і тыя так цяжкія абставіны Вашай сяньняшняй працы, сьціскае моцна сэрца якімсь балючым жалем, ды зноў прыемны халадок пранясецца па грудзёх, калі бачу ў Вашых тварах нястомнасьць, рашучасьць, запал і цьвёрдую веру ў будучыню.

Перажываю гэта асабліва цяпер, бо сяньняшняя гутарка з Вамі, здаецца, ужо апошняя, разьвітальная.

Выбачце за такі, здаецца, не на тэму аб «нашым багацьці» ўступ. Але можа й не? Ці ня варта й гэта залічыць да нашага багацьця?

Самую ж тэму дакладу зноў жа прадыктаваў мне Ваш Старшыня. Дагадваюся чаму.

Пасьля таго, як наш народ пачаў, як кажуць, падымаць галаву, зь першых дзён нашага адраджэнча-вызвольнага руху, на нас пасыпаліся з усіх бакоў сыканьні: «Куды, чаго! Як вы сьмееце? З чаго будзеце жыць?..» Нашыя праціўнікі парупіліся шырака «распапулярызаваць» аб нас «тэорыйкі», зь якіх выглядала, што Беларусь — гэта выняткова на цэлай зямной кулі якаясьці пляма, праклятая Богам, на якой ні зьверху, ні ўнутры ня маецца нічога карысна-гаспадарчага, неабходна-патрэбнага чалавеку.

Прапаганда гэтая мела адзіную мэту: укараніць зьнявер'е ў беларускім народзе й адбіць у яго ўсялякую ахвоту ў імкненьні да самастойнага, дзяржаўна-незалежніцкага жыцьця. Бо, як жа будзе выглядаць гэтая незалежная дзяржава, калі яна ня мае да гэтага ніякіх гаспадарчых падставаў?

Вось мы зараз і разглянем запраўды яно так ці не. Мне выбачце за недакладнасьць мо ў цытаваньні лічбаў, што звычайна вымагаецца ў такім дакладзе. Дзеля гэтага патрэбна было б сесьці на добрых пару тыдняў, калі ня месяцаў, у бібліятэку, каб іх павыпісваць і аблічыць. Мой жа, як бачыце, даклад — «на хаду» ды й неспадзявана.

Пэўны аднак, што буду шмат разоў канкрэтнейшы ў сваёй аргумэнтоўцы, чым аўтары аб нашай гаспадарчай «беднасьці», у чым спадзяюся, дапаможа мне памяць аб калішніх маіх студыях эканомікі Беларусі.

Легенды аб прыроднай беднасьці Беларусі

Скуль яны паходзяць і на чым абапертыя?

Амаль да канца 19-га ст. у заходнеэўрапейскай эканамічна-палітычнай літаратуры, а ў больш адсталых краінах і пазьней, была досыць папулярная тэорыя аб гэтак званай *гаспадарчай аўтаркнасьці*.

Пад аўтаркнасьцяй разумелася такую дзяржаву, якая, з пункту гледжаньня гаспадарчага, павінна была быць абсалютна *самадастатковай*, гэта значыць, што ўсе неабходныя прадукты да жыцьця чалавека й дзяржавы павінны былі б знаходзіцца ў собскіх граніцах.

Такіх неабходных галоўных прадуктаў для сучаснае дзяржавы нарахоўвалася штось каля 22. Для тэхнікі й будаўніцтва, напрыклад, — вугаль, газа (нафта), розныя мэталы, камень, дрэва, для жыцьця й адзежы чалавека — збожжа, жывёлы, вата, лён і гэтак далей.

Дзяржава, якая б мела ў сябе гэтыя прадукты ў дастатковай колькасьці, была б ідэальна аўтаркнай, знача, абсалютна ні ад кога не залежнай, а ў часе вайны — найбольш моцнай і вытрывалай.

Практыка аднак паказала, што ідэя аўтаркіі не вытрымлівае крытыкі ні ў сэнсе эканамічным, ні ў сэнсе ваенным. Эканамічна яна прыводзіць да абсурднасьці, бо многія дзяржавы ў пагоні за аўтаркнасьцяй пачалі былі разрабляць ці прадукаваць у сябе рэчы, эканамічна зусім неаплатныя, як, напрыклад, СССР, захацеўшы абавязкова «дагнаць і перагнаць» Амэрыку ў здабываньні золата, — мусіў урэшце ў 1938-м годзе зачыніць свае шахты дзесь у Сібіры, хоць і карыстаўся пераважна рабочай сілай ссыльных нявольнікаў. Амэрыканскія спэцыялісты былі высланыя ў Амэрыку, а ссыльныя работнікі дзесь на лесазагатоўкі, і, секучы бярвеньне, далі ў соткі разоў больш золата дзяржаве, як пры капаньні яго.

Прыкладаў такіх можна было б падаць шмат і з практыкі некаторых эўрапейскіх дзяржаваў у калішняй пагоні да аўтаркнасьці, узяць хоць бы сабе падобныя выпадкі ў прадукцыі цукру і г. п.

Агулам жа, ідэю аўтаркнасьці не зрэалізавала ніводная ў сьвеце дзяржава. Найперш таму, што не знайшлося

КРУГЛАЯ ДАТА

Антон Сіюль

Юбілеі — як іх адзначаць цяпер? Загадаюць апублікаваць артыкулы ў перыёдыцы, правесьці тэматычную выставу, паставіць помнік, зрабіць тэлеперадачу... Ранейшыя спосабы ў наш час выглядаюць трывіяльна. «Загады! Тут не загады патрэбныя, а ўяўленьне!», — кажа адзін з герояў Камю...

Уяўленьне найлепш працуе каля вогнішча, на беразе ракі, калі сонца, так і ня вызірнуўшы з-за хмараў, патанае ў імгле. Тут можна паразважаць і пра юбілеі. Да прыкладу, пра юбілей помніка Леніну ў Менску. Яго адкрыцьцё адбылося ў 1933 годзе, 7 лістапада на 16-я ўгодкі Кастрычніка. Гэтай падзеі папярэднічаў усесаюзны конкурс, пераможцамі якога сталі скульптар Манізер і архітэктар Лангбард (які ўжо спраектаваў будынак Дом ураду). Такім чынам, сёлета круглая дата.

Падкінем дроваў.

Пакідаць помнік, які нясе ў сабе магутны ідэалягічны зарад, не адпаведны месцу й часу — нельга. Першы суразмоўца прапануе — трос на шыю чорнаму стодзіву! І пад фанфары ды бліскавіцы, пры вялізным зборы народу — зрынуць у нябыт.

Другі пярэчыць: тут менавіта брак уяўленьня, бо куды цікавей увайсьці яго пасярод Сьвіслачы, якая таму помніку па пояс. Стаяў бы сабе Ільліч, некуды рукою махаў, а вакол разварочваўся б рачны капярок зь дзятвою.

Трэці кажа рашуча — на Сотбіс!.. Але ці не перанасычаны ўжо Сотбіс такімі «скарбамі»?

Чацьверты: помнік вялікі, эстэтычна й гістарычна каштоўны, яму трэба было б падшукаць прыдатнае месца — у адмысловым сквэры, сярод астатніх сымбаляў эпохі — дзяржынскіх, калінінаў, кіраваў...

Пяты, па-сялянску разважлівы і спакойны: помнік трэба схаваць, да часу, а там, гадкоў праз нацацаць разьбярэмся. Можа будзе калі на Беларусі Музэй мастацтва XX стагодзьдзя — там і паставім...

Вялізны, неабсяжны архіпэляг савецкае культуры — у адначасьсе пастаўлены на мяжу поўнага адмаўленьня. Узоры культуры, вартасьць якіх не падлягала сумлеву, а значыць і тлумачэньню, сёньня выклікаюць пытаньні: што з гэтым усім рабіць? выкінуць? пераацаніць? закансэрваваць? І ў кожным месцы, дзе сыходзяцца пяцёра — гучаць пяць розных адказаў.

А тым часам падступаюць новыя круглыя даты, і новыя помнікі лепяцца, адліваюцца, спаборнічаюць у конкурсах. Скарына, Каліноўскі, Багушэвіч... Зробленыя да юбілею Дуніна-Марцінкевіча, але не пастаўлены яшчэ помнік быў скрадзены на мэтал. Ну, хоць пасьпелі адліць.

З наступнымі юбілярамі больш складана. Да конкурсу на помнік Скарыну было прадстаўлена з тузін постацяў у балахонах і барэтах. Тузін барэтаў! Ці знойдзе Скарына свой?.. Яшчэ цяжэй з вобразам. Скарына — гуманіст? Адносная ўяўленьне, ніякіх уласных адносінаў, ніякай сыстэмы каардынат... Так і не дамовіліся пра месца для гэтага помніка ў Менску. Бо няма яшчэ месца самога Скарыны ў цяперашніх уяўленьнях. Можна ставіць і тут, і там, можна ў барэце, а можна без. Сёньня Скарына А.Глебава (1954) выглядае неперасўзыйдзеным. Можа таму, што ў Глебава Скарына — работнік. А гэта ўсё ж ясьней, чым Скарына — гуманіст.

Кім уяўляецца скульптару Сымон Полацкі, калі ён лепіць яго ў выглядзе лямпады (ці лямпаду ў выглядзе Сымона)?.. Адзін з аўтараў праекту помніка Багушэвічу шчыра зьдзівіўся, што паэт пры жыцьці друкаваўся выключна лацінкаю. Але праекты зробленыя. І адрозьніваюцца яны толькі парай-тройкаю стэрэатыпных дэталяў і рысаў. Скарына — у барэце, Багушэвіч — з вусішчамі, Каліноўскі — сківіцы, бакі, насупленыя бровы. Яшчэ антураж — косы, вілы, званы.

Што чакае гэтыя помнікі? Пашана? — як было паўстагодзьдзя з манізэраўскім ленінам? А потым...

Вогнішча дагарае. І думкі згасаюць, расплываюцца ў вечаровай смузе...

ў сьвеце ніводнай дзяржавы, якая б мела поўнасьцю гэныя 22 прадукты, а па другое, цягнуць «за вушы» тую прадукцыю, якая эканамічна нявыгадная, няма сэнсу.

Дзеля таго нават Злучаныя Штаты Паўночнай Амэрыкі ня ёсьць аўтаркнай дзяржавай, доказам чаго бачым абмен таварамі зь іншымі дзяржавамі. А таму і пра іх нельга сказаць, што яны зьяўляюцца эканамічна зусім незалежнымі.

Словам — аўтаркія як ідэя й тэорыя ва ўсім цывілізаваным сьвеце ўважаецца ўжо даўно аджылай, пахаванай. На яе мейсцы запанавала тэорыя эканамічнай мэтазгоднасьці.

Багацьце народу, дзяржавы, а разам з гэтым і яе эканамічны, культурны й палітычны патэнцыял, ня столькі залежыць ад таго, ці дадзеная дзяржава будзе мець тыя 22 прадукты, ці 10, ці колькі там, а ад таго, як надатныя яны для эксплёатацыі й як яны будуць выкарыстаныя, ды як будуць выкарыстаныя прадуктыўныя сілы народу.

Для прыкладу возьмем хоць бы сабе Швэйцарыю ў параўнаньні з СССР і Кітаем. У Швэйцарыі, як ведама, няма ані зялеза, ані вуглю, ні медзі, ні волава. Увесь народна-дзяржаўны даход пабудаваны, галоўным чынам, на 2-х дзялянках прамысловасьці: на турыстыцы й на жывёлаводстве й малачарстве ды да таго на промысьле гадзінарства, дзераўляным промысьле, фабрыках абутку й земляробстве. Ня гледзячы на гэта, Швэйцарыя зьяўляецца сымбалем дабрабыту й багацьця яе грамадзян — у той час, як СССР з сваімі 20-ма прадуктамі, як і Кітай, штось каля гэтага — зьяўляюцца сымбалямі мізэрыі й «жабрацтва» іхніх грамадзян. Швэйцарыя — сяньня адзіная дзяржава ў сьвеце, якая, побач Злучаных Штатаў Паўночнай Амэрыкі, згаласілася з прапазыкай даць 1 міліярд швэйцарскіх франкаў для адбудовы і ўпарадкаваньня Эўропы.

Таксама і што да адпорнасьці дзяржавы на час вайны ці яе златнасьці ўваружэньня. Нямеччыне нічога не пашкодзіла стацца адной з наймагутнейшых ваенных дзяржаў — ня гледзячы на тое, што ў яе зусім не было свае собскае газы-бэнзыны, гэтага галоўнага прадукту ў ваеннай тэхніцы. А прайгралі яны вайну не таму, што ім не хапіла газы, а зусім зь іншых, нам ведамых, прычынаў.

Расказаў Вам гэтую гісторыю аб аўтаркнасьці не таму, што яна хоць бы як гісторыя сама па сабе цікавая, а дзеля таго, каб Вам было больш зразумела, якую вартасьць маюць аргумэнты нашых праціўнікаў, якія вымагаюць аўтаркнасьці ад нашай будучай Беларускай Дзяржавы. Некаторыя ж вучоныя, публіцысты й цэлая пляяда іхняй інтэлігенцыі, ды часам нат няграматнай іхняй масы, асабліва любяць задаваць нам пытаньні — дзе ж Ваш вугаль, газа, зялеза, соль? Як будзем жыць?

На такія пытаньні можна было б адказаць таксама проста. А як жа жыве, скажам, Італія, што ня мае вугалю, газы, зялеза? Ці нат Францыя, якая хоць і мае свае капальні вугалю, але здабыча там так недастатковая, што ў сэнсе паліва мы, беларусы, значна лепш маемся ад яе, хоць бы толькі сваім торфам; Францыя палавіну паліва прывозіць сабе з-за граніцы, а газу-бэнзыну поўнасьцю, бо ў сябе зусім ня мае. Ня мае й капальняў золата, але золата ў «Банк дэ Франс» больш, як у Расеі, скуль гэтая апошняя заўсёды пазычала, нават не сплаціўшы Францыі дагэтуль сваіх даўгоў. Між тым, гэтыя дзьве дзяржавы — Францыя й Італія, — ня толькі ўжо праіснавалі тысячу гадоў як незалежныя дзяржавы, а й праславіліся ў гісторыі сваёй палітычнай магутнасьцю, культурай і дабрабытам сваіх народаў у сотні разоў лепш, як Расея з сваімі вуглямі, газай і іншым.

Але нашым праціўнікам, а асабліва «вучоным» гэткага гатунку мы маем права адказаць больш дакорліва.

Найперш, як яны могуць цьвердзіць, што ў Беларусі запраўды няма вугалю, зялеза і інш., калі на працягу 150 гадоў іхняй акупацыі Беларусі яны не зрабілі ніводнай навукова-дасьледчай разьведкі нутраных багацьцяў Беларусі?! Больш таго, на ўсёй велічэзнай тэрыторыі Беларусі (Тут і далей аўтар мае на ўвазе Беларусь у яе этнаграфічных межах. — *заўвага Рэдакцыі*) з 16 мільёнамі насяленьня да рэвалюцыі 1917-га году, не было ніводнай вышэйшай школы. Спробы ж беларускіх вучоных у напрамку дасьледжаньня канчаліся, звычайна, арыштамі і ссылкай дасьледчыкаў, як гэта было з дырэктарам «Краёва-дасьледчай Станцыі» у Віцебску ў 1905-м годзе, або пазьней з цэлай сэкцыяй Беларускай Акадэміі Навук па археалягічных дасьледжываньнях Беларусі ў 1931 г.

Поўную падставу ў нашым цьверджаньні аб неаб'ектыўнасьці акупацыйных вучоных нам дае хоць бы той факт, што побач гэтых легендаў аб эканамічнай «убогасьці» Беларусі былі створаныя легенды яшчэ большыя, як напрыклад, што беларускі народ ніколі ня меў сваёй дзяржаўнай незалежнасьці, ды што мы наагул не народ і што мова нашая — ня мова. У той час, як у іх жа пад носам у адным толькі Петраградзе ляжалі 556 тысяч тоўстых пажоўклых тамоў з актаў беларускай калісь незалежнай дзяржавы цягам 5 стагодзьдзяў. Акты гэтыя ўсе напісаныя беларускай мовай.

Віленскі Цэнтральны Архіў зьмяшчаў некалькі мільёнаў падобных дакумантаў, ды амаль у кожным музэі губэрнскага гораду Беларусі заўсёды нешта забрыло ці завалілася, што вымоўна крычала ня толькі пра тое, што мы мелі даўгімі гадамі-стагодзьдзямі сваю дзяржаву, а й дзяржаву магутную, слаўную. Нат у францускім адным музэі мне давялося наткнуцца на адзін такі дакумант, у якім вялікі наш князь Аляксандар І піша сваім гетманам: «Будзьце моцна на старожы граніцы. Люты наш вораг, цар маскоўскі, зноў злое дзела замышляе».

Пры гэткай багатай, усюды расьсеянай дакумэнтацыі аб нашай калішняй незалежнасьці, ня мог не наткнуцца на іх нат не прывыкшы глыбака капацца якісь вучоны, а як бачыце, ім гэта нічуткі ня шкодзіла ляпіць легенды аб нашым народзе, які «ніколі ня меў» свае незалежнасьці. Што ж тады гутарыць аб «вучоных» эканамістых, якія ўжо запраўды не маглі наткнуцца на горы вугалю ці іншыя, што самі празь сябе вылезьлі б нетраў Беларусі, багацьці.

Праўда аб нашых гаспадарчых багацьцях

Галоўныя крыніцы нашых даходаў

СЕЛЬСКАЯ ГАСПАДАРКА. Беларускае сяло за царскіх часоў сапраўды выглядала вельмі ўбога, а сяньня, як Вы ведаеце, яшчэ горш. Але прычыны гэтаму былі не адсутнасьць прыродна-эканамічных рэсурсаў, а насьледкі сацыяльна-эканамічнай палітыкі акупантаў. Не дзівіцеся таму, калі зараз пачуеце ад мяне, што пэрспэктывы беларускай сельскай гаспадаркі пры нармальных умовах шмат лепшыя, як нат пэрспэктывы сельскай гаспадаркі украінскай. Не падумайце, што й я навучыўся фабрыкаваць легенды, не — зараз пабачыце.

Гэта, прызнаюся, мая тэорыя была апрабавана адным з найвыдатнейшых украінскіх эканамістых О.Міцюком, прафэсарам Украінскай Гаспадарчай Акадэміі ў Чэхіі, які зь першых маіх слоў спачатку быў расьсьмяяўся, але, перагледзіўшы маю працу, — згадзіўся потым са мной у 100 працэнтах.

І запраўды, як можа на першы пачатак не паказацца дзіўным такое параўнаньне, бо ж кожнаму эканамісту ведама са статыстыкі, што адзін гектар украінскай чарназёмнай глебы дае сярэдне ад 70 да 80 пудоў збору збожжа, у той час, як беларускі гектар давае 30-40 пудоў. Пры маіх студыях мне адразу кінулася ў вочы, чаму адзін гектар нямецкае зямлі, якая па свайму геалягічна-хімічнаму складу абсалютна падобная да зямлі беларускай, дае ад 120 да 150 пудоў. І ў той час нат так расхвалены ўкраінскі чарназём дае толькі 70-80 пудоў.

Справа, аказваецца, вось у чым. Каб расьліна дайшла да свайго нармальнага найбольшага разьвіцьця, неабходна, каб грунт меў для яе выжывы гэткіх 7 галоўных элемэнтаў: азот, фосфар, калій, кальцый, магнэзій, серку,

Працяг на старонцы 6.

У ЦІШЫНІ НАЧЫ

Працяг са старонкі 1.

аднае з камяніц я ўбачыў асьветленае вакно. Лішне казаць, як я гідзіўся самога сябе, калі памкнуўся быў зазірнуць усярэдзіну.

Зараз, — думаў я, — варта мне толькі наблізіцца, як яны адчуюць і, апрануўшы свае мілітарныя фрэнчы, свае недарэчныя капелюхі, свае пухавікі, — выйдуць на вуліцу ў гэтую пустату, пад гэты дождж. І размашыстым крокам рушаць у цемру...

Мне стала халодна. Я зусім прамок. Я адчуў гэта толькі цяпер, калі скончыўся дождж.

Магчыма, я прыйшоў сюды, каб зразумець сваю бездапаможнасьць? Але я ведаю, што ад разуменьня ня стане лягчэй. Ня сёньня дык заўтра яны наваляцца на мяне. Яны сядуць мне на галаву. Яны будуць кпіць зь мяне й абплёўваць усё, што маё. Не, яны не палезуць у бойку. У бойцы перамагае дужэйшы. А такія перавяліся ў нашым горадзе хіляк'оў. Прыцягальны жах касьмічнае бездані перабраўся цяпер у вочы нікчэмнасьцяў і дробных паскуднікаў.

Недзе ў іншых умовах я сказаў бы, што я — дасьледнік, які хоча зразумець свой страх. Але гэта ў іншых умовах, дзе мы заўсёды ўсё можам патлумачыць і з'імправізаваць сабе апраўданьне. І тыя, хто ў іншых умовах скідае зь сябе аблічча начнога маньяка, — гатовыя выслухаць і зразумець нас і паверыць нам.

Божа, куды ўсё тое дзяецца на пустэльнай начной вуліцы! Мая пэўнасьць і іхняе разуменьне...

Я падкраўся да асьветленага вакна і, прыпаўшы да мокрай сьцяны будынка, асьцярожна зазірнуў туды.

За шыбамі без фіранак я ўбачыў дваіх. Сварлівая цётка з рэзкімі рысамі твару, седзячы на ложку, цыравала шкарпэтку. А лысаваты мужчына абапёрся задам на край стала і, гледзячы перад сабой, жаваў пустым ротам, пэўна, пасьля вячэры. «Дзібілы, — сказаў ён нязлосна й прыўзьнята, — я іх ненавіжу!» «Самец», — падумалася мне. На ім былі чырвоныя спартовыя нагавіцы й такая ж пажарная саколка. Пульхны твар пакрывала шчацьцё, а на тлустым чале адбівалася сьвятло незацененай лямпы. Я ўслухаўся ў іхнюю гаману.

— Ты панімаеш, адна мыша папалась сразу, — казаў мужчына. — Я толькі паставіў. Мышалоўка пербіла ёй морду, блін... Сразу. Бац і ўсё!.. А кілбасы няма. Ты панімаеш? Я дажа сам ня знаю. Яна не паспела б сажраць!.. Дзібілка.

Гаворачы, ён распаляўся ў нейкім ненавісным захапленьні.

— Не-е, я ім больш кілбасы ня дам! Ідзіоты. Я іх нагамі душыць буду.



Так хоць выкінуў і ўсё, блін. А тут яшчэ выкалупывай з мышалоўкі ейныя мазгі.

— Пачакай, Арцём, — сказала скрыпучым голасам цётка. — Можа гэтую ўбіла сразу, а пакуль тое, прыхадзіла другая ды зьела.

Нейкі час у іхняй размове цягнецца пярэрва.

— У мёртвай сажрала! Дзібілы, я іх ненавіжу! — крыва ўсьміхаецца мужчына, гледзячы проста на мяне.

Мабыць, на якуюсь хвіліну я скамянеў. Аж пакуль не адчуў за сьпінаю нечае частае дыханьне. Патроены вулічны жах вывеў мяне з аняменьня. Я рэзка азірнуўся. Твар у твар на мяне зь вясёлай нянавісьцю ў шкляных вачох пазіраў чалавек.

— Ты што, блін! — кажа ён гучна і ўладарна. І я адчуваю, як кожнае гэтае слова сьцірае ў нішто маю існасьць.

Што я магу адказаць яму?! Магчыма, я мушу адразу ўдарыць яго па тварах ці крыкнуць яму ў вочы штосьці яшчэ больш зьнішчальнае. І я магу! Я магу зрабіць гэта, сьцяўшы ў кулак сваю знэрвавананасьць, перасіліўшы свой страх.

Другое выйсьце — ўцякаць. І дзеля яго я таксама мушу перасіліць сябе. Дзьве перасілы змагаюцца ўва мне ў сваёй агіднасьці — і ніводная ня можа перамагчы.

Гэты чалавек — той, у чырвоных нагавіцах. Ён глядзіць на мяне непрыступна й абыякава — бяз думкі ці пачуцьця ўваччу.

Хутчэй за ўсё я выглядаю перад ім вінавата й спалохана, недзе ў глыбіні сэрца разумеючы, што гэтым толькі распальваю ягоную нянавісьць. О, як мне хочацца быць абыякавым — дэманстратыўна больш абыякавым за яго, перамагчы яго ў абыякавасьці! Але я не магу. Я засынаю.

Сон цягнецца сэкунду, ня болей. На сэкунду я бачу вялізны, запоўнены людзямі стадыён. Я стаю пасярод стадыёну перад мікрафонам, я мушу нешта казаць, але язык ня слухаецца мяне. І калі неверагоднымі намаганьнямі ўсё ж разяўляю рот — раздаецца бляяньне, жывёльны рык.

Афэкт такі моцны, што я адразу прачынаюся. І нейкі час не магу паварушыць ні нагой, ні рукой. Я нібы адляжаў сваю існасьць. У мяне зьмярцьвелае сэрца.

Гэты стан падобны да стану зомбі. Ці — да імітацыі сьмерці ў якіх-небудзь мятлікаў, калі яны заўважылі драпежніка.

— Ты што, блін! — паўтарае мужчына сваімі мокрымі губамі.

Цяпер мне трэба зрабіць самае галоўнае, дзеля чаго я ішоў сюды й так мучыў сябе. Божа! Хай гэта будзе астатні гвалт, які я зраблю над сабою! І я рэзка адварочваюся, падставіўшы яму сваю сьпіну.

Усё, што мне застаецца — гэта глядзець у люстраную вітрыну нейкае крамы насупраць. Больш мне проста нічога не выпадае. А там...

Гэта самае неверагоднае й жахлівае, што я толькі бачыў у жыцьці. У вялікім люстры вітрыны паміж нейкіх капелюшоў і стужак я бачыў — самое ўбоства, самую нікчэмнасьць, стакроць зацёртае й зьнішчанае жывёльным страхам чалавечае «я». І гэтае «я», гэтае нешта было мною, маёй аголенай праўдзіваю існасьцю!

Я нічога не магу зрабіць. Я не магу зьмяніць гэтае адлюстраваньне, якое забівае мяне напавал. Я, здаецца, толькі крычу, лямантую на ўсю вуліцу ад роспачы й нязбыўнага расчараваньня. Мяне, здаецца, трасе і курчыць, пакуль я зусім ня страчваю прытомнасьць.

Мужчына ў чырвоных нагавіцах перапалохаўся. Ніжняя няголеная сківіца, адваліўшыся, так і засталася вісець. У круглых вачох не было ані ценю ніякай думкі. Нарэшце ён сьцепануў плячыма, сказаў сваё «дзібіл, ненавіжу» і пайшоў у дом.

Ларыса Раманава

Вершы 1990-га году

* * *

Анінаводнай мове
не магу
сказаць тое Слова,
якое хачу.
Душа
соннай птушкаю
падае ў в і р.

ЧАМУ?

Ты ніколі ня будзеш ведаць,
чаму я тут,
дзе болей значаць
сьнег і пыл камянёў,
чым яшчэ ня саджаны сад,
у якім ня вырасла дрэва
Адама і Евы,
дзе яблыкі — занадта салодкія,
каб іх есьці.

Ты ніколі ня будзеш ведаць,
чаму дрэвы маўчаць?
Разумеюць іх, можа, толькі
птушкі ды вецер.
Дрэва расьце, хавае свае карані,
ня ведае, чым яно ёсьць.
Ты ж хочаш сябе назваць.
Ты заўсёды хочаш чагосьці
Большага;
і яно спачатку здаецца жахлівым,
і заўсёды бывае апошнім, але —
безь імя.

І чаму ты хочаш усё,
што табой набыта,
пакінуць і больш не кранаць?
Тут агонь цячэ, як вада,
і паветра робіцца рухам...

Дакраніся.
І не палохайся болей
гэтых белых гарачых сьцен,
зь якіх немагчыма выйсьці...
Пакуль.

* * *

Спазнаўшы марнасьць мараў
і надзей,
так хочацца усё ж ісьці,
і я іду далей, —
туды, дзе ўжо няма нічога,
дзе, ў рэшце рэшт,
зьнікае і дарога.

* * *

Я пакіну хутка свой дом,
такі цёплы, дзе ўсё мне — рай;
вораг, сябра,
мой сёньняшні дзень чужы,
соснаў цені,
каханага цень за вакном.

Я ня мару знайсьці небакрай.
... Мне так многа, што я жыву.

ДА ВОСЕНІ

Посуд жоўтага колеру. Дзе толькі можна. Хутка зьмярцьвее трава, халодным зробіцца сонца.

Зьбяруцца аднойчы сябры ў маім доме. Далёкія мне і чужыя.

Прыходзь і Ты! Ежы, віна будзе даволі: раніцу й вечар спрабаваў на смак?

Гаркавая восень: скалелыя рукі, мокрае пер'е птушкі, галоўні ля вогнішча.

Няўтольны вандроўнік? Сядай, сядай, калі ласка!

Пазбыцца ўсяго жаданага. Так.

* * *

Пакладзі сваё цела бяздомнае
Паміж сноў, паміж неба і зелак, —
На заваленым сьмецьцем ложку
Будзеш спаць, як ня спаў
і анелак.

РЭЦЭНЗІІ

Беларускі гістарычны часопіс. 1993, №1 (1). — 128 с.

Пра гістарычны часопіс на Беларусі марылі даўно, і зьявіўся ён як «навуковы, навукова-мэтадычны ілюстраваны». Што праўда, ілюстрацыі ў ім падабраныя досыць бессыстэмна, часам увогуле без прывязкі да матэрыялаў, але вось менавіта мэтадычная частка — найбольш цэльная й выразная. Тут ёсьць чысьціня жанру — размова вядзецца прафэсіяналамі на прафэсійныя тэмы (няхай часам і вузкія). Дадзеная акалічнасьць адрозьнівае новы часопіс, скажам, ад «Спадчыны», якая яшчэ з'арыентаваная на раскрыцьцё «белых плямаў». Характарыстычным, відаць, зьяўляецца ўзьнікненьне ўжо ў першай кніжцы часопіса нейкай спробы дыскусіі на прадмет тэрміналёгіі. Гэта як знак таго, што сур'ёзнасьць пытаньня (асабліва ў нашай сытуацыі) усьведамляецца рэдакцыяй.

Яшчэ да выхаду нумара пачалася крышталізацыя асяродку часопіса: рэдакцыі ды аўтараў. І гэта нармальна — толькі ў такіх варунках можа скласьціся твар часопіса й вызначыцца ягоная рэальная роля ў навуковым і адукацыйным працэсе. Школа аналаў утварылася вакол часопіса «Annales. Economies — sociétés — civilisations». Але пэўны эклектызм сёньняшняга часопіса й абсурдальнасьць некаторых матэрыялаў пакуль прымушае сумлявацца ў здольнасьці БГЧ сфармаваць навуковую школу.

Грамадзкі быт і культура сельскага насельніцтва Беларусі. — Менск: Навука і тэхніка, 1993. — 256 с.: іл.

Мусіць, аўтары імкнуліся ў застарэлую структуру ўціснуць новы зьмест. Каркас дасьледаваньня зь ягоным вузкаінфармацыйным падыходам і падзелам усяго выданьня на дзьве вялікія часткі (дасавецкі час і савецкі пэрыяд) дастаўся, відавочна, з марксысцкай мэтадалёгіі. Рудымэнтам ідуць тэзы аб тым, што «Кастрычніцкая рэвалюцыя ўпершыню дала беларускаму народу сваю дзяржаўнасьць», а пад «нашай літаратураю» ў гістарыяграфічным аглядзе фігуруе любое выданьне з тэрыторыі былога СССР. Але, тым ня менш, многія праблемы асьветленыя сапраўды па-навуковаму. І фэадалізм — гэта ўжо ня толькі запрыгоньваньне сялянаў, але й ерархічная лесьвіца ў стане шляхты, якая разгледжана нечакана выразна. Кніжка была напісаная недзе ў 1991 г., і ў яе патрапілі некаторыя тэрміналягічныя навацыі — да прыкладу, Летува (с. 137).

Але зьнішчаны галоўны стрыжань падобных выданьняў — клясавая барацьба. І кніжка рассыпалася на некалькі артыкулаў, стаўшы ня нейкай маналітнай цаглінаю, а ўласна зборнікам, дзе кожны аўтар адказвае за сваю частку. Адчувальна падобнае нат у мове зь яе пераходамі ад пругкай да вязкай. У такім кантэксьце разумееш, што «Кастрычніцкая рэвалюцыя» гэта не рудымэнт, а пазыцыя рэдактара тома — член.-кар. **В.Бандарчыка.** Фактычна ў кніжцы крыху менш рэальных аўтараў, чым заяўлена ў выходных дадзеных. І гэта лучыць постсавецкія калектыўная манаграфіі з савецкай традыцыяй.

МАНАК Браніслава. Насельніцтва Беларусі: Рэгіянальныя асаблівасьці разьвіцьця і расьсяленьня. — Менск: Унівэрсытэцкае, 1992. — 176 с.: іл.

Адзін з падмурковых прынцыпаў гэтае кніжкі — беларусацэнтрычнасьць. Менавіта разгляд Беларусі як цэльнага й па-свойму ўнікальнага арганізму дазваляе зразумець рэгіянальна-дэмаграфічную спэцыфіку краіны. Найбольш істотныя характарыстыкі пры гэтым не губляюцца ў масе лічбаў вялізных тэрыторый (СССР, да прыкладу). Кніжка напісаная хутчэй як аглядны твор, а не манаграфічнае дасьледаваньне. Адсюль пэўная разьняволенасьць мовы й апэляцыя да ўласнае ацэнкі чытача, што ў суседзтве з графікамі й дыяграмамі стварае крыху нечаканы тэкставы ляндшафт кнігі.

Фактычна атрымаўся геаграфічна-дэмаграфічны погляд на гісторыю. На тэрыторыі Беларусі праяўляюцца агульныя заканамернасьці й тэндэнцыі разьвіцьця народанасельніцтва, уласьцівыя на сучасным этапе ўсім разьвітым краінам. Але ўлік толькі агульнасацыялягічных тэндэнцый сучаснае цывілізацыі быў бы навукова некарэктным, і аўтарка паспрабавала прасачыць дэструкцыйныя фактары савецкай акупацыі. Аб'ектыўны працэс разьвіцьця насельніцтва Беларусі ўвесь час парушаўся, што патрабавала дадатковых людзкіх намаганьняў. Праўда, аўтарскія камэнтары досыць сьціплыя, і часам нашмат больш гаворыць даведачна-графічны матэрыял. Іншы раз аўтарка некрытычна выкарыстоўвае савецкую статыстыку, што не дазваляе выразна прасачыць палітыку генацыду супраць беларусаў. Тым ня менш, кніжка ўтрымлівае зьвесткі пра палітыку дэпапуляцыі вясковага насельніцтва праз стварэньне калгасаў і накіраваньне міграцыйных шляхоў за межы Беларусі, пра насычэньне беларускіх гарадоў расейскамоўным элемэнтам. Цяпер Беларусь уваходзіць у групу краінаў з самым нізкім узроўнем нараджальнасьці й натуральнага прыросту насельніцтва.

Безумоўная вартасьць кнігі — гэта разгляд з дапамогаю сацыяльна-дэмаграфічных прыладаў пасьлячарнобыльскіх працэсаў як кардынальнае зьявы ў найноўшай гісторыі Беларусі. Абгрунтоўваецца патрэба адміністратыўна-тэрытарыяльнае рэформы ў краіне — усе абласныя цэнтры, за выключэньнем Менску, знаходзяцца ў эксцэнтрычным становішчы да сваіх тэрыторый. Таму большая частка насельніцтва знаходзіцца за межамі сярэдняй транспартнай даступнасьці да горадацэнтра, што ўскладняе кіраваньне гаспадаркай, ударожвае транспартныя сувязі, стварае кантраст узроўню абслугоўваньня й даступнасьці паслугаў.

Праца Браніславы Манак мае якасьці падручніка па сацыяльнай гісторыі Беларусі XX ст., і апошняя аўтарская фраза гучыць так: «Пачынаецца новая старонка гісторыі беларускага народу, у якую гэтая кніга зрабіла толькі ўступ».

ГУРСКІ Барыс. Як збудаваныя і чым багатыя нетры Беларусі. — Менск: Народная асьвета, 1992. — 126 с., іл.

Природная среда в Республике Беларусь: Состояние и проблемы. — Менск: Дзяржаўны камітэт па экалёгіі, 1992. — 96 с.

Падобныя кніжкі выкліканыя да жыцьця зьменаю статусу Беларусі. Цяпер шмат каму даводзіцца разважаць катэгорыямі сваёй зямлі й дастатковасьці ўласных рэсурсаў. Пры ўсіх сёньняшніх складанасьцях гэта той пэрспэктыўна станоўчы фактар, што з пазыцый геаграфічнага дэтэрмінізму робіць апраўданым для цывілізацыі набыцьцё Беларусяй свае незалежнасьці.

І геолягі аказаліся падрыхтаваныя да такой сытуацыі: цяпер без ваганьняў яны могуць назваць звыш 4000 радовішчаў карысных выкапняў. Далейшы ланцужок развагаў над фактураю прыводзіць да разуменьня значнасьці зь мінэралягічнага гледзішча для Беларусі яе Палесься, асабліва ўсходняга. Асноўная маса выкапняў: нафта, газ, вугаль, гаручыя сланцы, бурштын, калійныя солі, глаўканіт..., — знаходзіцца менавіта там. У цэлым тэрыторыя Палесься да чарнобыльскае аварыі была самай дынамічнай у гаспадарчых адносінах. Пройдзе 50, 100, 150 гадоў пэрыядаў паўраспаду нуклідаў стронцыю, плутонію, цэзію й пачнецца новая калянізацыя гэтых тэрыторый — ужо ня балтамі, не радзімічамі, а беларусамі XXI ст. І калянізацыя гэтая будзе ня толькі аграрнай на вернутых для людзкога жыцьця землях, але й з засваеньнем нетраў. Беларусь стане самай дынамічнай краінай Эўропы.

А пакуль, як сьведчаць названыя кніжкі, ва ўмовах эканамічнае крызы паветра нашых гарадоў робіцца чысьцейшым — з-за недахопу сыравіны працуюць ня ўсе магутнасьці нафтавай і хімічнай прамысловасьці. І гэта можна расцэньваць як знак структурнае перабудовы на Беларусі з адмоваю ад культываваньня не ў такіх маштабах патрэбнае нам вытворчасьці.

КНІГАПІС

КІПЕЛЬ Вітаўт.
Беларусы ў ЗША. Менск: Беларусь, 1993. — 352 с.

ТУРОНАК Юры.
Беларусь пад нямецкай акупацыяй. Менск: Беларусь, 1993. — 236 с.

Старабеларускія лексыконы: «Лексис с толкованіем словенских мов просто», «Лексис...» Л.Зізанія, «Синонима славенороссская». Менск: Унівэрсытэцкае, 1992. 174 с.

Гістарычна-археалягічны зборнік. Памяці Міхася Ткачова. У 2-х частках. Менск: ТАА «Сантанас», 1993. — Ч.1 — 182 с. — Ч.2. — 184 с.

КАЛУБОВІЧ Аўген.
Крокі гісторыі: Дасьледаваньні, артыкулы, успаміны. Беласток—Вільня—Менск: ГаМакс—Наша Ніва—Мастацкая Літаратура, 1993. — 288 с.

Vieda. Працы Беларускага Інстытуту Эўропы (Беларускага навукова-гуманітарнага таварыства). Выпуск 1. Менск, МП «Гаспад», 1993. — 81 с.

НОРВІД Цыпрыян.
Ідзі за мною: Пераклад з польскай Алега Мінкіна. Менск: Мастацкая літаратура, 1993. — 160 с.

ЭНІГМА

Важкі том выбраных твораў Максіма Танка за 1952 г. на добрую трэць прысьвечаны Сталіну. Дасканала зробленыя вершы. Я не ўстрымаўся й гадзіны са дзьве дэклямаваў, аж пакуль не сарваў голас. Знаёмы мастак сказаў мне: нічога дзіўнага, у Маякоўскага такія вершы яшчэ лепшыя. Маўляў, ёсьць таленты ад Бога, а ёсьць — ад д'ябла, і яны бяруць верх наперамену. Дастаткова параўнаць з гэтымі майстэрскімі вершамі Танка нягеглыя стогны сёньняшніх паэтаў пра бел-чырвона-белы сьцяг і нашу нядадушаную мову.

Але ў тым і рэч, што Танк — не ад д'ябла. У ім ня знойдзеш нічога прынцыпова нездаровага. Якраз наадварот. Сваім роўным, заўсёды крыху прыўзьнятым тэмпэрамэнтам ён набліжаецца да прарочага тэмпэрамэнту Купалы. Але Купала славіў Сталіна на схіле свае творчасьці, пішучы «левай нагой», па інэрцыі. І гэта была ўжо ня першая інэрцыя паэта, які стаў Купалам яшчэ ў 1910-я. Танк жа пісаў оды Сталіну «на ўзьлёце», толькі ўступаючы ў пару свайго шматкніжжа. Як гэта растлумачыць?

Тут я адразу адкідаю матывы «д'ябальскага часу», «немагчымасьці пісаць пра іншае» і што «ўсе так пісалі». Інакш ня варта было б і вылучаць Танка з шэрагу ўсіх ды іншых. Я думаю пра тлумачэньне, якое даў гэтаму другі знаёмы мне творца: маўляў, нелалёкі чалавек, адораны пачуцьцём моўнага рытму, выхаваны на ўзорах эўрапейскага паэтычнага мадэрну, — кляпаў сабе вершыкі на тэмы актуальнас ідэалёгіі. А інакш — як растлумачыць тое, што першы свой «сталінскі» верш Танк піша ўжо 17 верасьня 1939 году: «Ад сэрца мы шлём сваё шчырае дзякуй Сьцягам і байцам і прыслаўшаму вас» (дарэчы, у наступных выданьнях усё гэта выпраўлена, хоць даты пакінутыя ранейшыя)? Як растумачыць зусім ужо вузкалобы паводле зьместу верш «Памяці таварыша Жданава», напісаны чалавекам, які безумоўна ведаў пра вышэйназванага таварыша больш, чым ведаў тады просты сьмяротны, — і напісаны, пэўне ж, без чыйгосьці прымусу? А хіба ня ведаў Танк пра масавыя пасьляваенныя рэпрэсіі супраць «заходнікаў», хіба не зьвярталіся да яго ягоныя ж паплечнікі, знаёмцы, сваякі, калі вывозілі Вільню, Гарадню, Нарач? А ён адказваў ім новымі вершамі пра калгаснае шчасьце, асьветлены зарою маўзалей, пра Сталіна, Сталіна, Сталіна... А інакш — як растлумачыць эпіграф з Пушкіна да верша пра мяжу ў Берасьці: «Вот, вот она! вот русская граница»?

Калі б гэтыя тэмы былі нейкімі выключэньнямі ў творчасьці паэта, можна было б дашуквацца ў гэтых вершах і нейкіх «адваротных» намёкаў, як скажам, у канцоўцы верша «Правадыр»: «Хай шумяць твае годы баявымі сьцягамі над краінай маёй, над зубцамі Крэмля!» Можна было б гаварыць пра знарочыста аднастайную дыдактычнасьць гэтай паэзіі. Але сам Танк абвяргае такія дапушчэньні.

Ці ня лепшы «сталінскі» верш яго прысьвечаны Вільні. Тут — апошняе чалавечае жаданьне паэта, якое ня можа быць выказанае няшчыра, і гэтая шчырасьць распасьціраецца на ўвесь твор, у тым ліку й на ідэалягізаваныя радкі. Я думаю, што гэты верш яшчэ вернецца ў анталёгіі, дзіўным чынам несучы ў будучыню адухоўленае паэтам імя тырана.

Я гэты горад знаю з даўніх дзён,
Дзе дрэмлюць замка гордыя руіны,
Дзе ўзьняў густое веццце ясень, клён
Над сном акамянелым Гедыміна;
Дзе пад аркадамі сівых муроў
Праходзяць цені вулкамі вузкімі:
Пясьняр Літвы, наднёманскіх палёў,
У падарожным плашчы пілігрыма,
І Каліноўскі, і таварышы...
Я чую голас іх у змроку шэрым,
Я чую, як Вяльля ў начной цішы
Бароў прадвечных падмывае бераг.

І хоць навіслых камяніцаў сінь
Начэй нямала беспрытульных туліць,
А ў збуджаным напеве успамін
Яшчэ ня ўсё балючае заснула.
Яно на кожным кроку устае,
Гарыць у верасьнёвай пазалоце,
Дзе вецер песьні першыя мае
Рваў на Лукіскім, на калючым дроце, —
Усё ж люблю я гэтых вуліц гул,
Граду Панар, высокі золак раніц
І маладосьць, абвітую ў тугу,
Якой у вочы можна сьмела глянуць.

Я гэты горад знаю з даўніх дзён.
І кожны раз мне новыя старонкі
Суровай былі адкрывае ён,
Запісанай на камні вежаў звонкіх.
І я чытаю пыльныя радкі,
У якіх вітае сьветлы дух Скарыны,
І устаюць мінулыя вякі
І слаўныя краіны гадавіны.
Вось абеліск узьняўся, як прамень,
Над Чэрняхоўскім, над магілай паўшых,
І словы Сталіна палаюць ноч і дзень
Аб дружбе брацкай і аб славе нашай.

Я гэты горад знаю з даўніх дзён.
І каб ня хвойны пах бацькоўскай хаты,
І каб не нарачанскай хвалі звон
Ля курганоў, ля сосен расахатых, —
Хацеў бы я, каб мой апошні сьпеў
Тут, сярод гэтых незабыўных вулак,
Дзе ўпершыню ён гулка празьвінеў,
Знайшоў спакой і вечны свой прытулак.

(Дарэчы, вершы пра апошні прытулак у Вільні ёсьць яшчэ ў Жылкі і ў Арсеньневай.)

Словам, нідзе й ніколі потым, калі ўжо стала можна, Танк адкрыта ня даў падставаў думаць, што пісаў пра Сталіна няшчыра, што на самой справе ўсё бачыў і разумеў па-людзку, а не па-функцыянэрску, што «ня верыў». Не, верыў. І, бадай, так моцна, што новыя часы зусім загналі яго ў кут. Мы атаясамлівалі яго зь Вільняй, зь імёнамі тых, каго ён там ведаў, з эўрапейскім духам у беларускай паэзіі. А ён, улаўраны й народны, чалавек прэзыдыюмаў і прывілеяў, ператварыўся ў сапраўдны наглуха задраены танк на п'едэстале — такі самы, як стаіць каля ягонага дому ў Менску. Напісаўшы мноства тамоў, ён так і не сказаў ні слова пра тое, хто ён, і, будучы ўвесь час навідавоку, стаў, бадай, самым замкнёным, таемным і загадкавым чалавекам у беларускай літаратуры.

«Нелалёкі» — занадта простая разгадка ягонае таямніцы. Паэт узроўню Купалы й Багдановіча — нелалёкі чалавек, — гучыць занадта парадаксальна для дэфініцыі. І таму, думаю, яшчэ не адно пакаленьне будзе шукаць «сапраўднага» Танка ў ягоных дзёньніках, лістох і вершах, тлумачыць яго й зноў не задавальняцца тлумачэньнем.

Аглядальнік

Сьмерць палявога гетмана

Генадзь Сагановіч

Адбывалася гэта тры стагодзьдзі таму, у часе вайны Маскоўскай дзяржавы з Рэччу Паспалітай. Пасьля шэрагу вялікіх перамог войска Вялікага Княства Літоўскага й Кароны Польскай маскоўскія ваяводы зусім страцілі ініцыятыву ды, зачыніўшыся, сядзелі ў гарадох. Напрыканцы 1661 году ваенныя дзеяньні на Беларусі цалкам перапыніліся, і настала гэтак чаканае зацішша. Ніхто ня ведаў, як доўга яно пратрывае. Урады сьпяшаліся падрыхтавацца да новых кампаній, а войска — як найлепей выкарыстаць перадышку.

Зіма ў тым годзе выдалася цёплая, зусім бясьсьнежная. Да самай вясны рэкі так і не пакрыліся лёдам. Польскія канфэдэраты бавіліся тады «на кватэрах» пад Кельцамі, а войска Вялікага Княства, не падначаленае ніякай гетманскай уладзе, стаяла на паўднёвым захадзе Беларусі. Рэзыдэнцыяй кіраўніцтва Братэрскага хаўрусу (так называлася канфэдэрацыя беларуска-літоўскага войска) па-ранейшаму заставаўся Кобрын, хоць роты паразыходзіліся па розных паветах, карміліся на Лідчыне й Слонімшчыне.

Царскі ўрад хацеў унікнуць новага абвастрэньня вайны і таму зноў паспрабаваў зацягнуць час дыпляматычнымі перамовамі. Стольнік Несьцераў, прыехаўшы ў сакавіку ў Варшаву, сьцьвярджаў, што Аляксей Міхайлавіч гатовы падпісаць замірэньне, аднак, калі сэнатары выставілі ўмову абавязковае вяртаньне акупаваных тэрыторыяў, дык высьветлілася, што Масква на гэта ня пойдзе.

Усё, аб чым удалося дамовіцца вясной 1662 году, гэта вымена палонных. Рэч Паспалітая хацела, скарыстаўшы зручны момант, вызваліць паболей сваіх вязьняў, і абавязкова — палявога гетмана Вінцэнта Гасеўскага. Тым больш, што мяняцца было на каго: у палоне ў Вялікім Княстве Літоўскім знаходзілася 242 высокія маскоўскія чыны, сярод якіх — стольнік Хаванскі-малодшы, князі Казлоўскі, Акінфаў, два Шчарбатых, палкоўнікі, стралецкія галовы, дваране й дзеці баярскія. Вось тады, на пачатку красавіка, калі ў Смаленску дзеля правядзеньня першага абмену сустрэліся камісіі абедзьвюх дзяржаваў, з маскоўскай няволі й быў вызвалены гетман Гасеўскі, разам зь якім адпусьцілі палкоўніка Міхала Абуховіча, афіцэра Стэфана Невяроўскага ды яшчэ каля 200 жаўнераў.

Саракагадовы Вінцэнт Корвін Гасеўскі трапіў у палон пад Вільняю, калі ў кастрычніку 1658 году, маючы толькі паўтары тысячы коньніцы, мусіў прыняць бой з палкамі ваяводы Даўгарукага. Сеча адбылася ў вёсачцы Веркі. Харугвы Гасеўскага ня вытрымалі націску: хто загінуў, хто кінуўся ўцякаць, а ў руках у царскіх ваяўнікоў застаўся абоз непрыяцеля і, галоўнае, сам гетман. Калі яшчэ маскоўскія ваяводы бралі ў палон гетмана?!

Віною ўсяму была ня толькі празьмерная адвага Гасеўскага, які распачаў дзеяньні супраць Даўгарукага без асноўнага складу сваёй дывізіі (бальшыня харугваў яшчэ не прыйшла з Жамойці, дзе ваявала з швэдамі), але й бязьдзейнасьць вялікага гетмана Паўла Сапегі. Той у часе бітвы стаяў з войскам недалёка і мог бы, мусіў бы дапамагчы сваім. Але — не дапамог. Пасьля разгрому Гасеўскага і сам адступіў да Навагрудка. Так згубна ўплывалі на ход вайны асабістыя ўзаемныя антыпатыі гетманаў...

Цікава, што ў той самы дзень, калі царскі ваявода захапіў у палон Гасеўскага, швэды паланілі ўладара Курляндыі Якуба Кетлера з цэлай сям'ёй. Але калі захоп апошняга выклікаў капітуляцыю ўсёй Курляндыі швэдам, дык зьняволены Гасеўскі па дарозе ў Маскву мог сам пераканацца, што на Беларусі барацьба супраць акупацыйных уладаў набывала ўсё большае сілы. У лес пачала сыходзіць шляхта, якая раней давала прысягу цару, і разам зь сялянамі, мяшчанамі, казакамі нападала на маскоўскіх ратнікаў, перакрывала дарогі, займала мястэчкі.

За час ад тае няшчаснае бітвы пад Веркамі і да абмену палонными ў Смаленску войска Вялікага Княства пры дапамозе польскай дывізіі Чарнецкага колькі разоў ушчэнт разьбівала царскую армію. У 1660 годзе пад Ляхавічамі, на Басі й каля Чарэі, у наступным — пад Кушлікамі. Мяшчане беларускіх гарадоў пачалі ўздымаць паўстаньні ды самастойна распраўляцца з маскоўскімі залогамі, выганяючы ці зьнішчаючы іх.



Самы час быў для вызначальнага ўдару, для вялікай выправы на ўсход, за Дняпро, каб перанесьці ваенныя дзеяньні на тэрыторыю непрыяцеля. Тым больш, што дапамогу абяцалі татары, якія самі прагнулі паходу «на Маскву». Урадавыя колы разумелі гэта й спрабавалі падрыхтаваць генэральную наступальную кампанію. Тады й сапраўды была магчымасьць за адзін наступ паставіць цара на калені ды змусіць яго падпісаць прыймальныя ўмовы замірэньня. Аднак урад ня мог кіраваць сваім войскам. Абедзьве дывізіі Вялікага Княства — і сапежынская, і жамойцкая — падпарадкоўваліся толькі імі абраным правадырам і законна патрабавалі ад дзяржавы «крывёю заганараваных заслугаў»...

Каб нарэшце неяк выплаціць войску шматгадовыя даўгі ды вярнуць яго ў баяздольны стан, у другой палове ліпеня 1662 году ў Вільні сабралася скарбова-вайсковая камісія. Двор Рэчы Паспалітай надта хацеў, каб дырэктарам камісіі стаў вызвалены з палону Вінцэнт Гасеўскі, які карыстаўся сымпатыямі канфэдэратаў. Калі ў траўні палявы гетман наведаў Кобрын, жмудзкая дывізія нават прапанавала абраць яго кіраўніком Братэрскага хаўрусу, але гэтага не магло дапусьціць войска правага крыла, якое рашуча выступіла супраць. Дзеля гэтага, дарэчы, узнавілася канфрантацыя паміж дывізіямі. Сапегу ўгаварылі не складаць канкурэнцыі палявому гетману, і камісія пачала паседжаньні пад дырэктарствам Гасеўскага. Аднак ейную працу ўскладнялі сур'ёзныя непаразуменьні паміж камісарамі й дэпутатамі ад канфэдэратаў. Камісія практычна не прымала аніякіх радыкальных рашэньняў. Тады прыхільнікі Сапегі накіравалі сваіх паслоў да вялікага гетмана з просьбай асабіста прыехаць у Вільню. Сапега зьявіўся ў сталіцы 31 жніўня, і хоць афіцыйна ня браў удзелу ў паседжаньнях, уплываў на працу камісіі праз сваіх надзейных людзей, якія ўваходзілі ў склад дэпутатаў.

Час ішоў, а камісія не прымала аніякіх радыкальных пастановаў. У Кобрыне канфэдэраты пачалі хвалявацца. Тое, што адбывалася ў Вільні, іх усё больш непакоіла. Яны пісалі лісты Гасеўскаму як дырэктару камісіі, пасылалі сваіх дэпутатаў, патрабуючы неадкладнага вырашэньня пытаньняў аплаты, гарантыі іхніх правоў, востра ставілі пытаньне аб дзейнасьці манэтных двароў; канфэдэраты ня верылі справаздачам Ціта Бараціні, сьцьвярджалі, што той адно абкрадае дзяржаву, і жадалі ўласнага кантролю, каб высьветліць, куды й на што ідуць выбітыя ім мільёны шэлягаў. Аднак віленская камісія па-ранейшаму не вырашала праблемы канфэдэратаў.

Тады сярод жаўнераў пачалі зьяўляцца падазрэньні, ці не з-за Гасеўскага ўсё гэта чыніцца? Ці ня мае на мэце сам дырэктар камісіі ліквідацыю Братэрскага хаўрусу, што й так быў разьяднаны? Маршалак Жаромскі, які й раней вылучаўся сваёй памяркоўнасьцю, цяпер проста раздражняў рашучых канфэдэратаў. Асабліва непрыемнае было ягонае сяброўства з Гасеўскім. Намесьнік Жаромскага мазырскі маршалак Канстантын Катоўскі займаў у дачыненьні да ўладаў самыя радыкальныя пазыцыі й баяўся, што згодніцтва Жаромскага прывядзе да здрады інтарэсаў хаўрусу.

Лёнданская лекцыя

Працяг са старонкі 3.

зялеза й іншыя менш важныя. Калі аднаго ці некалькіх з гэтых элемэнтаў не хапае, тады расьліна не даразьвіваецца.

Ва ўкраінскім чарназёме іх хапала. У беларускіх і нямецкіх глебах не хапала галоўным чынам трох першых. Немцы, дзякуючы дакладным досьледам прапорцыі недахопу гэных элемэнтаў, пачалі дабаўляць іх рознымі хімічнымі ўгнойваньнямі, у насьледку чаго так лёгка дасяглі гэткай высокай ўраджайнасьці. Нямецкая дзяржава пайшла свайму селяніну на помач з навуковымі кадрамі аграномаў, лябараторыямі й дастаўкай штучных угнаеньняў.

Беларускі ж малапісьменны селянін стараўся папраўляць сваю зямлю, як мог, сам, без усялякае помачы; зразумела, таму й вынікаў належных асягнуць ня мог. Адзінае, чаго ён найбольш дапяў, дык гэта ў справе дадаваньня азоту сеяньнем лубіну, на фосфар жа й калій не спрамогся, бо скуль ён ведаў, што гэта «за зьвярына» і пашто яна? Тым часам у розных частках Беларусі маюцца горы фасфарытных каменьняў, перамяленьне якіх на муку дае гэты неабходны нашым землям элемэнт. Затым невычарпальныя запасы торфу, гэтага амаль што гатовага гноіва, а таксама й калію.

Немцы, напрыклад, падчас акупацыі Беларусі ў 1918-19-х гадох эшалён за эшалёнам экспэдыявалі ў Нямеччыну нашы фасфарытныя каменьні й іншыя ўгнойваньні.

Некаторыя нашы сяляне, выпытаўшы неяк у немца, на што й дзеля чаго гэта, пачалі на свой розум ужываць фосфар. Вынікі былі такія, што ў многіх мяйсцох ураджай падняўся да 60-70 пудоў на дзесяціну.

Магчыма, што беларускія сяляне, хоць бы і прымітыўным спосабам, але дайшлі б яшчэ большых вынікаў, ды спосаб гэтага ўгнаеньня шырэй бы распаўсюдзіўся на Беларусі, калі б не прымусовая калектывізацыя, масавыя вывазы сялян у Сібір не зьнеахвоцілі іх наагул да «чужой» гаспадаркі.

Калі ж бы, скажам, будучая беларуская дзяржава правяла разумную зямельную рэформу ў духу, адпаведным псыхіцы нашых сялян, і пайшла ім у дапамозе навуковымі кадрамі й тэхнікай — няма ніякага сумліву, што пры працавітасьці нашага сялянства ўраджайнасьць беларускай зямлі дайшла б да нормы нямецкай і перавысіла б ураджайнасьць украінскую.

А чаму перавысіла б украінскую? Бо апрача хімічнага складу грунту ў сельскай гаспадарцы гуляе велічэзную ролю шчэ другі фактар — арашэньне — вада. І ў гэтым вось адносіньні Беларусь стаіць у непараўнаўча больш упрывілеяваных умовах, чымся Ўкраіна. На Ўкраіне, напрыклад, выпадае на год ападаў каля 350-400 мілімэтраў, у той час, як на Беларусі каля 500-600. Прычым, на Ўкраіне вельмі нераўнамерна, найчасьцей у формах заліўных дажджоў, на Беларусі ж, дзякуючы прысутнасьці мноства рэк, вазёраў і лясоў, дажджы рэгулююцца вельмі раўнамерна. Дзеля таго на Ўкраіне, нягледзячы на так добры грунт, ураджайнасьць падняць вышэй цяперашняй нормы наўрад ці магчыма, бо таго якраз, чаго ім не хапае — дажджу — штучна выклікаць нельга. Амаль рэгулярна, што 7 год, засухі на Ўкраіне таксама вельмі балюча б'юць па яе сельскай гаспадарцы.

Затым, яшчэ адзін мамэнт, які ставіць беларускую сельскую гаспадарку ў выгаднейшыя ўмовы ў пэрспэктыве, гэта адносная неперанаселенасьць Беларусі. На Ўкраіне да вайны нарахоўвалася ў сярэднім да 80 чалавек на 1 квадратны кілёмэтр, у той час, як на Беларусі — каля 40.

Беларуская дзяржава, такім чынам, дагнаўшы да нармальнага стану ўраджайнасьць свае зямлі (да 150 пудоў з гектара) ці хоць бы нат у першых гадох да зроўня ўраджайнасьці Ўкраіны, дзякуючы меншай на палову гушчыні свайго насельніцтва, зможа — прапарцыйна насельніцтва, — удвойчы больш вывозіць заграніцу хлеба, як Украіна.

Зрабіў гэткае параўнаньне з Украінай, зразумела, не дзеля таго, каб «уменшыць» вагу сельскай гаспадаркі нам братня-прыязнага і запраўды багатага краю, а каб параўнаньнем гэтым яскравей паказаць, якія бліскучыя

Што да Гасеўскага, дык той даўно і насампраўдзе быў ворагам канфэдэратаў. Дарэмна войска сымпатызавала яму. Жаўнеры памяталі свайго гетмана такім, які ён быў да маскоўскага палону, любілі яго й верылі яму, а той яшчэ ўлетку 1662 году канчаткова вызначыў свае пазыцыі і стаў на бок каралеўскага двара. За добрую суму грошай (адразу заплацілі 18 тысяч франкаў і паабяцалі 100 тысяч талераў пасьля таго, як абяруць каралём свайго кандыдата) ён схіліўся да прафранцускай партыі, уключыўся ў прыдворныя гульні і разам з канцлерам Крыштапам Пацам пачаў шукаць магчымасьці, каб як найхутчэй і без асаблівага гвалту распусьціць канфэдэрацыю. Ці думаў ён, чым можа скончыцца ўсялякая дзейнасьць супраць Братэрскага хаўрусу? Пакуль Гасеўскі сядзеў у няволі, яшчэ ў 1661 годзе на Полаччыне за адну спробу ўзяць пад кантроль канфэдэратаў быў забіты «цнатлівы сярод цнатлівых» ротмістар Крыштап Адахоўскі і паранены паручнік абознага Акольскі.

Дывізія выбухнула сьляпым жаданьнем помсты, калі 22 лістапада на вайсковай сэсіі ў Волпе маршалак Катоўскі паказаў шыфраваны лічбамі ліст канцлера Паца, адрасаваны Гасеўскаму. Сумненьні імгненна адпалі — гэта змова! Канфэдэраты адразу ж выслалі да Вільні свой аддзел на чале з Хлявінскім і Навашынскім, якім было загадана схапіць Гасеўскага разам зь ягоным хаўрусьнікам Жаромскім ды прывезьці ў абоз для суда, а калі тыя не наддадуцца — забіць. Палявы гетман абвінавачваўся ў самых цяжкіх грахох. Жаўнеры, прыкладам, лічылі, што яшчэ падчас маскоўскага палону Гасеўскі змовіўся з царскім урадам аддаць у вечнае валоданьне за добрыя грошы Смаленшчыну і Севершчыну, а Масква паабяцала за гэта паставіць яго ваяводам на тых землях. Хадзілі чуткі, што палявы гетман разам з каралём хацеў запрасіць на Беларусь швэдаў, казакаў і татараў, каб падпарадкаваць канфэдэратаў сілай, а непакорных — пакараць сьмерцю. Быццам пацьвярджалі йснаваньне гэтай змовы зьвесткі пра тое, што зь пісьмовага дазволу Гасеўскага й Жаромскага па Дзьвіне да Рыгі прайшлі стругі з маскоўскімі купцамі, а царскі дыплямат Нашчокін тым часам пасхаў на сустрэчу да караля. Дзеля чаго? Ці не ў справе той змовы, якую пачаў плесьці Гасеўскі? Камэнданта палка з Друі, які прапускаў стругі да Рыгі, канфэдэраты адразу ж схапілі й прывезьлі да свайго кіраўніцтва ў Волпу.

Разгарачаныя жаўнеры праглі помсты. Конны аддзел паручнікаў Навашынскага й Хлявінскага — агулам 500 вершнікаў — зьявіўся ў сталіцы ўжо пад ноч на 25 лістапада. Даведаўшыся ад рэзыдэнта вайсковых дэпутатаў скарбавай камісіі палкоўніка панцырнай харугвы Невяроўскага, што Жаромскі ў кляштары кармэлітаў, частка канфэдэратаў пасьпяшалася туды. «Воля ўсяго войска такая, — запатрабавалі яны, — каб маршалак прыехаў у абоз і зрабіў справаздачу!» Жаромскі ўпіраўся, але мусіў ехаць. У дывізію яго не павезьлі. Па дарозе спачатку стукнулі абухом у лоб, а пасьля, каля Дубінак, што недалёка ад Вільні, пасеклі шаблямі й кінулі проста на шляху, не дазваляючы хаваць цела. Гэта дзеля таго, «каб усім скарумпаваным быў страх!»

А раніцай Хлявінскі, як добры знаёмы гетмана, бязь цяжкасьцяў увайшоў у дом Гасеўскага і таксама давёў да ведама рашэньне войска: ехаць у абоз для адказу. Гетман тлумачыў, што вельмі нядужы (ён сапраўды быў хворы), ды не хацеў пакідаць свайго пакою, але Хлявінскі ультыматыўна патрабаваў ехаць. Абараніць Гасеўскага не было каму: пяхота, якая вартавала цэлую ноч, пад раніцу пайшла адпачываць.

Гадзіне а восьмай, калі яшчэ не разьвіднела, канфэдэраты, пасадзіўшы гетмана ў карэту, пад канвоем ужо вывозілі яго зь Вільні. 29 лістапада канвой спыніўся каля мястэчка Астрына, што ў Лідзкім павеце, недалёка ад ракі Котры. Натоўп жаўнераў адразу ж шчыльна абступіў карэту з асуджаным Гасеўскім. Проста ў вочы яму выгаворвалі абвінавачаньні ў здрадзе айчыне й войску, кідалі гідкія абразы, загадвалі рыхтавацца да сьмерці. А ён, зусім безабаронны, апэляваў адно да літасьці, справядлівасьці: «Я, будучы шмат гадоў гетманам, апошняга пахолка без судзьдзі не скараў, а вы мяне, гетмана, так забіць хочаце?!»

На кучы каменьня пад старым крыжам Гасеўскага прымусілі спавядацца ксяндзу. Адводзячы душу, жаўнеры хацелі яшчэ й пасекчы цела Гасеўскага, але ксёндз не дазволіў гэтага. Так яно й ляжала, кінутае проста ля дарогі, пад вялізным крыжам, ажно пакуль не прыехала прыслуга палявога гетмана. Нябожчыка адвезьлі да Астрыны, а ўжо адтуль адправілі

Але потым і гэтае палічылі непатрэбным. Паручнік Навашынскі раптам стрэліў проста ў галаву гетману. Гэта быў першы стрэл, які абарваў малітву Гасеўскага. Пасьля, як ён ужо зваліўся долу, пачалі страляць іншыя. Стралялі яшчэ й яшчэ, ажно пакуль не зьнявечылі цела. Так загінуў герой шмат якіх бітваў, мужны й непахісны абаронца айчыны, якому давялося перажыць больш чым трохгадовы маскоўскі палон, — загінуў як здраднік, ад свайго ж войска, якое калісьці гэтак яго любіла.

ў Вільню, да ягонай жонкі й дачок — Зосі й Тарэзы.

«Цела маё... каб ля ног бацькоў маіх было пахаванае... без усялякіх помпаў, коштаў і шыкаў...» Гэтак запісаў ён у тэстаманьце ў 1661 годзе, калі, седзячы ў маскоўскім палоне, страціў усялякую надзею вярнуцца на айчыну. Цяпер удава споўніла запавет. Пахавала яго ў саркафагу ў касьцёле Сьвятога Казіміра побач з крыптай, у якой ляжаў бацька Аляксандар Гасеўскі, знакаміты смаленскі ваявода. Даўгі надпіс на чорным мармуровым надмагільлі амаль два стагодзьдзі апавядаў пра справы й годнасьці гетмана. Пакуль помнік не разьбілі ў 1840 годзе чужынцы, перарабляючы касьцёл на царкву...

А што ж бунтаўнікі-канфэдэраты?

Забойства палявога гетмана было здарэньнем, яшчэ нечуваным ва ўсёй Рэчы Паспалітай. Злачынства канфэдэратаў адштурхнула ад іх сымпатыі шмат каго з былых прыхільнікаў. Дый сярод самога Братэрскага хаўрусу адразу пачаўся разлад. Радыкальнае кола, якое несла адказнасьць за забойства, засталося ў абсалютнай меншасьці. Жмудзкая дывізія ўскладала ўсю віну на правае крыло, паколькі Катоўскі, Хлявінскі й Навашынскі былі з арміі Паўла Сапегі. Аднак да інсьпіратараў расправы належаў і афіцэр дывізіі левага крыла Невяроўскі. У тых умовах, перажываючы маральны крызыс, войска Вялікага Княства Літоўскага зноў разьдзялілася і ў студзені 1663 году адыйшло на зімовыя кватэры: жмудзкая дывізія — на Жмудзь, а сапежынская — на Беларусь, на памежжа Віленскага й Наваградзкага ваяводзтваў.

Вось тады абозны Міхал Пац, сваяк забітага гетмана, інтуітыўна адчуў, што настаў момант дзеяньняў. Сапраўды, хітры й рашучы Пац, якога Катоўскі пры кожнай нагодзе небеспадстаўна называў «ворагам шляхецкай свабоды й залатой вольнасьці», нарэшце атрымаў рэальную магчымасьць захапіць уладу над разгубленымі жаўнерамі цэлага жмудзкага войска. Спачатку ён схіліў на свой бок большасьць афіцэраў, а пасьля зь невялікім аддзелам уначы раптоўна зьявіўся ў Вільні, схапіў забойцаў, у прыватнасьці, — Невяроўскага, Хлявінскага (Навашынскі пасьпеў уцячы ў Маскоўскую дзяржаву), лідэра канфэдэратаў Катоўскага, і авалодаў артылерыяй. Наступнага дня, 24 красавіка, усё кіраўніцтва мяцежнай дывізіі паддалося й прысягнула на вернасьць Рэчы Паспалітай. Войска цалкам адцуралася арыштаваных злачынцаў і 5 траўня 1663 года падпісала пагадненьне з каралеўскай камісіяй, паводле якога канфэдэрацыя распускалася. Пры гэтым усім жаўнерам, якія ўваходзілі ў Братэрскі хаўрус, за выключэньнем забойцаў палявога гетмана, гарантавалася амністыя. Урад паабяцаў выплаціць войску 5 мільёнаў злотых (увесь жа доўг складаў блізу 13 мільёнаў). Гэтак дайшло да канчатковага ўтаймаваньня мяцежнай дывізіі. Акт утварэньня канфэдэрацыі, падпісаны пад Палудавічамі на Полаччыне ўвосень 1661 году, быў спалены. Войска падпарадкавалася законнай уладзе. Праз які месяц удалося зьліквідаваць канфэдэратаў і ў дывізіі правага крыла, якой кіраваў вялікі гетман Сапега. Так што сьмерць палявога гетмана абярнулася канцом Братэрскага хаўрусу.

Толькі цяпер армія магла наступаць. Аднак час быў незваротна страчаны, а разам зь ім — і шанцы на перамогу. Восеньска-зімовая выправа на Севершчыну сарвалася. Пацягнуліся перамовы, якія ажно праз два гады скончыліся кампрамісным пагадненьнем у Андрусаве.

Калі ўсталявалася чарговае зацішша на фронце, урад вырашаў лёс забойцаў Гасеўскага. Суд адбыўся ажно напрыканцы 1664 году ў Варшаве. Чатырох — Катоўскага, Наркевіча, Невяроўскага й Ястрэмбскага — засудзілі на сьмерць. Каралі іх 3 студзеня 1665 году пры зачыненых брамах, атачыўшы рынак моцнай аховай пяхоты. Палкоўніку Невяроўскаму і Катоўскаму адсеклі галовы, пасьля чаго — чвартавалі целы. Наркевіча і Ястрэмбскага толькі абезгаловілі. А вось галоўны злачынца Навашынскі ацалеў ва ўцёках. Хоць яго й выдалі пазьней Рэчы Паспалітай, забойцу пасадзілі ў вязьніцу і, падобна што, сьмерцю не каралі.

17 лютага 1993 г.

пэрспэктывы мае нашая сельская гаспадарка, калі яе належна павесьці.

ЖЫВЁЛАВОДЗТВА. Дзякуючы вясеньнім разьлівам рэк і рэчак у Беларусі маецца шмат ураджайных лугоў, сенажацяў і пасьбішчаў. Дзеля таго ў Беларусі ёсьць яшчэ магчымай экстэнсыўная форма жывёлаводзтва, якое зьяўляецца менш каштоўным за жывёлаводзтва інтэнсыўнай формы.

У насьледку гэтага ў Беларусі да рэвалюцыі 1917-га году прыпадала ў сярэднім на 1 квадратны кілёмэтр 22 кані, у расейскай жа імпэрыі — 10. Кароў у Беларусі — 45, у расейскай імпэрыі — 15. Сьвіней і авечак у Беларусі таксама прыблізна удвойчы больш на 1 квадратны кілёмэтр, як па ўсёй рэшце расейскай імпэрыі.

Зь Беларусі таму ішло штогод на экспарт мільёны пудоў мяса, масла, сыраў ня толькі ў Нямеччыну, а і Расею, Польшчу і Украіну. Толькі Беларус з гэтага мала меў даходу, бо пры старой царскай сыстэме забіралі найбольшую частку заработку гандляры-пасярэднікі. Пры цяперашняй савецкай сыстэме, хоць экспарт арганізаваны й то вельмі добра, пытаньне ці пры разбуранай нашай сельскай гаспадарцы ёсьць што вывозіць.

ТЭХНІЧНЫЯ КУЛЬТУРЫ, САДАЎНІЦТВА, ПЧАЛЯРСТВА. З тэхнічных культураў Беларусі, што заваявалі сабе вялікае рэномэ на міжнародным рынку і маюць для экспарту паважнае значэньне — ёсьць <u>лён</u>. Зь беларускім ільном ня можа канкураваць ніводная дзяржава.

Францыя, Нямеччына, Англія і іншыя тэкстыльныя цэнтры для свае льняной індустрыі купляюць, у першую чаргу, беларускі лён, а іншы толькі тады, калі беларускага не хапае. Францускія прамыслоўцы й гандляры ведаюць на'т беларускія словы «галавасьцік» і «даўгунец», якія яны ўжо ўжываюць як францускія словы, вымаўляючы «алявасік» і «даўюнец».

Чаму ж так высока цэніцца беларускі лён? А таму, што ён ні ў воднай краіне не расьце такой добрай якасьці. Відаць, кліматычныя ўмовы Беларусі якраз гэтаму найбольш спрыяюць. Практыка паказала, што ў халаднейшых за Беларусь краінах лён дае вельмі грубае валакно, у цяплейшых — занадта слабое й нямоцнае, а то проста толькі кастру. Валакно ж беларускага лёну доўгае, далікатнае, амаль як вата, толькі што за вату мацнейшае й лепш уцягвае ў сябе пот чалавека.

Да вайны 1914-га году зь Беларусі вывозілася лёну за граніцу штогод прыблізна на 75.000.000 царскіх рублёў. На ўнутраным рынку, як ведама, наша сялянства апраналася выключна з вырабу собскага лёну. Таму ў беларускай незалежнай дзяржаве маюцца вялікія шанцы для паўстаньня сваёй собскай ільняной прамысловасьці. Яна ўжо й так мела неблагія зародкі, напрыклад, у Беластоку, але была яна ў чужых руках нямецкіх прадпрыемцаў.

Семя ад лёну дае шмат тукаў — алею.

КАНОПЛІ. Побач зь лёнам добра родзяць каноплі, валакно якіх вельмі падобнае сваёй якасьцяй да лёну і добрае на грубейшыя вырабы, як мяхі, вяроўкі і шнуры для асновы пры тканьні дарагіх дываноў і інш.

КОК-СА-ГЫЗ. Другой высока якаснай тэхнічнай расьлінай у Беларусі зьяўляецца ня так яшчэ, праўда, даўно «вынайдзеная» ў нас азіяцкая расьліна кок-са-гыз, якую адзін беларускі вучоны прытарнаваў да нашага клімату і якая расьце на балоцістым груньце, а ў нас — на нашых палескіх балотах.

Расьліна гэтая дае высокі процант прыроднага каўчуку (гумы). На Беларусі кок-са-гыз ужо засяваецца каля 20 тысячаў гектараў і ў Менску ёсьць нат адна фабрыка вырабу зь яго каўчуку. Прымаючы пад увагу вялікія ў нас абшары балотаў, пэрспэктывы каўчуковай прадукцыі ў Беларусі бліскучыя. На каўчук жа, як вядома,

Працяг на старонцы 8.

LACERTA APYTHANA

«Вось сымбаль твой,
забыты краю родны!»

Сёньня, як ведама, рэчышча р. Нямігі амаль цалкам высахла ў Менску; на месцы, дзе калісь адбылася крывавая бітва рускіх князёў, цягнецца вуліца, званая Нямігаю, пад якою праведзены канал, і толькі ўвесну, калі вада зьбіраецца з талых сьнягоў, яна прарываецца праз насыпаную грэблю і, плывучы даўнейшым рэчышчам, залівае ўсю вуліцу й рыбны рынак, а абышоўшы гару, на якой калісь стаяў замак, праз г. зв. Татарскае балота ўпадае ў Сьвіслач. На тым балоце, якое ляжыць паміж замкам, татарскім кварталам, р. Сьвіслаччу й вуліцай Замкавай, стаяла даўней, як гаворыцца ў паданьні, вельмі старажытная царква, сёньня ж на тым месцы аднаўлены падмурак і друз бітых бутэлек. Сустракаюцца, хоць і вельмі рэдка, на тым месцы велізарныя яшчаркі, падобныя з выгляду на кракадзілаў (Lacerta apythana). Апошнюю гэткую яшчарку знайшлі татарскія дзеці больш за 100 гадоў таму — у красавіку 1885 году, але, даведаўшыся пра гэта, дарослыя яе забілі. Гэты цікавы экспанат даўжынёю каля 1,5 стапы быў захаваны дырэктарам рэальнае вучэльні Я.Самойлам, аднак, на жаль, загінуў бязь сьледу ў канцы 1918 году падчас адыходу зь Менску нямецкіх войскаў і выезду на выгнаньне Ураду БНР.

Тытус Саподзька

Słownik Geograficzny Ziem Polskich i innych krajów słowiańskich. Wyd. drugie.

З.К.

САНЭТ № 16

Публікуецца на просьбу чытачоў

Прахудзілася страха.
Не ад старасьці лядашчай —
А ад сьлепасьці ад нашай
Зьверху сыпле церуха.

Рассыпаецца саха,
Стыне бульбяная каша,
Цьвігне кубак з сыраквашай, —
Цешыцца адно блыха.

З нашай хатай гіне ўраз
Казка, слова, мова, сказ:
Тут глухі жыве сьляпец.

Напачатку было слова,
А ў яго закон суровы:
Мова згіне — нам канец.

Лёнданская лекцыя

Працяг са старонкі 7.

дзякуючы розьвітку самаходнай індустрыі, штораз шырэйшага ўжытку ў сухапутным транспарце аўтаў, матацыклетаў і самакатаў — попыт прагрэсіўна ўзрастае й будзе ўзрастаць.

Эўропа дагэтуль абслугоўваецца каўчукам Азіі, Афрыкі і Амэрыкі. Немцы выраблялі трохі штучнага (сынтэтычнага) каўчуку, але каштуе ён шмат даражэй і якасьць яго горшая. Прадукцыя прыроднага каўчуку ў Беларусі зьяўляецца таму адзінай на ўвесь эўрапейскі кантынэнт.

ЛЕКАРСКІЯ ЗЁЛКІ. Беларусь надзвычай багатая разнаякай расьліннасьцю, а ў тым ліку й лекарскімі зёлкамі. Дагэтуль усе зёлкі й карэньні йшлі заграніцу за бясцэнак. Таму для фармацэўтычнай прамысловасьці ў Беларусі таксама добры грунт.

ТАБАКА. Добра родзіць у Беларусі табака. Амаль кожны наш селянін яе сее ўкрадкам і курыць прымітыўна прыпраўленую. Пабудаваўшы табачна-апрацоўчыя навачэсныя фабрыкі, можна было б палепшыць і якасьць табакі і ўнікнуць давозу чужога гэтага «люксусу», на якім, як ведама, вельмі вялікі зыск.

ЦУКРОВЫ БУРАК, ВІНАГРАД. Апошнім часам выяўлена, што ў Беларусі бурак дае высокі процант цукру і добра родзіць (660 цэнтнараў з гектара). Савецкія ўлады павялі інтэнсыўную прапаганду за пасеў цукровага бураку ў Беларусі, абяцаючы на Гарадзеншчыне збудаваць аграмадныя фабрыкі цукру.

Гэтак жа вядзецца й прапаганда за пасадку вінаграднiку на Беларусі, які, як паказала практыка, таксама добра родзіць.

САДАВОДЗТВА. Адносна садаводзтва Беларусі можна сказаць тое самае, што мы сказалі пра лён. І тут прырода Беларусі абдарыла нас найлепшымі гатункамі яблыкаў, грушаў, сьліваў, вішняў і інш. Кожны з Вас, каго лёс змусіў пабадзяцца па розных эўрапейскіх і пазаэўрапейскіх краінах, пераканаўся, што нідзе ён не натрапіў на так добрыя гатункі яблыкаў або груш, як нашыя «Антонаўкі», «Вінныя», «Слуцкія Бэры», «Гарадзенскія Сапежанкі» або вішні й розныя гатункі сьліваў.

Фруктовыя дрэвы ў Беларусі растуць вельмі добра, амаль не хварэюць. Нягледзячы на гэта, садаўніцтва ў Беларусі разьвіта вельмі слаба. Вёска беларуская, сьціснутая сваёй вузка-палосіцай, не давала нашаму селяніну змогі разьвесьці на шырокую скалю сад навокал свае хаты, а адносіць сад далёка ад хаты беларус не любіў. Да гэтага была яшчэ перашкодай ягоная адсталасьць у сельскагаспадарчай культуры.

Найбольшыя сады мелі абшарнікі Беларусі, але гэтыя апошнія не асабліва гналіся за даходамі, бо ім хапала і так доходу зь іхніх маёнткаў.

Праведзеная належна зямная рэформа ў будучай Беларусі і заахвочаньне нашых сялян да разводкі садоў ня толькі запэўніць усё насяленьне ўдоваль гэтым так выжыўным прадуктам, а нат дасьць немалы даход з экспарту.

ПЧАЛЯРСТВА. Пчалярства ў Беларусі ў даўныя часы было асабліва разьвіта. Гандаль Беларусі мёдам і воскам даваў шмат даходу дзяржаве. Зь мёду выраблялiся напіткі падобныя сяньняшнім густым лікёрам, як «Бэнэдыктын» да прыкладу, як так званы «Літоўскі мядок». Наш вялікі князь Вітаўт на каранацыі сваёй на Беларуска-Літоўскага караля зьдзівіў гэтым напіткам усіх манархаў Эўропы, што зьехаліся на гэтую ўрачыстасьць.

Пчалярства вымагае вельмі мала працы. Калісь нашыя сяляне разьвешвалі ў лесе на дрэвах «калоды» і пчолы самі разводзіліся ды давалі шмат мёду, маючы навокал масу лясных зёлак ды лугоў, багатых салодкімі кветкамі.

Цікава, што з упадкам беларускае дзяржавы вельмі ўпаў і пчалярскі промысел. Магчыма, гэта й таму, што беларускі селянін адганяўся ад лесу.

Цяпер найбольш яшчэ пашырана пчалярства на Піншчыне, Мазыршчыне й Бабруйшчыне, дзе маецца яшчэ каля 40.000 пасекаў. З гэтых пасекаў да вайны 1914-га году прадавалася прыблізна ў год каля 250.000 пудоў мёду і 30.000 пудоў воску. Шмат мёду псавалася пры выраблянні сялянамі цукру кустарным спосабам.

РЭКІ, ВАЗЁРЫ, РЫБАЦТВА. Беларусь, адсунутая ад мора, атрымала як бы ў нагароду ад прыроды велічэзныя прасторы ўнутры. Таму ў гэтым адношаньні Беларусь зьяўляецца найбольш упрывілеяванай краінай эўрапейскага кантынэнту.

Пяць вялізных рэк, як Нёман, Заходняя Дзьвіна, Дняпро, Бярэзіна, Прыпяць, злучаныя ў сваім вярхоўі каналамі з мноствам меншых і большых рэк і рэчак, лучаць густой сеткай усе куткі Беларусі з Чорным і Балтыйскім морамі. Каля трох тысяч вазёр расьсеяныя, як пэрлы, па ўсёй Беларусі. Некаторыя раёны Беларусі можна назваць проста вазёрнымі краямі. У адной толькі Віленшчыне нарахоўваецца каля 400 вазёраў, а ў Лепельскім павеце каля 900. Агулам жа ўвесь водны абшар Беларусі абрахоўваецца прыблізна на 20.000 квадратных кілёмэтраў. Усё гэта ў перамешку з прыгожымі беларускімі лясамі надае Беларусі цудоўны краявід, бо што ж больш упрыгожвае край, як не вада зь лясамі?

Але, апрача красы, водныя прасторы Беларусі маюць для нас велічэзнае значэньне гаспадарчае. Найперш, адносна дробны характар пераважнай бальшыні нашых вазёраў і ставоў зьяўляецца вельмі прыступным для культурнай гаспадаркі рыбацтва. Калісь я, праходзячы праз Нямеччыну, бачыў адзін невялічкі ставок у Баварыі на некалькі сот мэтраў, у якім Немец разводзіў фарэлі. Пры гэтым стаўку стаяла цудоўная двухпавяровая камяніца з багатымі мэблямі. Немец меў два аўтамабілі, адзін цяжкі, другі пасажырскі, двое яго дзяцей вучыліся ва ўнівэрсытэце — і ўсё гэта з таго стаўка. На нашых жа водных прасторах, рахуючы, што на адным гэктары можа жыць 10.000 экзэмпляраў рыбы (як цьвердзяць аграномы-рыбаводы) — магло б у нас гадавацца 20.000.000.000 рыбаў.

Дагэтуль на Беларусі культурнай гаспадаркі па рыбацтву не было. Рыбу лавілі дзікім спосабам, якраз тады, калі яе нямажна было лавіць — падчас нерасту. Калі ж павесьці на Беларусі рыбную гаспадарку як належыцца, культурна, ды ў дзяржаўным маштабе, лык Беларусь бы мела ня толькі ўдоваль рыбы для сябе, а й тысячы тонаў на экспарт. Рыба ж салодкіх водаў, як ведама, шмат лепшая за рыбу марскую — таму збыт яе быў бы заўсёды гварантаваны.

Здымак А.Клешчука

Дваццаць збаноў

Алег Аблажэй

Мы так прызвычаеныя, што мастака ягоны лёс увесь час выпрабоўвае, прыгнятае, трушчыць, што жыцьцё творцы складаецца з бясконцай сызыфавай барацьбы з бытам, з зайздросьнікамі, з чыноўнікамі, з усім сьветам і самім сабою, што прызнаньне, калі й прыходзіць, дык залішне позна... Але ўсё ж не заўсёды бывае толькі так — і чалавек жыве, як таго заслугоўвае, і ягоны талент атрымлівае належныя ўмовы і ацэнку, і ў належны час.

Пра гэта я думаў падчас адкрыцьця вялікай выставы літоўскага мастака Стасіса Эйдрыгявічуса ў віленскім Цэнтры сучаснага мастацтва. Ці не ўпершыню за ўсю гісторыю гэтага палаца адзін мастак запоўніў сваімі творамі ўсе залі. Выстава рэтраспэктыўная — за дваццаць гадоў працы, ад заканчэньня аддзяленьня жывапісу Літоўскага мастацткага інстытуту да сёньня. Зрэшты, лёс любіць, каб яму дапамагалі — і нельга сказаць, каб сусьветная слава й прызнаньне проста так зваліліся зь неба. Вядома, мастаку пашанцавала — у патрэбны момант ягоныя працы былі ўбачаныя людзьмі, што ацанілі іх каштоўнасьць і дапамаглі. Істотнае й тое, што з 1980 году Стасіс жыве ў Польшчы. І вось вынік — за гэтыя дваццаць гадоў ён стаў ці не самым вядомым мастаком зь Летувы, а сьпіс краінаў, дзе ён выстаўляўся, нагадвае старонку зьместу з падручніка геаграфіі.

У вялікі сьвет мастацтва яго вывелі экслібрысы, якія ён дасылаў на міжнародныя выставы малое графікі. Тады й склаўся ягоны стыль.

«Ён адразу "знайшоў сябе", адразу акрэсьліў кола сваё — і не выходзіць зь яго. З гадамі яму толькі лягчэй і лепей удавалася тое, што з самага пачатку стала сутнасьцю ягонага стылю. Раствор мацнеў, насычаўся, але паводле хімічнага складу заставаўся нязьменны», — гэта сказана Ул.Хадасевічам нібы да нашага выпадку.

Дарэчы, сам мастак акцэнтаваў гэты момант у сваім хэпэнінгу падчас адкрыцьця выставы — з сымбалічнай вясковай студні з жоравам — мастак наліў вады ў збан з надпісам «1973» — і пасьлядоўна пераліваў гэтую ваду ў наступныя — 1974, 1975... аж да 1993-га.

Бадай што асноўны элемэнт ягонага «раствору» — журба, туга, мэлянхолія, даведзеныя да такой ступені насычанасьці, што адбылася крышталізацыя, застыласьць, здранцьвеньне — усе гэтыя дзіўныя істоты зь ягоных твораў асуджаныя на вечнае трываньне, як жонка Лота, ператвораная ў саляны слуп. Нават там, дзе як бы й павінен быць рух, усё адно гэта як бы толькі «застылае імгненьне».

Тут нікому нічога ня трэба тлумачыць — кожнаму знойдзецца свой асацыятыўны слой — і даросламу, і дзіцяці. Нездарма Эйдрыгявічус шмат ілюстраваў дзіцячых кніжак, хоць ягоныя малюнкі фактычна нічога не ілюструюць, яны жывуць сваім жыцьцём, якое хіба ў нечым перагукаецца з аповедам. Гэта ж датычыць і плякатаў, якіх ён стварыў безьліч — да самых розных імпрэзаў, найбольш — для тэатральных спэктакляў. Судакрананьне з тэатрам у рэшце рэшт скончылася тым, што мастак і сам напісаў сцэнічны твор, сам паставіў яго, сам аздобіў, сам выканаў галоўную ролю... словам, проч музыкі, усё зрабіў сам. Гэткая крыніца ідэй, індыйскае дрэва бальян, якое са сваіх шырокіх галін апускае ў зямлю нібы хобаты адросткі, што становяцца новымі ствалами, і вось ужо з аднаго дрэва ўтвараецца цэлы гай... Але дзе б ён ні «ўрастаў», асноўны ствол застаецца ў Літве. Дарэчы, вось прыклад сталасьці, культурнай нормы — ніхто ў Польшчы не імкнуўся перарабіць Стасіса Эйдрыгявічуса ў Станіслава Эйдрыгевіча, ніхто ня ставіў у віну пастаяннае падкрэсьленьне свайго літоўскага паходжаньня, і ніхто там не стараўся з гэтай нагоды яго «зацерці», — ня наш, маўляў. А сваю літоўскасьць Стасіс выражае зусім не праз андаракі ды сьвіткі — яна нябачна прысутнічае ў ягоных творах, як атмасфэра.

І яшчэ запомнілася — як непадобны зьнешне мастак да сваіх твораў. Ён увогуле больш нагадвае якогась опэрнага сьпевака. Але ж увесь гэты журботна-безвыходны сьвет нарадзіўся ТАМ.

Можа, ён нездарма так часта выкарыстоўвае вобраз маскі і ягоная зьнешнасьць — таксама маска?..



РЭКІ ЯК КАМУНІКАЦЫЙНЫЯ ШЛЯХІ І ЯК ЭНЭРГІЯ. Беларускі эканаміст Бурбіс аблічыў, што да вайны 1914-га году ў Беларусі мелася годных водных шляхоў 25.000 вёрстаў, зь іх каля 7.000 — годных для параплаваў і каля 18.000 вёрстаў для барак і плытоў.

У 1919-м годзе адзін заходнеэўрапейскі эканаміст, інжынэр, распрацаваў праект, у якім, дарэчы, браў удзел ведамы наш дзяяч Антон Луцкевіч, для выкарыстаньня беларускіх рэк як шляху палучэньня Балтыйскага мора з Чорным. Фактычна былі распрацаваныя два праекты: адзін з Рыгі праз Дзьвіну, Бярэзіну, Дняпро. Другі — Кёнігсбэрг, Нёман, Аўгустоўскі Канал, Прыпяць, Дняпро.

Абодва гэтыя праекты былі пераданы эканамічнай сэкцыі Лігі Нацый, якая мела дабіцца згоды ад гаспадароў Беларусі. Былі ўжо і ахвотнікі фінансаваць гэта так цікавае прадпрыемства, гутарылася ўжо аб магчымасьці расчысткі некаторых каналаў і рэк да такога разьмеру, што марскія параходы маглі б перасякаць усю Беларусь без перагрузак. Зрэалізаваць жа ніводнага з гэтых праектаў не ўдалося з прычын чыста палітычных, нязгоды нашых акупантаў.

Здымак А.Клешчука

Няма сумліву, што Беларусь незалежная ніколі б гэткім праектам не спраціўілася б, бо гэта б вельмі падняло эканамічна наш край, ажывіла б наш гандаль і зносіны з шырокім сьветам. Але няма таксама сумліву, што такія праекты калісь зрэалізуюцца і то яшчэ можа ў шырэйшым маштабе, бо ўжо і па гэтай вайне мы чулі галасы дзяржаўных людзей Амэрыкі і Англіі аб патрэбе «інтэрнацыяналізацыі» буйнейшых рэк Эўропы, якія зьяўляюцца галоўнымі камунікацыйнымі артэрыямі. Беларускі ж водны шлях «з Варагаў у Грэцыю» вядомы сьвету яшчэ з старажытнае гісторыі. Густая сетка сярэдніх і драбнейшых рэк і рэчак дае змогу дапраўляць меншыя баркі, грузы, а галоўнае сплаўку лесу да галоўных артэрыяў — вялікіх рэк Беларусі, як для экспарту ў марскія парты, так і для нутранай таннай камунікацыі.

БЕЛЫ ВУГАЛЬ. Вельмі шмат беларускіх рэк, асабліва такія быстраплаўныя, як Нёман, Заходняя Дзьвіна, Дняпро, высокабярэжная Вяльля, надаюцца для пабудовы магутных электрастанцый. Вядомы беларускі дзяяч Душэўскі чытаў у 1920-ым годзе даклад у Вільні, зь якога выводзіў, што па яго падрахунку, у Беларусі столькі вадзяное энэргіі, што ёй можна з'электрызаваць усю індустрыю і транспарт Беларусі.

На дробных рэчках, дзе не вымагалася якіхсь асаблівых выдаткаў — нашыя сяляне будавалі млыны, валюшы, ваўначоскі і іншы дробны промысел, проста прыладжваючы вадзяныя калёсы.

ЛЕС. Лясная плошча Беларусі займае 25-26 працэнтаў усяе тэрыторыі, што складае каля 95.000 квадратных вёрстаў. Інжынэр Душэўскі абрахаваў, што калі падзяліць усю лясную плошчу Беларусі на 100 дзялянак з тым разрахункам, каб, прадаючы кожны год такую дзялянку на экспарт, можна было б зноў, вярнуўшыся за сто год, дастаць дарослы лес — дык з гэтага экспарту мы б маглі цалком пакрыць галавы дзяржаўны бюджэт Беларусі.

Запраўды, адна толькі французская фірма «Козэ і Сосіэтэ» — падпісала была ўмову з урадам БНР у 1918-ым годзе на закуп беларускага лесу на суму 40.000.000 залатых франкаў. А колькі ж бы ад нас патрабавала ляснога матэрыялу Нямеччына, ці зусім бязьлесістая Ўкраіна, да сэрца якой, як распадзельчага гандлёвага цэнтру — Кіева — даплывае па Дняпры мноства беларускіх рэк і рэчак, абгібаючых ці проста прарэзаючых беларускія лясныя раёны.

Агулам, за рынкі збыту і канкурэнцыю нам няма чаго турбавацца. Адзіная дзяржава, якая б з намі магла канкураваць лесам, дык гэта Расея, але наша блізкасьць да рынку збыту, перавага якасьці нашых лясоў, ды што найгалаўней — упрывілеяванасьць нашых камунікацыйных шляхоў — сплаву, выключае гэтую канкурэнцыю.

Апрача даходу з экспарту сырога будаўлянага матэрыялу, можам яшчэ мець даход, разьвіўшы ў сябе дзеравяна-абрабляючую індустрыю, напрыклад, выраб фанэры, паперы, мэбляў. З карчоў — выракляюць тэрпэнтыну, на якую ў нас так вялікі попыт з боку Нямеччыны для яе хімічных фабрыкаў.

З шыльніку, кары й дробнага хварасьця можна выракляць сынтэтычны бэнзын, як гэта пачалі ў сябе рабіць Швэды.

Пры добрым гаспадараньні можна мець немалы даход і зь дзічы, якой гэтак багатыя нашы лясы, пачынаючы ад адзіных у сьвеце зуброў, рэдкіх у Эўропе і дарагіх сваімі скурамі куніцаў, баброў, ласёў, дзікіх козаў, кабаноў, лісаў, барсукоў зь іх дарагой шэрсьцю, і розных драбнейшых. Маем таксама мноства птушак — жураўлёў, дзікіх гусей, качак, цецярукоў, курапатак і іншых, і іншых...

Багатыя нашы лясы таксама грыбамі, і шматлікімі гатункамі ягадаў, зь якіх, пры добрай арганізацыі, можна выракляць добрую мармаляду, варэньне й розныя напіткі. Грыбы ж заўсёды станавілі паважную стацьцю экспарту Беларусі.

Агулам, пры разумнай, добра арганізаванай лясной гаспадарцы 95.000 квадратных кілёмэтраў пры сучаснай тэхніцы й голадзе Эўропы на лясныя прадукты могуць добра выжыць 5-6 мільёнаў беларускага насельніцтва. Пры акупацыйных жа ўмовах беларус вельмі мала карыстае з свайго лесу. Нават грыбы й ягады мусіў зьбіраць украдкам, бы злодзей.

Словам, лес — гэта нашыя невычарпальныя і велічэзныя багацьці й крыніцы даходаў.

Кожны таму акупант, як толькі дабіраўся да Беларусі, адразу кідаўся да нашага лесу, сек, рэзаў і разсылаў яго зь Беларусі на ўсе бакі сьвету. Цэлую вясну і да паловы лета няўпынна былі запруджаны бельлю бярвеннай плыні ўсе беларускія рэчкі, а беларускаму селяніну, які паштурхіваў бусаком выплываючыя зь Беларусі мільёны й мільёны золата, цяўплі аб беднасьці яго Бацькаўшчыны.

МІНЭРАЛЬНЫЯ ВОДЫ, ТУРЫЗМ. Мінэральныя воды наагул маюць лячэбнае значэньне, і тыя дзяржавы, у якіх знаходзяцца гэткія крыніцы, маюць зь іх вялікія даходы.

Працяг на старонцы 10.

БЕЛАРУСКАЯ САМААХОВА

Абразок невядомай гісторыі

Аляксей Літвін

Беларуская Самаахова — толькі фрагмэнт у гісторыі Беларусі часоў нямецкае акупацыі. Матэрыялы, якія датычаць дзейнасьці БСА, дагэтуль яшчэ ляжаць у спэцсховах архіваў. Між тым, знаёмства з гэтымі матэрыяламі дазваляе па-іншаму ўбачыць і зразумець часы другой сусьветнай вайны. Падобна, што сёньня яшчэ рана казаць пра цэльны погляд на тыя падзеі і іх герояў. Яшчэ цяжэй — даць пэўныя ацэнкі. Таму кандыдат гістарычных навук А.Літвін у сваім артыкуле адно выбудоўвае пэўную храналёгію, карыстаючыся невядомымі дакумэнтамі й ня робячы далёкасяжных высноваў. Усе спасылкі на цытаваныя матэрыялы ёсьць у Рэдакцыі «НН».

Адзін з галоўных мітаў пасьляваеннай савецкай гістарыяграфіі кажа пра тое, што, рыхтуючыся да вайны супраць СССР і зь першых дзён акупацыі, нямецкае кіраўніцтва рабіла ўсё магчымае, каб стварыць на захопленых тэрыторыях так званую «пятую калёну» — марыянэтачныя нацыянальныя ўрады; аднак гэта ім не ўдалося. Так кажа міт. На самой справе, гэтаму фактару гітлераўцы не надавалі практычна ніякага значэньня, бо цалкам разьлічвалі на ўласныя сілы. Міт пра «пятыя калёны» спатрэбіўся дзеля таго, каб, разьбіўшы войскі Нямеччыны, канчаткова разьбіць, пахаваць, закляйміць «позором» «пособников гитлеровцев» — «украинских, белорусских, литовских, польских» і г.д. «буржуазных националистов», і гэткім чынам надаць, так бы мовіць, юрыдычны статус той вайне, якая шырокім фронтам патаемна й адкрыта вялася бальшавікамі супраць паняволеных народаў з пачатку 20-х гадоў. Маўляў, «бацька народаў» слушна папярэджваў пра імпэрыялістычную пагрозу, вакол — варожая агентура і г.д. Маўляў, малайцы энкавэдысты, саджалі за справу...

Зь першых дзён акупацыі гітлераўцы пачалі паводзіць сябе такім чынам, быццам гэтая тэрыторыя ўжо належыць ім. Між тым, на Беларусі былі пэўныя сілы, якія знаходзіліся ў таемнай апазыцыі сталінскаму рэжыму, у тым ліку тыя, якія вялі барацьбу зь ім яшчэ з 1917 году, якія мелі свой погляд на лёс Бацькаўшчыны, бачачы яе зьяднанай і незалежнай. Яны хацелі скарыстаць вынікі нямецка-савецкай вайны для стварэньня беларускай дзяржавы ў магчымай на той час форме. Немцы, аднак, мелі на ўвазе іншыя пляны. І таму ў 1941 годзе не магло быць і гутаркі пра стварэньне якіх-небудзь беларускіх органаў дзяржаўнага кіраваньня (гэта датычыць і іншых рэспублік СССР). Адзінае, што было дазволена — гэта стварэньне ў кастрычніку 1941 г. Беларускай Народнай Самапомачы (БНС) з вузкім колам дзейнасьці ў галіне матэрыяльнай дапамогі і культурна-асьветнай дзейнасьці.

Гэта аднак зусім натуральна не задавальняла кіраўніцтва створанай у студзені 1942 г. Цэнтральнай Рады (Цэнтралі) БНС, у склад якой акрамя старшыні І.Ермачэнкі ўваходзілі ксёндз В.Гадлеўскі, В.Сьвірыд, А.Адамовіч, Ю.Савовіч, Ч.Найдзюк, архіяпіскап Нарко, С.Кандыбовіч, рэдактар А.Сяңькевіч, доктар С.Станкевіч і іншыя. Цэнтральная Рада і кіраўніцтва БНС на мясцох патрабавалі ад нямецкіх уладаў зьмяніць свае адносіны да БНС. Выкарыстаўшы прыезд у Менск міністра ўсходніх земляў Нямеччыны А.Розэнбэрга, яны падрыхтавалі на яго імя спэцыяльны даклад, дзе зьвярталася ўвага на няправільныя адносіны немцаў да беларусаў. Роля беларусаў у новым цывільным кіраваньні, гаварылася ў дакладзе, абмяжоўваецца выключна пасыўным выкананьнем распараджэньняў нямецкіх начальнікаў; беларусы ня маюць выразнай структуры для задавальненьня сваіх патрэбаў... «Словам, зь беларусамі абыходзяцца не як з вызваленым, а як з захопленым народам». У дакладзе-лісьце абгрунтоўваецца патрэба стварэньня беларускай збройнай сілы для барацьбы з савецкімі партызанамі, для аховы бясьпекі ў краіне.

Розэнбэрг, аднак, тактычна абмінуў у сваім інтэрвію «Беларускай газэце» намеры Нямеччыны адносна лёсу Беларусі ў будучай Эўропе.

29 чэрвеня 1942 г. у Менску адбылося паседжаньне Беларускай Народнай Самапомачы, прысьвечанае гадавіне «аслабаненьня ад бальшавіцкага панаваньня і прыходу нямецкае арміі». На гэтым паседжаньні, якое, паводле І.Ермачэнкі, «адчыніла новую балонку нашай гісторыі», БНС «была прызнана нямецкімі ўладамі як сапраўдны прадстаўнік беларускага народу». Генэральны камісар Беларусі В.Кубэ «дзеля забесьпячэньня плённага ўдзелу беларусаў у кіраваньні краем» надаў шэфу БНС званьне дарадчыка і мужа даверу. В.Кубэ заявіў, што прызаве яшчэ трох мужоў даверу на службу ў Генэральным камісарыяце і па адным — на кожны акруговы камісарыят. В.Кубэ зацьвердзіў прадстаўленых Ермачэнкам супрацоўнікаў БНС: у аддзел прапаганды — рэдактара А.Адамовіча, у школьны аддзел — кіраўніка БНС Глыбоцкай акругі доктара Скурата і ў аддзел культуры — кіраўніка БНС Менскай акругі інжынэра І.Касяка. В.Кубэ афіцыйна зьвярнуўся да І.Ермачэнкі, каб той падрыхтаваў са сваімі супрацоўнікамі зварот да беларускага насельніцтва з заклікам да ўступленьня ў Беларускі вольны корпус самааховы, каб «праз самаахову аслабаніцца ад бандытаў, якія перашкаджаюць адраджэньню беларускага народу, і потым заняць яму пачэснае месца ў радох Новае Эўропы».

На наступны дзень, 30 чэрвеня 1942 году, было склікана паседжаньне Цэнтральнай Рады БНС, на якім была апрацаваная адозва да беларускага народу, якую падпісалі І.Ермачэнка, В.Гадлеўскі, В.Іваноўскі, У.Казлоўскі, Ю.Саковіч і архіяпіскап Філафей. Тэкст адозвы быў апублікаваны 4 ліпеня ў «Беларускай газэце». Дарэчы, на гэтым паседжаньні ў склад Цэнтралі былі абраныя В.Іваноўскі і У.Казлоўскі. З прамовамі аб ролі й значэньні БНС выступілі кіраўнік палітычнага аддзелу пры генэральным камісары Беларусі Юрда і кіраўнік аддзелу здароўя доктар Вэбэр. Абодва канстатавалі праробленую БНС працу ў напрамку нацыянальнага разьвіцьця і добрага супрацоўніцтва зь нямецкім народам, «у новых... умовах... БНС стала заступнікам беларускага народу і яго голасам перад нямецкімі ўладамі».

На другі дзень І.Ермачэнка надаў праект арганізацыі Самааховы, які лёг у аснову нарады ў гэтым пытаньні ў начальніка СС і паліцыі бясьпекі і СД брыгадэнфюрэра СС, генэрала паліцыі Цэнэра. На нарадзе прысутнічалі начальнік паліцыі парадку палкоўнік фон Гайнбург, обэрштурмфюрэр Шлегель і доктар Ермачэнка. Апошні ў лістападзе 1942 г. казаў, што «на нарадзе ў генэрала Цэнэра ў асноўным былі вырашаны галоўныя пункты ўтварэньня Беларускай Самааховы, што яна павінна выходзіць з БНС, кантралявацца Цэнтральнымі і акруговымі аддзеламі БНС». 7 ліпеня 1942 г. у зале Баранавіцкага акруговага камісарыяту адбыўся зьезд больш чым 200 прадстаўнікоў БНС з акругаў і раёнаў Баранавіцкага, Лідзкага, Слонімскага, Ганцавіцкага і Наваградзкага. Выступаючы на зьезьдзе, В.Кубэ падкрэсьліў: «Настаў час, калі беларускі народ на беларускіх землях павінен сам тварыць сваё жыцьцё. На гэтай зямлі беларускай ня мае што рабіць ані маскаль, ані паляк...»

12 ліпеня кіраўніцтва БНС атрымала копіі загаду начальніка СС і паліцыі Цэнэра, дзе дазвалялася прыступіць да арганізацыі самааховы. У загадзе паміж іншым гаварылася: «1. Згодна з загадам ген. камісара Беларусі, у поўнай згодзе з БНС ствараецца самаахова беларускага насельніцтва. 2. Самаахова зьяўляецца дапаможнай арганізацыяй для нямецкай паліцыі. Яе заданьне — дапамагчы нямецкай і мясцовай паліцыі ў барацьбе супраць бальшавікоў і сабатажнікаў, забясьпечыць спакой у Беларусі... 6. У якасьці обэркамэнданта беларускай самааховы будзе дзейнічаць пры мне Кіраўнік БНС. 7. Накіраваньне аддзелаў на акцыю адбудзецца па ўказаньню нямецкіх паліцэйскіх органаў у выпадку неабходнасьці. 8. Зброя і амуніцыя пастаўляюцца нямецкай паліцыяй...»

Галоўным камэндантам Самааховы быў прызначаны кіраўнік БНС І.Ермачэнка. У абавязкі ягоныя ўваходзіла агульнае кіраўніцтва Самааховай і яе матэрыяльнае забесьпячэньне. Адпаведныя абавязкі ў акругах ускладаліся на старшыняў БНС як акруговых камэндантаў БСА. Для арганізацыі БСА Ермачэнка склікаў вайсковую камісію ў складзе 7 чалавек (Ермачэнка, Калькевіч, Кушаль, Касяк, Пугачоў, Саковіч, Чабатарэвіч), а таксама пры Галоўным камэндаьце быў утвораны штаб БСА. Начальнікам штабу быў прызначаны падпалкоўнік Я.Гуцька. Камісіі для арганізацыі БСА былі ўтвораныя таксама ў акругах.

Вайсковая камісія падрыхтавала праект арганізацыі Беларускага корпусу самааховы ў трохдывізійным складзе: адна дывізія на абшар Менск, Слуцак, другая — Баранавічы, Наваградак, Слонім, трэцяя — Вялейка, Ліда, Глыбокае. Аднак гэтая прапанова не была падтрыманая Цэнэрам. Было дазволена стварыць адзінку БСА ў кожным павеце ў памеры ад роты да баталёну.

14-16 ліпеня 1942 г. у Менску адбыўся зьезд акруговых кіраўнікоў БНС, на якім абмяркоўвалася пытаньне арганізацыі БСА. Галоўным пунктам гэтай нарады была пастанова сабраць на 1 жніўня беларускіх афіцэраў у Менск дзеля перашкаленьня і пасылкі зараз жа ў акругі дзеля арганізацыі БСА. У канцы ліпеня ў Менск прыехалі першыя прадстаўнікі беларускага афіцэрства з Баранавіцкай акругі ў ліку 28 асобаў на чале з камэндантам БСА доктарам Войтэнкам. 3 жніўня былі адчыненыя трохтыднёвыя курсы па падрыхтоўцы афіцэраў для БСА. Узначаліў курсы Ф.Кушаль. У акругах таксама былі арганізаваныя курсы падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі падафіцэраў (малодшыя чыны).

Дазвол на стварэньне БСА быў па-рознаму ўспрыняты ў краіне. Адныя, хто рабіў стаўку на немцаў, бачылі ў гэтым чарговую прыступку на шляху «ад народнае самабытнасьці, шляхам народнае самапомачы й самааховы, да поўнага самаўраду» ("Беларуская газэта"). Яны разумелі, што прызначэньне Ермачэнкі мужам даверу пры генэральным камісары і рэфэрэнтаў пры некаторых аддзелах ёсьць «фактычна запачаткаваны народны самаўрад», які павінен будзе ў далейшым ператварыцца ў сапраўдны самаўрад. І таму яны лічылі, што стварэньне ўласнай збройнай сілы зьяўляецца асноўнай задачай. Галоўным патрабаваньнем іх было, каб камандныя пасады ў БСА займалі беларусы, каб падрыхтоўка афіцэраў вялася на беларускай мове, каб каманды і распараджэньні аддаваліся на роднай мове. Аднак немцы настаялі, каб акрамя камандзера-беларуса, быў таксама і шэф-немец. Стварэньне БСА суправаджалася шырокай прапагандысцкай кампаніяй.

Другія, хто арыентаваўся на Маскву ці Варшаву, глядзелі на гэтую справу як на чарговую правакацыю немцаў. Яны разумелі, што стварэньне БСА выразна

Лёнданская лекцыя

Працяг са старонкі 9.

Францыя мае тры гатункі такіх водаў: «Вішы», «Вітэль» і карсіканскую «Лё д'Крэчча». З гэтых трох водаў добрая толькі «Вішы», што мае ў сабе зялеза-серчыстыя складнікі. Дзьве апошнія зусім слабенькія. Чэхія мае таксама тры крыніцы: «Карлсбадзкую» або «Карлаварскую», «Падзебрадзкую» і «марыянскую». Усе названыя гэныя крыніцы вельмі ўважна эксплёатуюцца іхнымі дзяржавамі. Навокал гэтых крыніц павырасталі люксусовыя гатэлі, а навокал тых водаў, якія найбольш адзначаюцца сваёй лячэбнай якасьцю, пабудаваліся велізарныя, прыгожыя гарады, назовы якіх ведамы цэламу сьвету (як Карлсбад ці Вішы).

Ваду гэтых крыніцаў звычайна дзяржава манапалізуе. Сотні тысяч пляшак у дзень закаркоўваюцца і рассылаюцца, як для ўнутранага ўжытку, так і на экспарт. У Францыі, напрыклад, у крамах пляшка «Вішы» каштуе 12 франкаў, а ў рэстаране ці кафэ — амаль столькі сама, колькі і шклянка віна.

У Беларусі маецца на сяньня ўжо 26 крыніцаў, якія прабіліся на паверхню самі: у Друскеніках — з брома-ёдавымі солямі, — над самым Нёманам на поўнач ад Горадні, у прыгожай і лясістай хваёвай мясцовасьці; у Лагойску (Барысаўскага павету); у Баркоўшчыне, крыніца над самым возерам (Лепельскага павету); у Відзах, паміж вазёр (Браслаўскага павету); у Адэмінаве, паміж вазёр (Луцынскага павету); у Вішнёвічах (Лепельскага павету); у Акоўцы (на вярхоўі Дзьвіны); у Адрыянопалі (у вадазборніку беларускай часткі Волгі); у Любчы, Дворыцы, Вялікай Слабадзе, Трошчыцы, Рудніках (гэтыя пяць крыніц на спадах дняпроўскага ўзгор'я); недалёка ад Магілёва знаходзіцца арыгінальная крыніца ў форме возера пад назваю Хіцэмля, вадой якой вылечываюцца розныя скураныя хваробы; у вёсцы Ясеніцы (Наваградзкага павету). Над рэчкай Сэрвачам знаходзіцца аж некалькі крыніцаў на лясістым узгорку.

Усе вышэй названыя крыніцы ўжо даўно былі добра абсьледаваныя што да іх хімічнага складу. Пераважная бальшыня зь іх серна-зялезістыя, але ёсьць і з брома-ёдавымі солямі ды іншымі складнікамі. З пункту гледжаньня лячэбнага — якасьць іх высокая.

З усіх пералічаных крыніцаў выкарыстоўваюцца толькі ў Друскеніках, дзе паўстаў прыгожы, хоць яшчэ маленькі гарадок. Пэўны час у 19-ым стагодзьдзі выкарыстоўваліся ў Лагойску і Баркоўшчыне, але цяпер зусім закінутыя, бо хто ж з хворых можа прыяжджаць лячыцца, асабліва з эўрапейцаў, прывыклых да выгодаў, туды, дзе няма ані дохтара, які парадзіць, як ужываць гэтую ваду, ані нават дзе пераначаваць.

І гэта ў той час, калі бальшыня пералічаных крыніц ляжыць у так цудоўна прыгожых мясцовасьцях, з такім здаровым, хвоіста-лясным кліматам, мясцовасьцях, якім, у сэньсе красы й паветра, нат такія праслаўленыя эўрапейскія курорты, як Карлсбад і Вішы, ня могуць дараўняцца і сотай часьцяй.

Беларусь надаецца асабліва для кліматычных станцыяў і санаторыяў для тубэркулёзных.

Зіма Беларусі таксама надаецца добра для прываблення турыстых чужынцаў. Яна дось мяккая, пры тым маецца досыць сьнегу з узгоркамі (у паўночнай і цэнтральнай Беларусі) для аматараў лыжнага спорту.

У нас ёсьць шмат вялікіх прастораў вазёрнага лёду, на якім, запраўды, ёсьць дзе размахнуцца спартоўцам — аматарам канькоў. Ня менш цікавымі былі б прагулкі на лыжах у нетры беларускіх пушчаў, дзе так шмат дзікай зьвярыны й дзе так казкава маляўніча ў сьнягу іскрацца елкі.

Вы бачыце цяпер, як кісла, нецікава ды няздорава выглядае ангельская зіма, мала цікавейшая й зіма францускі. Я пэўны, што каб запрасіць адзін раз на зіму да нас ангельскіх турыстых, то на кожную наступную будуць прыяжджаць тысячамі. Турыстыка ж чужынцаў — гэта таксама даход дзяржаве.

Зразумела, гэтага нам ніколі ня зробяць акупанты, бо калі да нас і прыяжджаў выпадкова чужынец, дык яму ўсьлед, па пятах, хадзілі тайныя агенты, а гэтага гатунку спорт, зразумела, нікога не цікавіць.

Ужо на падставе толькі вышэй пералічаных мною багацьцяў Беларусі як крыніцаў для задавальненьня нашых нутраных жыцьцёвых патрэбаў і экспарту лішак на закуп нехапаючых у нас матэрыялаў, маглі б сьмела сказаць, што стаімо мы ў шмат разоў лепш за такія дзяржавы, як Італія, Швэйцарыя і дзясятак іншых эўрапейскіх народаў. Нават з гэткімі сваімі рэсурсамі мы б маглі ўтрымаць на людзкім узроўні жыцьцёвы стандарт нашага народу і ня быць дэфіцытнай дзяржавай. Але ж гэта яшчэ ня ўсё — і вельмі далёка ня ўсё.

БАЛОТЫ. Доўгі час і то як найбольш улюбёным аргумэнтам, як сымбалем нашай беднасьці, «білі»

падзеліць насельніцтва на сваіх і чужых, уваб'е клін раздору паміж людзьмі, распаліць грамадзянскую вайну. Гэта дасьць магчымасьць потым, пасьля разгрому немцаў, канчаткова зьнішчыць нацыянальны рух.

Трэція, большасьць насельніцтва, хацелі спакою, усялякім чынам імкнуліся выжыць у экстрэмальнай сытуацыі.

Да начынаньняў В.Кубэ на Беларусі вялікую цікавасьць выяўлялі разьведкі СССР і Польшчы. Інфармацыя на гэтую тэму перадавалася вельмі апэратыўна. У спэцыяльным бюлетэні «Ведамасьці з Навáградчыны» ад 31 жніўня 1942 г. польская разьведка падрабязна аналізавала зьмены палітыкі немцаў на тэрыторыі Остлянду. «У Эстоніі, Латвіі і Літве існуюць інстытуты г.зв. "генэральных дарадчыкаў". Відаць дайшла чарга і да Беларусі... Падобна як і на тэрыторыі "Рэйхскамісарыяту Ўкраіны" немцы прыступілі і на Беларусі да стварэньня беларускіх ваенных фармацыяў для барацьбы з савецкімі дывэрсійнымі бандытамі. Фармацыі пад агульнай назвай "Беларускі вольны корпус самааховы" (На Украіне — "Украінская служба самааховы") — павінны непасрэдна падпарадкоўвацца нямецкім фармацыям СС. Яны павінны мець добраахвотніцкі характар».

Крыху пазьней, у аналітычным аглядзе разьведкі АК пра становішча на Ўсходзе за пэрыяд з 15 ліпеня па 15 верасьня 1942 г. адзначалася: «Ганебна прайграўшы барацьбу з партызанамі, генэральны камісар загадаў стварыць Корпус Беларускай Самааховы, які павінен налічваць 150.000 чалавек, падзеленых на роты й баталёны, падпарадкаваныя нямецкаму кіраўніцтву. Пасьля выданьня з дапамогай беларускіх дзеячоў ганебнага звароту да беларускага насельніцтва, быў адчынены курс падрыхтоўкі афіцэраў. На першы курс зьявілася 120 кандыдатаў былых царскіх афіцэраў, афіцэраў польскай службы, беларусаў, а таксама моладзі, якімі пад наглядам немцаў кіруе капітан Кушаль. Тым часам, замест напłыву добраахвотнікаў, якіх не было, арганізаваны набор прызыўнікоў, які, як усе разумеюць, азначае далучэньне іх да нямецкай арміі.

Тым часам, савецкія партызаны пачалі масавае зьнішчэньне [былых] белых афіцэраў. Сярод беларусаў пры гэтай сытуацыі паўстала вялікае ўзбуджэньне. Справа стварэньня Корпусу Самааховы — звычайны сродак акупанта, які хоча савецкімі рукамі зьнішчыць актыўны беларускі элемэнт, а таксама захаваць і павялічыць свае ваенныя кадры».

Ня трэба быць асабліва падрыхтаваным, каб бачыць, што «актыўны беларускі элемэнт» быў косткай у горле як для немцаў, так і палякаў, і бальшавікоў. У справаздачных дакумэнтах партыйных органаў і партызанскай разьведкі яскрава бачныя апэратыўныя мерапрыемствы аб зрыве гэтай «затеи гитлеровцев».

У рэшце рэшт ідэя стварэньня БНС і БСА правалілася. У крыніцах і літаратуры існуюць процілеглыя тлумачэньні гэтага. Так Кушаль і Езавітаў пішуць аб «небывалым энтузіязме» насельніцтва, што ў БСА яно бачыла сілу, якая зьнішчыць партызаншчыну і будзе асновай беларускай арміі. У савецкіх, польскіх і нямецкіх крыніцах пераважае меркаваньне, што беларусы не ўспрынялі гэтую ідэю.

Ю.Туронак зьвяртае ўвагу на канфлікт паміж службай бясьпекі і СД і В.Кубэ, які адбіўся на лёсе гэтай задумы. Праект Кубэ-Цэнэра-Ермачэнкі сустрэў крытыку вышэйшых нямецкіх паліцэйскіх уладаў, якія не хацелі ўзрастаньня палітычнай пазыцыі Ермачэнкі, супраць якога і В.Кубэ Менскае СД актыўна зьбірала кампрамат. Летам 1943 г. начальнік службы бясьпекі і СД Штраух пісаў: «Памянуты вышэй Ермачэнка быў паслухмяным інструмэнтам правядзеньня беларускай палітыкі генэральнага камісара. Ён (Кубэ) даў яму зразумець, што ён мог бы быць беларускім прэм'ерам. Ермачэнка ішоў да гэтай мэты ўсімі магчымымі сродкамі пры падтрымцы гаўляйтэра... Лічу дастатковым, калі адзначу, што я год свайго знаходжаньня ў Беларусі затраціў на тое, каб даканаць Ермачэнку...»

Як бачым, гэта была нялёгкая справа.

Спачатку быў адазваны адзін з аўтараў праекту генэрал Цэнэр. Выступаючы на гадавіне стварэньня БНС Ермачэнка казаў: «31 ліпеня г.г. я з жалем даведаўся ад прыйшоўшага да мяне разьвітацца генэрала Цэнэра, што ён службова пераводзіцца на высокае месца ў Бэрлін і пакідае Беларусь. Гэта для нас беларусаў быў вялікі ўдар, бо ў асобе генэрала Цэнэра мы трацім вялікага прыяцеля беларускага народу...»

Замест Цэнэра быў прызначаны В.Шымана, які, кіруючыся ўказаньнямі зьверху, стаў выпраўляць памылкі свайго папярэдніка. Толькі распачаўшыся, працэс стварэньня баталёнаў БСА пачаў штучна тармазіцца з боку немцаў. Згодна з дадзенымі Ф.Кушаля, было створана каля 20 баталёнаў і некалькі меншых адзінак. Аднак яны й далёка не адыгралі той ролі, якая на іх ускладалася. Таму было некалькі прычын.

Адна з галоўных — у тым, што немцы зусім справядліва баяліся ўзбройваць нацыянальныя вайсковыя адзінкі, тым больш даваць ім якія-небудзь палітычныя пэрспэктывы. Пра гэта на ўвесь голас гаварылася на сходзе БНС у лістападзе 1942 г. «Няма ніякай магчымасьці заставацца няўзброенымі. Мы павінны мець свае ўзброеныя сілы, інакш мы ніколі не адновім давер нашага народу», — падкрэсьліваў кіраўнік БНС Наваградзкай акругі. «Арганізацыя Беларускай Самааховы створана, аднак працы не вяла. Зараз справа стаіць на адным месцы, ці больш правільна, ідзе назад. Многія людзі былі пазваныя ў БСА, а затым адпраўленыя па хатах. Многіх зь іх зьнішчылі партызаны... Давер народу падае», — адзначаў кіраўнік БНС Слонімскай акругі.

Гарачы запал выступоўцаў астудзіў прысутны на сходзе нямецкі капітан Кумар, які заўважыў, што няма чаго сьпяшацца з арганізацыяй БСА. Гэтая праца павінна весьціся ў тайне. Спачатку трэба падрыхтаваць кадры і вучыць іх. Ф.Кушаль, які выступіў за ім, сказаў, што трэба ствараць беларускі вайсковы лад жыцьця. Ужо складзены часткова беларускія вайсковыя падручнікі, апрацаваны вайсковы статут, тактыка, тапаграфія і іншае... Беларусы не ваяўнічыя людзі, таму што яны доўгі час служылі чужынцам. Трэба ліквідаваць такія настроі. Ф.Кушаль некалькі разоў падкрэсьліў: лепшая дыпляматыя — гэта свая армія.

Шымана ў процівагу БСА стаў ствараць беларускія паліцэйскія баталёны (шутцманшафты) пад камандай нямецкіх афіцэраў. Першы такі баталён № 49 пачаў ствараццa ў Менску ў жніўні 1942 г. На статус шутцманшафтаў Шымана пачаў пераводзіць і атрады БСА, аднак кіраўніцтва БНС і камандзеры не пагадзіліся з гэтым, маючы намер захаваць сваю абасобленасьць. Праблема набывала палітычны прысмак. Кубэ зьвяртаўся ў розныя ўстановы аб дастаўцы зброі, абмундзіраваньня для БСА, але рэальнасьць і апазыцыя былі мацнейшыя за яго.

У канцы 1942 г. Ермачэнка быў пазбаўлены тытула галоўнага камэнданта БСА, яму забаронена было мець штаб. Замест гэтага пры ім быў прызначаны рэфэрэнт па справах БСА, а таксама ў акругах былі прызначаныя рэфэрэнты пры старшынях БНС, якія падпарадкоўваліся акруговым начальнікам паліцыі. Было забаронена карыстацца афіцэрскімі рангамі, замест іх уводзіліся назвы службовых пасадаў: камандзер зьвязу, камандзер роты і г.д.

Падобнае стаўленьне нямецкіх уладаў да БСА, імкненьне зрабіць гэтыя фармаваньні палкам падуладнымі сабе (прызначэньне ў якасьці шэф-кіраўнікоў нямецкіх афіцэраў) зьбівала энтузыязм у тых актывістаў беларушчыны, якія імкнуліся выкарыстаць БСА ў якасьці нацыянальнага войска.

Другая прычына — гэта савецкі партызанскі рух і пералом у вайне, які пачаў адчувацца на акупаванай тэрыторыі пасьля разгрому немцаў пад Сталінградам. Больш таго, на справе стварэньня БСА адбіваліся розныя падыходы акупацыйнай цывільнай адміністрацыі і кіраўніцтва паліцыі бясьпекі і СД, прыхаваны канфлікт паміж Кубэ і Гімлерам.

У красавіку 1943 году на нарадзе ў генэральнага камісара Беларусі начальнік паліцыі парадку палкоўнік Клепш так абгрунтаваў неабходнасьць роспуску БНС: «... Спроба стварыць самаахову зь беларусаў-дабраахвотнікаў правалілася па некалькіх прычынах: па-першае, нягледзячы на шматлікія спробы, ад вермахта не ўдалося атрымаць неабходную колькасьць зброі; па-другое, бяззбройныя самаахоўцы і іх сем'і пастаянна тэрарызаваліся з боку партызан як толькі стала вядома пра стварэньне самааховы; па-трэцяе, гэтыя людзі, за рэдкім выключэньнем, зьяўляліся ненадзейнымі, бо лёгка паддаваліся варожай прапагандзе й сымпатызавалі партызанам. Мелі месца выпадкі, калі буйныя патрулі самааховы, узброеныя вінтоўкамі і аўтаматычнай зброяй, замест аказаньня супраціву, пераходзілі на бок бандытаў. Да таго ж праведзеная згодна заданьня Беларускай Народнай Самапомачы мабілізацыя людзей у беларускую самаахову была ажыцьцёўленая не ў адпаведных умовах, духу і, у рэшце рэшт была даручана жандармэрыі».

Аднак галоўнаю прычынаю няўдачы БСА відавочна была негатовасьць нямецкіх палітыкаў вырашаць нацыянальнае пытаньне на акупаваных тэрыторыях. Новы падыход да гэтае праблемы зьявіўся ў іх толькі пасьля пералому ў падзеях на ўсходнім фронце.

Афіцыйна, вясной 1943 г. БНС была распушчана. Але ў некаторых раёнах адзінкі БСА працягвалі існаваць і надалей, аж да стварэньня Беларускай Краёвай Абароны.

нашымі балотамі. Нават Якуб Колас пад уплывам гэтай прапаганды калісь пісаў: «Край мой бедны, край нягожы, Мох, балота ды пясок...»

Сяньня аб балоце (аб пяску скажам пазьней) вучоныя цэлага сьвету зусім накшай думкі і называюць яго «чорным золатам». Некаторыя эўрапейскія дзяржавы, а асабліва перад апошняй вайной Злучаныя Штаты Паўночнай Амэрыкі, пачалі ў сябе разводзіць балоты штучна, заліваючы ніжэйшыя кавалкі тэрэнаў.

На Беларусі балоты яшчэ сяньня займаюць каля 8-мае часткі ўсяе тэрыторыі, што складае каля 50.000 квадратных кілямэтраў, або 5.000.000 гектараў. У 90 працантах яны знаходзяцца ў паўднёвай частцы Беларусі і ўяўляюць зь сябе амаль суцэльную паласу цягам усяе ўкраінскае граніцы даўжынёй каля 800 кілямэтраў і шырынёй каля 60 кілямэтраў пад агульнаведамым назовам Палесься.

У канцы 19-га стагодзьдзя й пачаткам 20-га значная частка беларускіх балотаў была асушана. З 1873 па 1902 год зь ініцыятывы Зілінскага было асушана 350.000 дзесяцінаў пракапаньнем каналу. Між 1924-30 гадамі, калі ў Савецкай Беларусі кіраўніцтва асьветы й гаспадаркі апынулася пераважна ў беларускіх руках — была асабліва зьвернута ўвага на Палескія Балоты.

У Менску быў заснаваны адмысловы дасьледчы сэктар пры Беларускай Акадэміі Навук. Студыі беларускіх вучоных, праведзеныя лічныя экспэдыцыі, дазволілі зрэалізаваць шмат чаго карыснага. Сяньня засеў балотаў тэхнічнай расьлінай — коксагызам — аб якой мы ўспаміналі, ёсьць вынікам працы беларускіх вучоных.

Была праведзеная таксама досыць шырокая кампанія па асушцы Палесься. Камісар земляробства Савецкай Беларусі Прышчэпаў павёў энэргічна асушку. За ягонага камісараваньня было пракопана 4.000 кілямэтраў каналаў і асушана каля 2,5 мільёнаў дзесяцін. На асушаных балотах ураджайнасьць сенажацяў павялічылася ў 10 разоў. Паўставалі палі, на якіх рознае збожжа расло, як кажуць, бы трасьнік.

Дарэчы, праводзіў Прышчэпаў і вельмі разумную сыстэму зямельнай рэформы, рассаджваючы сялян невялічкімі пасёлкамі па чатыры хутары разам. Усё гэта вельмі не спадабалася Маскве. Прышчэпаў быў агалошаны «ворагам» беларускага народу і «зьліквідаваны». Афіцыйна яму закідалі, што асушкай беларускіх балотаў хацеў улегчыць праход капіталістычна-фашыстоўскіх войскаў і натварыць больш кулакоў на Беларусі.

Як бы там ні было, практыка асушкі беларускіх балотаў, якіх у Беларусі запраўды многа, паказала, якія велічэзныя запасы так добрай зямлі мы можам лёгка выкарыстаць. Вялікіх капіталаў для асушкі не патрабуецца. Зілінскаму, напрыклад, асушка 1 дзесяціны абыходзілася 1 рубель 33 капейкі. Пры ўжытку навачэсных машынаў гэта можа каштаваць яшчэ менш.

Калі, скажам, мы б пакінулі для разводкі коксагызу якісь 1 мільён гектараў, а рэшту, 4 мільёны асушылі, дык з ужо асушанымі мы б мелі каля 6,5 мільёнаў гектараў зямельнага фонду, добрага чарназёму, родзячых сенажацяў. Прыймаючы пад увагу ўжо ўсё сказанае, што асушка балотаў павялічвае ўраджайнасьць зямлі ў 10 разоў — на ўсім прасторы Палесься магло б жыць толькі з аднаго земляробства ў 10 разоў больш насельніцтва — гэта знача каля 10.000.000 (цяпер жыве толькі каля 1 мільёну). Але скажам ня 10, а 5 мільёнаў, каб падвоіць дабрабыт насельніцтва.

I гэта толькі тое, што мы сказалі пра нашыя балоты зьверху. Паглядзім жа, якую яны велічэзную вартасьць уяўляюць зь сябе яшчэ зьнізу, у нутры сваім.

ТОРФ. Вякамі растучыя ў нетрах балота розныя расьліны — як ціна, мох і іншыя і, згніваючы ў беспрысутнасьці паветра, утварылі зь сябе пласт матэрыі, якую называем торфам. Таўшчыня гэтага пласту ў бальшыні даходзіць да 3-х мэтраў. Інжынэр Анацкі абрахаваў агульны запас сухога торфу ў Беларусі на 20 мільярдаў пудоў. Нябожчык Прэзыдэнт П.Крэчэўскі падлічыў, што аднаго толькі штогодняга прыросту хапіла б нам, каб задаволіць поўнасьцю шырака разьвітую ў нас індустрыю.

Такім чынам у Беларусі маецца запасу торфу на тысячы гадоў пры найшырэйшай яго эксплёатацыі, на якую б былі толькі здатныя прадуктыўныя сілы беларускага народу, як для свайго натуральнага ўжытку, так і для экспарту. Зямля ж, вызваліўшыся ад торфу, нічога на сваёй якасьці ня траціць, наадварот, прагноеная ад балота, яна робіцца яшчэ лепшай.

Якую ж гаспадарчую вартасьць мае наогул торф?

1) Торф як гнойліва

Торф як гнойліва мае надзвычайна вялікую якасьць. Самым лёгкім і простым спосабам прыгатаваньня

Працяг на старонцы 12.

Лёнданская лекцыя

Працяг са старонкі 11.

тарфянога гною ёсьць падсыцілка яго статку, у форме спрасаваных тонкіх плітак. Другі спосаб — падгнойваньне яго ў ямах, гэтак званы торфафэкальны кампост.

Практыка паказала, што тарфяны гной шмат лепшы за гной звычайны, саламяны. Напрыклад, такі грунт, які ўважаўся за нармальны, даючы 110 цэнтнараў бульбы з гектару, пры даданьні тарфянога кампосту павышаў ураджай бульбы да 265 цэнтнараў з гектару, а буракоў з 150 да 750 цэнтнараў.

Краіна, якая першая пачала выраблаць тарфяныя пліткі для ўгнойваньня на экспарт, была Швэцыя. Прадукавалі іх на экспарт і Немцы, прывозячы частку торфу зь Беларусі і дамешваючы яго з сваім, пасылалі ў Францыю, Англію, Бэльгію і Амэрыку. Францыя ўвозіла да сябе такіх плітак штогодна каля 3.000 вагонаў.

Амэрыканская імпартная фірма «Костумэрс-Імпорт» агаласіла была ў сваім часопісе, што найлепшым у сьвеце торфам зьяўляецца торф беларускі і Амэрыка пачала была рабіць усе свае замоўленьні ў СССР і Польшчы.

2) Торф як паліва

Раней торф як паліва ўжываўся вельмі прымітыўным спосабам. Сяляне нашы капалі яго пліткамі ў форме цэглы і падсушвалі на сонцы. У торфе заставалася шмат вільгаці. Цеплавая якасьць яго таму не перавышала сярэдняе якасьці сухіх дроў.

Цяпер жа з торфу прыгатаўляюць так званыя брыкеткі, прасуючы спэцыяльнымі машынамі пры тэмпэратуры 600—700 градусаў Цэльсія, вільготнасьць якіх зводзіцца да 15 працэнтаў. У такім стане цеплавая здольнасьць тарфяных брыкетак у шмат разоў павышаецца. Напрыклад, пры ўжываньні брыкетак у газагенэратарных машынах, аўтах, торфу патрабуецца напалову менш, як дроў. З тэй самай зарадкай тарфянымі брыкетамі аўта ці грузавік праходзіць 250 кілямётраў замест 100-120 пры дровах. Кашто́ўнасьць паліва на кілямэтр праезду торфам у 4 разы дзешавейшы за праезд дровамі і ў 6 разоў за праезд бэнзынам.

У Гомелі бальшавікі пабудавалі велізарныя гуты высокаякаснага «эмскага» шкла, выкарыстоўваючы мясцовы торф як паліва, а пяскі ракі Сожы як сыравіну. Гуты гэтыя абслугоўвалі цэлы Савецкі Саюз.

3) Сьвяцільны газ, кокс

Торф вельмі добра надаецца для прадукцыі сьвяцільнага газу. Пры вырабе сьвяцільнага газу атрымоўваецца тарфяны кокс. Тарфяны кокс, як падае менскі часопіс «Беларусь» №2 за 1945-ы год, цалком можа замяніць далёка прывозны каменнавугальны кокс. Тарфяны кокс можа ўжывацца, як у мэталюргіі, так і ў чыгуначнай галіне.

Практыка паказала, што пры адліўцы чыгуну з тарфяным коксам апошні атрымліваецца лепшай якасьці, чым нават зь мінэральным коксам, бо кокс тарфяны мае ў сабе шмат менш вугляроду і серкі, як каменна-вугальны кокс.

4) Электрычная энэргія

За часоў, празваных бальшавікамі «Нацдэмаў» (Беларуськія Нацыянал Дэмакраты) у Савецкай Беларусі была пабудавана вялізная тэрмаэлектрычная станцыя ў Асінаўцы — г.зв. «Асінастрой», на тарфяным паліве, якая асьвятляе й абслугоўвае мясцовую індустрыю Віцебску, Магілева і іх акругаў. Зразумела, што для выкарыстаньня электрычнай энэргіі з торфу маюцца ў нас невычарпальныя крыніцы.

5) Бэнзын

Торф вельмі надаецца і добра аплачваецца для вырабу бэнзыну. У Савецкай Беларусі была выбудавана «Нацдэмамі» фабрыка бэнзыну, якая потым была зьнішчаная падчас вайны; прадукавала яна некалькі тысячаў тонаў бэнзыну ў год.

6) Сьпірт, цукар

У сучасны момант з торфу атрымоўваюць у значнай колькасьці сьпірту і цукру. 2,5 тоны торфу даюць каля 150 літраў чыстага сьпірту.

7) Розныя хімічныя прадукты

Пры газыфікацыі торфу, побач з газам і коксам, выходзіць гэтак званая тарфяная смала, пры перапрацоўцы якой атрымоўваецца цэлы шэраг розных прадуктаў (хімічных) вельмі неабходных у сучаснай народнай гаспадарцы, як напрыклад: крэолін, лізоль, маторнае паліва, змазачныя маслы, пэк, крэазот — ужываны сяньня шырака ў мэдыцыне, парафін, фэноль, воцатныя кісьліні для прамысловасьці, аманьяк і шмат іншых.

8) Торф, як ізалятар, антысэптычны й мэдычны прадукт

Торф па сваёй якасьці зьяўляецца добрым ізалюючым матэрыялам. Сухі торф не праводзіць цяпла і разам з гэтым уцягвае ў сябе вільгаць. Дзеля гэтага сяньня яго пачалі шырака ўжываць у будоўлі. Ужываньне ізаляцыйных пліт з торфу ў перагародках, насьціланьне іх на столь — робіць хату вельмі цёплай, сухой і здаровай.

Пасыпка сухога торфу час ад часу на падлогу выцягвае з хаты ня толькі вільгаць, а і ўсе гнілобна-шкодныя бактэрыі. Гэта даказала ўжо практыка пры падсыцілцы торфам скаціне і барацьбе з эпідэміямі.

З тарфяных пліт можна нават будаваць 2-х павярховыя дамы. Можам сабе ўявіць, як здаровы й цёплы быў бы такі дом. Аднапавярховых дамоў з пліт ужо маецца шмат.

Яблыкі і дулі, перасыпаныя тонкім пластом тарфянога парашку, перахоўваюцца цэлую зіму і не гніюць.

У Францыі з торфу выраблаюць ніткі і зь іх робяць тканіны. Вопратка такая вельмі гігіенічная.

Ужываецца таксама торф для набіўкі сяньнікоў і матрасаў для бальніц і дзіцячых установаў. Зь вялікім посьпехам карыстаюцца ў мэдыцыне. Пры тарфяной перавязцы рана хутчэй вылечваецца, як пры ватняй. Тарфяныя ванны, або так званыя «гразевыя ванны» — добра вылечваюць раўматызм, падагру і іншыя хваробы.

Ня будзе нам цяпер дзіўным, што Злучаныя Штаты Паўночнай Амэрыкі перад вайной замовілі былі такую вялікую колькасьць беларускага торфу пры так дарагіх, адносна аддегласьці, транспартных выдатках.

Дык вось што варты нашы «бедныя» балоты, якімі нас так доўга палохалі.

КАМЕННЫ ВУГАЛЬ. Ці ёсьць у Беларусі <u>чорны</u> каменны вугаль, на якім да сяньня аснована сучасная прамысловасьць, на разе мы нічога сказаць ня можам, але тое, што мы вышэй сказалі аб торфе, нат калі б яго й не аказалася ў Беларусі — нічога нашу прадукцыю ў разьвіцьці індустрыі стрымаць ня зможа.

Маюцца затое ў Беларусі значныя запасы <u>рудога</u> каменнага вугалю каля Мазыра на берагох Прыпяці, ды іншых мясцовасьцях (прыкладам, у Расляўскім павеце). У Лідзкім павеце знойдзены <u>лігніт</u> (руды вугаль, у якім яшчэ значна будова дрэваў, зь якіх ён стварыўся).

Усе гэтыя віды вугалю ў нас добра не абсьледаваны й зусім не эксплёатуюцца.

ЗЯЛЕЗНАЯ РУДА. За часоў незалежнасьці Беларусі, ды яшчэ ў канцы 18-га і пачатку 19-га стагодзьдзяў, чыгун у нас выплаўлялі з балотнае руды. Ад гэных часоў, яшчэ й па сяньня, у Беларусі шмат дзе валяецца чыгунных шлякаў, як сьведак аб калішняй выплаўцы чыгуну. Балотнай руды на Беларусі шмат, а асабліва ва ўсходне-паўднёвым Палесьсі.

Перад вайной 1914-га году быў выкрыты <u>руды зялязьняк (лімоніт)</u> у многіх частках Беларусі, а асабліва ў Віленшчыне й Меншчыне. У Слонімскім павеце ля двара Віхры знайшлі нейкую руду, што мела ў сабе 43 працэнты зялеза.

Пад час «Нацдэмаўшчыны» ў Савецкай Беларусі былі выкрыты ў Аркоўскіх лясох велічэзныя залежы, у якіх маецца 70 працэнтаў зялеза, але незадоўга масавыя арышты беларускіх навукоўцаў, спынілі былі ўсе гутаркі аб гэтым адкрыцьці.

Сяньняшняя савецкая эканамічная прэса падае як ужо аканчальна ўстаноўленыя месцы зь зялезнай рудой падыспадам цэлага Рудабельскага і Глускага раёну, пад якімі знаходзіцца пласт зялезнае руды таўшчынёй 12 мэтраў.

Словам, зялезнай руды ў Беларусі, як бачым, таксама шмат, хоць яна пакуль што яшчэ не эксплёатуецца.

СОЛЬ. Соль, за якой так доўга «тужылі» нашыя сяляне і якой нас так моцна білі ў 1918-м годзе, была, нарэшце, выкрыта адным маладым беларускім інжынэрам у 1934 ці 1935 годзе. Знаходзіцца яна каля вёскі Давыдаўкі Даманавіцкага раёну на глыбіні 844 мэтраў і займае падземны прастор у некалькі сотняў квадратных кілямэтраў.

ДАРАГІЯ КАМЕНЬНІ. Нягледзячы на тое, што ў напрамку росшукаў дарагіх мэталаў і дарагіх каменьняў не праводзіліся ніякія паважныя дасьледаваньні, усё ж такі, амаль выпадкамі беларускімі вучонымі шчэ да вайны 1914-га году былі знойдзены ў вярхоўі Дзьвіны у яе скалістых берагох — <u>халцэдон, сердолік, горны крышталь</u>, а каля вёскі Андрыянопалю — <u>золата</u>. У гэтым жа раёне было знойдзена адным маладым беларускім вучоным у 1933-м годзе і <u>срэбра</u>.

Нічога аднак з вышэй названых мэталаў не эксплёатуецца і нічога нават паважна не абсьледавалася.

ГОРНЫ ВОСК. У расляўскім павеце знаходзіцца горны воск, зь якога выраблаецца <u>парафін</u>. Па хімічнаму складу свайму і паходжаньню падобны да газы (нафты).

ФАСФАРЫТНЫЯ КАМЕНЬНІ. Гэтыя каменьні маюць вялікае значэньне для сельскай гаспадаркі, зь іх, як мы ўжо ведаем, выраблаюцца штучныя гнаі. Такіх каменьняў на Беларусі ёсьць вельмі шмат у Расляўскім павеце, у Наваградчыне, ля Горадні, на Палесьсі.

БУРШТЫН. У заходнім Палесьсі, а найбольш у Піншчыне знаходзіцца шмат бурштыну.

БУДАЎЛЯНЫ МАТЭРЫЯЛ. Апрача дзеравянага будаўнічага матэрыялу на Беларусі маецца шчэ шмат іншага, канечна патрэбнага ў будаўніцтве матэрыялу.

1) Маргельныя каменьні

З гэтых каменьняў выраблаецца <u>цэмэнт</u> пры перамяленьні іх на муку. У адной толькі Гомельскай акрузе маецца такіх каменьняў на 2 зь лішнім мільярды пудоў цэмэнту. Маецца шмат такіх каменьняў і ў іншых мясцовасьцях Беларусі (паўночнай асабліва).

«Млыны», якія працавалі ў Гомельшчыне да вайны 1914-га году, абслугоўвалі цэмэнтнай мукой большую частку Савецкага Саюзу. Пры вырабе цэмэнтнай цэглы, слупоў і наагул пры ўсякай будоўлі з цэмэнту, патрабуецца яшчэ добры, чысты <u>пясок</u> і <u>жвір</u>. Калі ў іх пападае сьмяцьцё ці якіясь гнілыя прымясі — цэмэнт тады іх ня склейвае.

У Францыі, Нямеччыне, Чэхіі маюцца цэлыя вялікія прадпрыемствы, якія вышукваюць гэткі пясок, яго скрабуць з дна рэчак, мыюць, сеюць і таму падобнае і гэта ўсё каштуе шмат працы. На Беларусі маецца мноства чыстых пяскоў і жвіру, зусім гатовых на дамешку да цэманту.

Прымаючы пад увагу, што раёны маргельных каменьняў, як і пяскі, знаходзяцца пераважна пры берагох вялікіх рэк Беларусі, прадукцыя і гандаль бэтонавых матэрыялаў у нас значна палегчываецца таннасьцю транспарту. Агулам, як бачым, гэтая дзялянка індустрыі мае ў нас бліскучыя пэрспэктывы.

2) Шкляны матэрыял

Шкло мае таксама вялікі ўжытак у гаспадарстве: шыбы, посуд, пляшкі, рознае судзьдзё ў фармацэўтыі, мэдыцыне. Усе гэтыя рэчы зьяўляюцца вельмі неабходнымі, да таго яны вельмі часта зужываюцца, б'юцца.



Здымак А.Адамчык

Калі мы гутарылі аб патрэбе чыстага пяску для цэмэнту, дык для шкла чысьціня яго вымагаецца яшчэ больш. Апрача чысьціні для шкляробскага вырабу патрэбен яшчэ пясок спэцыяльны па хімічнаму складу. Ня можа вырабка шкла абысьціся і без маргельнага каменя.

Таму на Беларусі для шкляное прамысловасьці шырокае поле. Чэхі, якія сяньня закідваюць усіх экпэртаў свайго шкла, прывозяць самі нехапаючы ў іх высакаякасны пясок з Скандынавіі. Беларусы ж могуць увесь такі пясок мець свой. Ёсьць шмат мясьцінаў на Беларусі, якія чакаюць на гуты.

ГРАНІТ. Граніт на Беларусі знойдзены двох гатункаў:

1) звычайны шэры граніт каля Лельчыц на Мазыршчыне, абрахаваны запас прыблізна на 9.000.000 тонаў.

2) граніт ружова-шэры каля вёскі Глушавічы Лельчыцкага раёну (Мазыршчына). Апошні шмат даражэйшы і йдзе на дэкаратыўныя вырабы.

ГЛІНЫ.
1) Каолін — або фаянса-парцалянавая гліна. Беларусь вельмі багатая ўсялякімі глінамі, а ў тым ліку і такой высокавартаснай глінай, як каолінам, зь якой робяць парцалянавае і фаянсавае судзьдзё. Каоліністых глінаў маецца ў Эўропе мала дзе. У Францыі меліся досыць вялікія капальні каолінавых глінаў, але яны ўжо падыходзяць да канца вычарпаньня. Францыя пасылала шмат гэтай гліны ў Нямеччыну і мела зь яе вялікі зыск.

На Беларусі каолінавая гліна ёсьць шмат у якіх мясцовасьцях, а найбольш ля мястэчка Тэлеханаў у Пінскім павеце.

2) Окравая гліна або францускі окр. Знаходзіцца каля Лоева. З гэтай гліны выпрабляецца высокаякасная мука для малявідлаў. З эўрапейскіх краін окравыя гліны маюць толькі Францыя (дэпартамэнт Ён), Нямеччына (у Саксоніі), Чэхія і Арменія.

3) Агнятрывалыя гліны. Знаходзяцца ў старых пластах у Чавускім ды Дарагабускім паветах.

4) Ганчарная гліна. Шмат дзе здабываюць вельмі добрую ганчарную гліну, напрыклад, ля вёскі Ясяніца (Наваградзкі павет), ля мястэчка Ракава (у Маладэчанскім павеце), у Смаленшчыне, Віцебшчыне і іншых.

5) Кахляная гліна. Каля Смаленску, Капыся, Івенца ды іншых мясцоў здабываецца добрая гліна для вырабу кахляў.

6) Цагляная гліна. Гліны для вырабу цэглы да будоваў капаюць амаль дасло́ўна па ўсёй Беларусі.

Наагул жа гліны, як і ўсе іншыя мінэральныя багацьці Беларусі, шчэ мала навукова дасьледжаныя, хоць і знаходзяцца яны амаль на вярху.

ВАПНА. Вапна спатыкаецца па ўсёй Беларусі. Найбольшыя залежы знаходзяцца пад Менскам, ля Смаленску, Віцебску, пад Воршай. Аршанская вапна ўважаецца за найлепшую, таму яе яшчэ да вайны 1914 году найбольш там капалі.

На Віцебшчыне дабываюць даляміты. Каля Смаленску і ў Расла́ўскім павеце — вапенны туф — гэта такія дзюркаватыя кавалкі, што вытвараліся ў гэтак званых вуглякіслых вапенных крыніцах пры сьцяканьні вады.

Туф і даляміты гэта ўжо гатовы, прыгатаваны прыродай матэрыял да будаўніцтва, моцны й лёгкі пры працы.

Вапна ж наагул вельмі неабходны матэрыял у будаўніцтве, яе ўжываюць і ў прымешку з бэтонам.

КРЭЙДА. Белая, пішучая крэйда, у многіх мясцох Беларусі павылазіла на верх цэлымі горамі, асабліва на паўднёвым ланцугу ўзгор'яў, напрыклад, каля мястэчка Міра і па ўсёй Наваградчыне. Праяжджаючы праз гэтыя мясцовасьці ўжо здалёку можна пабачыць сярод палёў белыя, быццам сьнегам пакрытыя прасторы. Мясцовыя сяляне дабываюць крэйду на свой спосаб досыць прымітыўна і адпраўляюць яе ва ўсе беларускія гарады: Вільню, Менск і іншыя. Здабываюць яшчэ шмат крэйды ў Расла́ўскім павеце, Магілёўшчыне ды і Аўгустоўскім павеце.

Пару слоў шчэ што да прадуктаў, якія досыць шырака ўжываюцца ў сучаснай тэхніцы і якія ў нас яшчэ не аб'яўленыя, або і зусім не аб'явяцца. Да іх належаць: газа (нафта), медзь, алюміні, волава, амянт.

ГАЗА (НАФТА). Гэтая сыравіна, без сумліву, адыгрывае ў сучаснай тэхніцы вялізную ролю. Галоўныя прадукты, што выпрабляюцца зь яе: бэнзын, карасіна і розныя хімічныя прадукты.

Ці ёсьць газа на Беларусі? Пакуль што ня можам адказаць ані пацьвярджаючы, ані адноўна. А гэта дзеля таго, што шмат якія вучоныя спэцыялістыя цьвердзяць, што ў Беларусі сыравіна гэта мусіць быць, але паважныя росшукі ў гэтым напрамку ня былі яшчэ прадпрынятыя. Праўда, у 1937 годзе адзін селянін Наваградчыны, капаючы студню, наткнуўся на жылу газы, якая яму заліла студню. Селянін склікаў суседзяў. Паглядзелі, пагутарылі ды што ж мелі рабіць з гэтай сьмярдзючай жыдзьдзю? Закапалі студню — на гэтым і скончылася.

Шмат іншых прызнакаў даюць паважныя падставы верыць, што нафта ў нас ёсьць. Калі яна будзе запраўды выяўлена, дасьць гэта Беларусі яшчэ адну вартасную сыравіну. Але калі б яе нават і не знайшлося, дык давозіць беларусам гэтага матэрыялу прыйшлося б няшмат. Хіба пэўную частку бэнзыны пакуль б то бы разьвілася свая прамысловасьць вырабу яго з торфу.

Што датычыць карасіны для асьвятленьня, дык гэты прадукт як такі штораз больш траціць значэньне. У гарадох яго выціснула электрыка, якая ў шмат разоў таньнейшая і выгаднейшая за карасыну. Гэта ж можна дый патрэбна будзе правесьці і па вёсках, што праведзена па цэлым цывілізаваным сьвеце.

Што да рэшты названых намі вышэй прадуктаў, дык некаторыя зь іх, як напрыклад, амяніт (для луджаньня катлоў у мэталюргіі) здабываюцца толькі ў двох ці трох мясцовасьцях на цэлым сьвеце (Мэксыкі і Афрыкі) і патрабавалі б мы яго вельмі ў нязначнай колькасьці.

Медзь жа, алюміні, цынк, волава патрабуюцца ў паважнай колькасьці, але ж пакінем наразе іх здабычу іншым народам, бо так бы мы запраўды дакаціліся да аўтаркіі, да якой, як мы бачылі, не дайшоў ніводзін народ у сьвеце, ды да чаго сяньня ўжо ніхто ня пнецца.

P.S.

1) Да справы знаходу солі ў Беларусі.
Соль у Беларусі была выкрытая адной з геалягічных экспэдыцыяў перад самай вайной у 1941 г. Ляжыць яна 12 кілямэтраў на поўнач ад Палескае чыгункі каля мястэчка Даманавічы. Соль гэтая ляжыць вельмі глыбака пад зямлёй, аж на 700 мэтраў. Адзначаецца вельмі высокай вартасьцяй гатунку, бо мае аж 92 працэнты чыстага натравага хлёру, пры гэтым не падцякае вадой.

Знаход солі ў Беларусі — зьява бадай што эпахальная, бо натры хлёр побач з вуглём — галоўная сыравіна ўсялякае хімічнае прамысловасьці. Прыкладам, сода, гэты галоўны дадатак да розных хімічных працэсаў, выпрабляецца з солі. Таксама ў штодзённым запатрабаваньні да ежы гэта будзе мець шырокае ўжыцьцё. Здаўна ў нас адчувалася вельмі нястача солі да яды, або цана на яе была вельмі высокая. Гэты знаход будзе мець велізарнае гаспадарскае значэньне для ўсіх краёў паўночна-сярэдняе Эўропы. — «Бацькаўшчына» № 7 (10) з 7 сакавіка 1948.

2) Золата таксама было знойдзена ў 30-ых гадох на берагох ракі Лані каля Клецку. Многа аб гэтым пісала тады віленская прэса. Цьвердзіла яна, што працэнт золата ў глебе замалы, каб эксплёатацыя яго магла аплаціцца.

ВЫСНАЎКІ

З зробленай намі тут хоць бы і вельмі павярхоўнай экскурсіі бачым, што Бацькаўшчына наша ня так ужо «пакрыўджана Богам», як яе прадстаўлялі, ці нават часам яшчэ цяпер прадстаўляюць працаўнікі незалежнасьці Беларусі. Наадварот, мы вельмі шчодра абдораныя рознымі прыроднымі багацьцямі і ў параўнаньні з шмат якімі народамі нат вельмі прывілеяваныя. Вось збольшага прадукты, якія нам нашы прыродныя багацьці дазваляюць як лішкі вывозіць заграніцу ў сырым ці абробленым відзе:

1) Прадукты харчаваньня: розных гатункаў збожжа, бульбу, мяса, сала, масла, рыбу, мёд, мінэральныя воды і калі б нават хацеў гэную «знамянітую» соль.

2) Адзежныя: скуры, воўну, лён, футраныя скуры, шэрсьць.

3) Будаўляныя: лес, цэмэнт, вапну, шкляны пясок, парцалянавую гліну, каштоўныя камяні, зялезную руду.

4) Торф, розныя сырцы для хімікаліяў.

Прадукты, якія б мы патрабавалі прывозіць: алюміні, цынк, волава, медзь.

Але, як бы мы шырака ні разгарнулі сваю індустрыю і промысел, выдаткі на гэтыя прывожаныя прадукты ніколі б не дараўняліся і ў шостай частцы таго, што мы мелі б ад вышэй пералічаных нашых вывазных магчымасьцяў.

Значыць, зусім сьмела й спакойна можам прыступіць да будовы нашай незалежнай дзяржавы, не баючыся ані трошкі, што яна будзе дэфіцытная.

Пры належным жа выкарыстаньні ўсіх прыродных багацьцяў Беларусі, пры разьвітку прадуктыўных сілаў і здольнасьцяў беларускага народу, на велічэзных прасторах нашай Бацькаўшчыны ў 380.000 кв. кілямэтраў, можа сьмела й па-людзку пражыць каля 50.000.000 народу, калі б мы дайшлі да гушчыні

Здымак А.Клешчука

насельніцтва Нямеччыны і да 90 млн., калі б дайшлі да гушчыні Бэльгіі. Сяньня ж на нашай прыгожай, здаровай і багатай прыроднымі рэсурсамі Бацькаўшчыне не жывуць, а жывацеюць толькі 17-18 мільёнаў.

Могуць у кагосьь паўстаць гэткія сумлю́ныя пытаньні: «Хіба ж акупант зацікаўлены ва ўтрыманьні ўбоства нашага народу, хіба ж ім (акупантам) не было б таксама карысьней, каб край наш разьвіўся як належыць і працьвітаў гаспадарча?» Лягічна яно гэтак бы і выглядала. На жаль, лёгіка гэта ніяк ня вяжацца зь лёгікай акупацыі, асабліва нашых акупантаў з уроджанай ім псыхікі «цэнтралістых» і «ўраўнілаўцаў».

А гэта вось чаму:

У эканоміцы дзеіць так званы закон гаспадарчае канглямэрацыі: паўстань і разьвіся якаясьці адна дзялянка вытворства, яна адразу выклікае да паўстаньня другую, другая трэцюю і гэтак далей, аж пакуль усё гэта ня скруціцца ў адзін суцэльны гаспадарчы клубок.

Зьвязок гэтых паасобных дзялянак, выклікаўшых да жыцьця адна другую, робіцца яго жыламі, цэнтру — сэрцам. А калі ў нутры такога клубка-канглямэрату будзе народ з адменнай псыхікай, культурай, звычаямі і абычаямі ад акупанта, дык клубок гэты, раней ці пазьней, адлушчываецца ад арганізму, да якога ён быў штучна прыклееены палітычна. Гэтак было заўсёды і ўсюды — і гэтак ёсьць і на Беларусі пад акупацыяй, бо' гэта закон.

Паўстаньне Чэскай дзяржавы найяскравейшы гэтаму прыклад. Аўстрыяцкая імпэрыя і не агледзілася, як ад яе адкацілася «Багэмія», вытварыўшыся з такога гаспадарчага «клубка» ў аўтаномны ў поўным сэнсе арганізм яшчэ шмат раней да прагалошаньня незалежнасьці Чэхаславацкае Рэспублікі.

Ангельцы як народ мудры, разумеючы, што прыродным сілам закону нельга супраціўставіцца, самі ў належны час адступаюць, заховываючы прыязныя адносіны з такімі цэнтрамі, якія ад іх адкочваюцца, як гэта было з Канадай, з Аўстраліяй, і як цяпер яны зрабілі зь Індыяй.

Беларускі ж «клубок» яшчэ больш арыгінальны, яшчэ менш ліпкі да якогась чужога арганізму. Ужо ў 10-м стагодзьдзі на нашай зямлі існаваў самастойны гаспадарча-культурны і палітычны цэнтар, а ў 13-м стагодзьдзі — магутная Беларуская дзяржава, пад назовам Вялікага Княства Літоўскага, якая праіснавала амаль да канца 18-га ст. Пэўне ж арганізм такі ня мог паўстаць штучна.

Геалягічная структура, яе натуральныя, дапаўняючыя адно другіх багацьці, нат яе вонкава-прыродны краявід, зьвязаны між сабой густой сеткай водных шляхоў, як бы самой прыродай вызначаны да паўстаньня аднаго гаспадарчага цэнтру, прызначанага для аднаго якогась народу. І як мы бачылі — яно так і было цягам амаль 800 гадоў.

Акупантам нашым таму зусім ня трэба было ламаць галаву, ведаць ці дагадвацца аб існаваньні якіхсь законаў эканамічнай канглямэрацыі, каб быць абярэжнымі з выкліканьнем прадуктыўных сілаў Беларусі, бо яны ўжо ведалі з практыкі, што ў такім разе землі гэтыя ім бы не ўдалося ўтрымаць.

Працяг на старонцы 16.

Мілярад Павіч

ХАЗАРСКІ СЛОЎНІК

З Чырвонае Кнігі

АТЭХ (IX стагодзьдзе) — хазарская прынцэса, чый удзел у палеміцы вакол хазарскага хросту быў вырашальны. Імя яе тлумачыцца як скарот чатырох станаў сьвядомасьці ў Хазараў. Уночы на кожным павеку ў яе было напісана па літары, накшталт тых, што пішуць на павеках коням перад спаборніцтвам. Літары былі з забароненага хазарскага альфабэту, у якім кожны знак забіваў, як толькі быў прачытаны. Літары пісалі сьляпыя, а раніцай, перад умываньнем, прыслужніцы прыбіралі прынцэсу зажмурыўшыся. Так яна была абароненая ад ворагаў пакуль спала. А гэта ў Хазараў лічылася часам, калі чалавек найбольш безабаронны. Атэх была вельмі прыгожая й пабожная, літары цалкам ёй пасавалі, а на стале ў яе стаяла заўсёды сем гатункаў солі, і перш чым узяць кавалак рыбы, яна кожны раз мачала пальцы ў іншую соль. Так яна малілася. Пра яе кажуць, што яна мела й сем твараў, як сем соляў. Паводле аднаго паданьня, кожнае раніцы яна брала люстэрка й сядала маляваць: адзін раб або рабыня, заўсёды новы або новая, прыходзілі пазіраваць. А яна кожнае раніцы з свайго твару ствярала новы твар, нябачаны дагэтуль. Паводле іншых апавяданьняў, Атэх увогуле не была прыгожая, але перад люстэркам практыкавала свой твар, каб надаць яму такі выраз і так укласьці яго рысы, каб ён зрабіўся прыгожы. Гэтая практыкаваная прыгажосьць патрабавала ад яе вялікіх фізычных намаганьняў, і як толькі прынцэса заставалася адна й дазваляла сабе адпружыцца, яе прыгажосьць рассыпалася, як яе соль. Ва ўсялякім разе адзін рамейскі (візантыйскі) цар называў «хазарскім тварам» славутага філёзафа й патрыярха Фотыя, што магло значыць або патрыярхава сваяцтва з Хазарамі або крывадушнасьць.

Паводле Даўбмануса, абодва прыпушчэньні невыпадковыя. Хазарскім тварам называецца свомасьць усіх Хазараў, а ў тым ліку й прынцэсы Атэх, прачынацца штодня некім іншым, з зусім новым і незнаёмым тварам, так што часам і найбліжэйшыя родзічы зь цяжкасьцю пазнаюць адны адных. Падарожнікі, зноў жа, адзначаюць, што хазарскія твары ўсе аднолькавыя й ніколі не мяняюцца, і адгэтуль усе цяжкасьці й блытаніна. Аднак, як бы там ні было, сутнасьць рэчы не мяняецца: хазарскі твар — значыць твар, які цяжка запамінаецца. Гэтым можа быць вытлумачаная легенда, у якой гаварылася, што прынцэса Атэх мела асобны твар для кожнага ўдзельніка хазарскае палемікі ў каганавым двары, або нават што йснавала тры прынцэсы Атэх — адна для ісламскага, другая для хрысьціянскага й трэцяя для гэбрайскага місыянэра й тлумача сноў. Фактам, аднак, застаецца тое, што яе прысутнасьць у хазарскім двары не была заўважаная тагачаснаю хрысьціянскаю крыніцай, напісанай па-грэцку й перакладзенай на славянскую мову (*Жыцьцё Канстанціна Салунскага* — Сьв. Кірыла), аднак, паводле *Хазарскага слоўніка*, аднаго часу ў грэцкіх і славянскіх манаскіх колах існавала нешта накшталт культу прынцэсы Атэх. Гэты культ узьнік у сувязі зь вераю ў тое, што Атэх у палеміцы перамагла гэбрайскага тэоляга й прыняла хрысьціянства разам з каганам, які ёй, зноў жа, невядома кім даводзіўся — бацькам, мужам ці братам. Захаваліся ў перакладзе на грэцкую мову й дзьве малітвы прынцэсы Атэх, якія ніколі не былі кананізаваныя, але Даўбманус падае іх як *Ойча наш* і *Радуйся, Марыя!* хазарскай прынцэсы. Першая з гэтых малітваў гучыць так:

На караблі нашым, мой ойча, матросы поўзаюць, як мурашы, я вымыла яго ўраньні валасамі, і яны паўзуць па чыстых мачтах і цягнуць у свой мурашнік зялёныя ветразі, як салодкае лісьце; стырнік спрабуе завяліць стырно й закінуць яго сабе на сьпіну, як здабычу, якою ён мае жывіцца цэлы тыдзень; тыя, хто найслабейшы, цягнуць салоную аснаду й зьнікаюць зь ёю ў вантробе нашага плывучага дому. Толькі ты, мой ойча, ня маеш права на голад, падобны да іхнага. У гэтым паглынаньні хуткасьці табе, маё сэрца, мой адзіны бацька, прыпадае найхутчэйшая доля. Ты жывісься разломленым ветрам.

Другая малітва прынцэсы Атэх нібыта тлумачыць гісторыю яе хазарскага твару:

Я вывучыла на памяць жыцьцё сваёй маці і як нейкую тэатральную ролю штораніцы адну гадзіну адыгрываю матчына жыцьцё перад люстэркамі. Гэта трывае дзень пры дні, гадамі. Я раблю гэта, убраўшыся ў матчына адзеньне, трымаючы яе веер, прычасаўшыся, як яна, бо зрабіла сабе ўчасаньне на выгляд ваўнянае шапкі. Адыгрываю яе й перад іншымі, і ў пасьцелі майго любага. У хвіліны жарсьці я й ня йсную зусім, я — ня я, а яна. І тады я граю так добра, што мая жарсьць зьнікае, застаецца толькі яе. Іншымі словамі, яна ў мяне ўперад пакрала ўсе пяшчоты каханьня. Але я яе не папракаю, бо ведаю, што й яе свайго часу гэтак жа сама абакрала яе маці. Калі ў мяне цяпер спытаюцца, чаму я столькі граю, я адкажу: я спрабую яшчэ раз нарадзіць сябе, але яшчэ лепшую...

Пра прынцэсу Атэх ведама, што яна так ніколі й ня здолела памерці. Аднак, існуе адзін запіс, выразаны на нажы, аздобленым мярэжыстым узорам, які распавядае пра яе сьмерць. Гэтае непацьверджанае й малаверагоднае паданьне зьмясьціў і Даўбманус, але не як аповед пра тое, як прынцэса Атэх рэальна памерла, але як магло стацца, што яна ўвогуле магла памерці. Як ад віна валасы не сівеюць, так і ад пераказу гэтага паданьня ня будзе ніякае шкоды. Вось яно:

Хуткае й павольнае люстэрка

Аднойчы ўвесну сказала прынцэса Атэх: — Я прызвычаілася да сваіх думак, як да сваіх убораў. Яны маюць заўсёды той самы аб'ём таліі, і я бачу іх паўсюль, нават на скрыжаваньнях. І што найгорай — праз іх болей не відны самі скрыжаваньні.

Дзеля забавы слугі аднойчы прынесьлі прынцэсе два люстэркі. Яны няшмат розьніліся ад астатніх хазарскіх люстэрак. Абодва былі зробленыя з шліфаванае солі, але адно зь іх было хуткае, а другое — павольнае люстэрка. Усё, што тое хуткае брало, адлюстроўваючы сьвет, пазычана ў будучыні, другое, павольнае, вяртала, сплочваючы доўг першага, аднак у дачыненьні да сучаснасьці яно пазьнілася роўна настолькі, наколькі першае сьпяшалася. Калі да прынцэсы Атэх прынесьлі люстэркі, яна яшчэ была ў ложку й зь яе павекаў яшчэ не былі змытыя літары. У люстэрках яна ўбачыла сябе з апушчанымі павекамі й адразу памерла. Яна загінула паміж двума міргненьнямі вачэй або, дакладней кажучы, яна першы раз прачытала на сваіх павеках забойчыя літары, бо міргнула ў папярэдняе й наступнае імгненьне, а люстэркі гэта паказалі. Яна памерла забітая адначасна літарамі з мінулага й будучыні.

Зь Зялёнае Кнігі

АТЭХ (пачатак IX стагодзьдзя) — паводле ісламскага паданьня, на двары хазарскага кагана жыла нейкая ўладарова сваячка, ведамая з свае прыгажосьці. Перад яе пакоямі стаялі вялізныя вартаўнічыя сабакі з срэбнаю поўсьцю й білі хвастом самі сабе па вачох. Яны былі навучаныя стаяць нерухома, і часам можна было бачыць як яны, не кранаючыся зь месца, мачыліся сабе пад пярэднія ногі. Нібы груду камянёў перакочвалі яны ў глотцы пагрозьлівыя зычныя гукі, а перад сном скручвалі за сабой свае даўгія хвасты, як карабельную аснаду. Атэх мела срэбныя вочы й насіла замест гузікаў званочкі, каб людзі на вуліцы маглі ведаць, ці прынцэса ў двары адзяваецца або разьдзяваецца перад спачынкам. Аднак гэтых яе званочкаў ніхто ніколі ня чуў. Як памятаюць, прынцэса была надзеленая й незвычайнай павольнасьцю. Дыхала яна радзей, чым іншыя чыхаюць, і ў сваёй млявасьці пеставала страшную нянавісьць да ўсяго і ўсіх, хто хацеў бы змусіць яе да хутчэйшага дзеяньня, нават калі рэч, якую яе прымушалі рабіць, яна й сама зьбіралася зрабіць як найхутчэй. Як падкладка ў гэтай адзежыне павольнасьці, у яе гаворцы выяўлялася й другая схільнасьць — яна ніколі доўга не затрымвалася на адной тэме і гаворачы зь людзьмі пераскоквала, як птушка з галінкі на галінку. Але затое праз некалькі дзён яна зноў нечакана вярталася да распачатае размовы й працягвала тую тэму, на якую некалі адмовілася гаварыць, заблукаўшы ў сваіх дрыготкіх думках. Гэтае неадрозьніваньне важнага ад пабочнага ў размове й поўная абыякавасьць да ўсіх тэмаў тлумачацца тым няшчасьцем, якое надарылася прынцэсе падчас хазарскай палемікі. Рэч у тым, што Атэх была пясьнярка, і адзінае, што захавалася ад яе аўтэнтычных словаў, гучыць: «Розьніца паміж двума *так* можа быць большая, чым паміж *так* і *не*». Астатняе толькі прыпісваецца ёй.

Лічыцца, што ў арабскім перакладзе захавалася пэўная колькасьць яе песьняў або тэкстаў, што ўзьніклі дзякуючы яе стараньням. Асабліва прыцягнулі ўвагу дасьледнікаў хазарскага побыту часоў наверненьня гэтага народу песьні, прысьвечаныя хазарскай палеміцы. Паводле

Умбэрто Эко

НА ЖАЛЬ, МУСІМ ВЯРНУЦЬ ВАМ ВАШ РУКАПІС...

Ананімны аўтар. «Біблія»

Мушу прызнацца, што першыя пару сотняў старонак гэтага рукапісу напраўду мяне захапілі. Напоўненыя дзеяньнем, яны маюць усё, што сёньняшні чытач патрабуе ад добрага рамана. Сэкс (і шмат сэксу, улучна з чужаложствам, гомасэксуалізмам, кровазьмяшэньнем), а таксама забойствы, вайна, разьня й г. д.

Разьдзел пра Садом і Гамору з травэстытамі, якія спрабуюць зьвесьці анёлаў, варты самога Рабле; гісторыя пра Ноя — гэта чысты Жуль Вэрн; уцёкі зь Эгіпту так і просяцца быць экранізаванымі. Іншымі словамі, сапраўдны баявік, добра збудаваны, з мноствам паваротаў сюжэту, поўны арыгінальных вынаходак, з патрэбнаю доляю пабожнасьці, і пры гэтым без ухілаў у трагедыю.

Але чытаючы далей я зразумеў, што гэта хутчэй анталёгія, дзе ўдзельнічаюць некалькі аўтараў, дзе шмат — нават зашмат — паэтычных уставак, а таксама зусім нудных і сэнтымэнтальных разьдзелаў ды бессэнсоўных ерэміядаў.

У выніку атрымваецца пачварная мешаніна. Рукапіс, здавалася б, мае штосьці для кожнага, а ўрэшце выходзіць, што ён ня зьвернуты да нікога. Да таго ж, давялося б ламаць галаву над тым, як набыць аўтарскія правы ад усіх гэтых аўтараў, калі б толькі за гэта ня ўзяўся сам укладальнік. Дарэчы, імя ўкладальніка нідзе ў рукапісе не пазначана, нават у выходных зьвестках. Ці варта было гэтак хавацца?

Я прапаную паспрабаваць набыць правы толькі на пяць першых разьдзелаў. Тут мы стаім на цьвёрдым грунце. Варта было б знайсьці й лепшы назоў. Як наконт «Адчайныя валацугі з Чырвонага мора»?

Гамэр. «Адысэя»

Асабіста мне кніга спадабалася. Добры сюжэт, захапляльны й поўны прыгодаў. Не бракуе й пра каханьне — і пра вернасьць шлюбу, і пра здраду (Каліпса — выдатная гераіня, сапраўдная людаедка); ёсьць нават нешта ад Лаліты — у малалетняй Наўзыкаі, дзе аўтар відавочна недагаворвае, але ўсё й так зразумела. Вялікі драматызм, аднавокі гігант, канібалы, нават наркотыкі, аднак у межах закону, бо, наколькі мне ведама, у сьпісе Бюро Наркатычных Сродкаў лотусу няма. Фінальная сцэна ў найлепшых традыцыях вэстэрну: пару крутых маханьняў кулакамі, а эпізод з лукам — проста шэдэўр прыгодніцкага жанру.

Што можна сказаць? Кніга чытаецца лёгка, ня тое, што першая кніга таго самага аўтара, занадта статычная, з назольным адзінствам месца, з нудным перагружаным сюжэтам. Дачытаўшы да трэцяе бітвы й да 10-га двубою, ужо ведаеш усё наперад. Зусім іншая справа гэтая другая кніга: чытаецца запоем. Тон у ёй спакайнейшы, узважаны, але не абцяжараны. А яшчэ кампазыцыя, рэтраспэкцыі, аповед у аповедзе... Адным словам, гэты Гамэр — гэта тое, што трэба. Талковы аўтар.

Можа, занадта талковы. Узьнікае пытаньне, ці ён напраўду аўтар усяе гэтае кнігі. Ясная рэч, я ведаю, што з досьведам аўтар набірае майстэрства (ягоная трэцяя кніга, магчыма, будзе сэнсацыяй), але што мяне непакоіць — і ўрэшце прымушае мяне прыняць адмоўнае рашэньне — гэта поўны гармідар з аўтарскім правам. Па-першае, дзе шукаць аўтара — невядома. Тыя, хто яго ведаў, кажуць, што зь ім было немагчыма спрачацца аб нейкіх зьменах у тэксьце, бо ён быў сьляпы, як крот, ня мог сачыць за рукапісам і, здавалася, нават не зусім быў зь ім знаёмы. Ці сапраўды ён напісаў гэтую кнігу, або толькі падпісаў яе?

Дантэ Аліг'еры. «Боская камэдыя»

Гэты Аліг'еры — тыповы аматар папісаць у вольную часіну. (У штодзённым жыцьці ён дзейны сябар гільдыі фармацэўтаў). І ўсё ж ягоны твор выяўляе бясспрэчнае тэхнічнае ўмельства й значны апавядальны почут. Напісаная флярэнтыйскай гаворкай кніга складаецца з каля сотні рыфмаваных разьдзелаў, шмат якія зь іх цікавыя й лёгка чытаюцца. Мне асабліва спадабаліся астранамічныя апісаньні й некаторыя сьціслыя правакацыйныя тэалягічныя заўвагі. Трэцяя частка кнігі найлепшая й будзе мець шырокі водгук. Яна ахапляе тэмы агульнае цікавасьці, клопаты звычайнага чытача — збаўленьне душы, боганатхнёныя ўявы, малітвы да Сьвятой Дзевы. Аднак першая частка цьмяная й незразумелая, з кавалкамі таннае эротыкі, гвалту й непрыхаваных зьверстваў. Але найбольшая няўдача ў тым, што аўтар выбраў свой мясцовы дыялект (напэўна, пад уплывам нейкай эксцэнтрычнай авангардысцкай ідэі). Усе мы ведаем, што сёньняшняя лаціна патрабуе прыліву сьвежае крыві — і гэта ня прыхамаць нейкіх дробных літаратурных груповак. Але ўрэшце ёсьць свая мяжа — калі не ў законах самой мовы, дык прынамсі ў здольнасьці публікі зразумець такі тэкст.

Д.А. Франсуа Сад. «Юстына»

Гэты рукапіс быў сярод вялікай кучы папераў, якія я мусіў пераглядзець за гэтыя выхадныя, і таму, шчыра кажучы, я не пасьпеў прачытаць яго цалкам. Я разгарнуў яго наўдачу ў трох розных месцах, што, як вы ведаеце, дастаткова для спрактыкаванага вока.

Дык вось, першы раз на мяне абрынуўся слоўны абвал, старонка за старонкаю, пра філязофію прыроды, пра жорсткія адхіленьні ў барацьбе за выжываньне, пра размнажэньне расьлінаў і цыклічнасьць жывёльных відаў. Другі раз: як

аднаго меркаваньня, гэта былі песьні каханьня й толькі дадаткова былі ўжытыя як аргумэнты ў прыгаданай палеміцы, калі летапісцы тае палемікі пачалі занатоўваць падзеі. Як бы там ні было, у той палеміцы Атэх удзельнічала зь вялікім запалам і пасьпяхова перамагла і гэбрайскага і хрысьціянскага ўдзельніка палемікі, так што ўрэшце дапамагла ісламскаму прадстаўніку, Фарабі Ібн Коры, і разам з хазарскім каганам, сваім гаспадаром, перайшла ў іслам. Грэк, які браў удзел у палеміцы, адчуўшы, што прайграе, аб'яднаўся з гэбрайскім пасланцом, і яны супольна асудзілі прынцэсу Атэх на адданьне падземным сілам двух пеклаў — гэбрайскаму Бэліялу і хрысьціянскаму Сатане. Каб ня скончыць гэтак, Атэх пастанавіла з свае волі ўцячы ў трэцяе пекла, да ісламскага Ібліса. Ня могучы цалкам адмяніць моцы двух другіх пеклаў, Ібліс забраў у яе плоць, асудзіў яе на забыцьцё ўсіх сваіх песьняў і свае мовы, апроч аднаго слова «ку», але дараваў ёй вечнае жыцьцё. Ён паслаў ёй злога духа на ймя Ібн Хадраш, які зьявіўся ёй у аблічы стравуса, і ён выканаў гэты прысуд. Так прынцэса Атэх засталася жыць вечна й магла да кожнай сваёй думкі й да кожнага свайго слова вярнуцца зноў незьлічоную колькасьць разоў і не сьпяшаючыся, бо вечнасьць прытупіла ў яе адчуваньне таго, што ў часе настае перад і што пасьля. Аднак кахацца яна магла толькі ў сьне. Так прынцэса Атэх цалкам прысьвяціла сябе сваёй сэкце лаўцоў сноў, хазарскіх сьвятароў, якія займаліся стварэньнем нейкага віду зямное вэрсіі таго нябеснага рэгістру, які згадвае *Сьвятая кніга.* Ейнае й іхнае ўменьне дазвалялі ёй у чужыя сны пасылаць загады, свае або чужыя думкі й нават рэчы. Прынцэса Атэх магла зьявіцца ў сьне чалавеку на тысячу гадоў за яе маладзейшаму і магла паслаць любую рэч асобе якая яе сьніць, гэтаксама бясьпечна, як з ганцом на кані, напоеным віном. Толькі шмат, шмат хутчэй... Апісаны адзін такі ўчынак прынцэсы Атэх. Аднойчы яна паклала ў рот ключ ад сваёй спальні і чакала, пакуль не пачуецца музыка і тонкі галасок маладой чалядніцы, які вымаўляў гэткія словы:

— Учынкі ў чалавечым жыцьці — як стравы, а думкі й адчуваньні — як прысмакі. Ня будзе ўдачы таму, хто пасоліць чарэшні або заліе воцтам пірог...

Калі гэтыя словы былі прамоўленыя, ключ зьнік з вуснаў прынцэсы, і яна, як кажуць, ведала, што гэтак адбылася замена. Ключ апынуўся ў таго, каму былі прызначаныя словы, а словы ў замену за ключ, дайшлі да прынцэсы Атэх.

Даўбманус цьвердзіць, што прынцэса Атэх усё яшчэ была жывая за ягоныя часы, і адзін лэўтар XVII стагодзьдзя, нейкі анаталійскі турак на ймя Масуд, сустрэў яе й гаварыў зь ёю. Гэты чалавек вучыўся навуцы лаўцоў сноў і меў у сябе нейкую арабскую вэрсію хазарскай энцыкляпэдыі ці слоўніка, але ў тым часе, калі ён сустрэў прынцэсу, ён яшчэ ня вывучыў усе яго артыкулы, а таму не пазнаў слова «ку», калі прынцэса яго назвала. Гэта слова з хазарскага слоўніка й азначае від садавіны, калі б Масуд яго зразумеў, ён бы здагадаўся, хто перад ім стаіць, і мог бы заашчадзіць усе свае пазьнейшыя намаганьні ў засваеньні навукі; ад нязшчаснай прынцэсы ён мог бы даведацца пра ловы сноў больш, чым зь любога слоўніка. Але ён яе не пазнаў і прапільнаваў свой найбольшы ўлоў, думаючы, што ён ня мае ніякае вартасьці. За гэта, паводле аднаго паданьня, ягоны вярблюд плюнуў яму ў вочы.

З Жоўтае Кнігі

АТЭХ (VIII стагодзьдзе) — імя хазарскай прынцэсы, якая жыла ў часы юдаізацыі хазараў. Даўбманус падае гэбрайскую вэрсію яе ймя з значэньнямі паасобных літараў імя Ат'х:

אטה

Паводле літараў выводзяцца й высновы аб своасьцях хазарскае прынцэсы.

Алеф, першая літара яе ймя, азначае Найвышэйшую карону, мудрасьць, позірк угору й позірк надол, як у маці, якая глядзіць на дзіця. Таму Атэх ня мусіла каштаваць семя свайго каханка, каб ведаць, каго яна народзіць — хлопчыка або дзяўчынку. Бо ў таямніцы мудрасьці ўдзельнічае ўсё, што ўгары й надоле, яна непрадказальная. Алеф гэта пачатак, ён ахапляе ўсе іншыя літары й пачатак выяўленьня сямёх дзён тыдня.

Тэт — дзявятая літара гэбрайскага альфабэту й мае лічбавае значэньне «звычайнае 9». У кнізе *Тмуна* Тэт азначае Шабат, а гэта значыць, што гэта літара ў знаку плянэты Сатурн і божага адпачынку; адпаведна з гэтым, яна значыць і нявесту, бо Субота — гэта нявеста, як выцякае з сказанага ў Еш. XIV, 23; яна зьвязаная з прыборкай мятлою, што мае значэньне разбурэньня й пакараньня бязбожнасьці, азначае яна й сілу. Прынцэса Атэх дапамагла гэбрайскаму прадстаўніку ў славутай хазарскай палеміцы, яна насіла падвешаны на поясе чэрап свайго каханка Мокадасы эль Сафэра, яна карміла яго й паіла сырой зямлёй і салонаю вадою і ўстаўляла яму ў вачніцы валошкі, каб ён мог бачыць сіні колер на тым сьвеце.

Ге — чацьвертая літара Божага ймя. Сымбалізуе руку, сілу, магутны размах, суворасьць (левая рука) і міласэрнасьць (правая), вінаградную лазу, якая паднімаецца зь зямлі й дакранаецца да неба.

Прынцэса Атэх за часы хазарскае палемікі была вельмі красамоўная. Яна казала: — Думкі зь неба завеялі мяне, як сьнег. Я пасьля ледзьве сагрэлася й вярнулася да жыцьця...

Прынцэса Атэх дапамагла Ісаку Сангарыю, гэбрайскаму ўдзельніку хазарскае палемікі тым, што сваімі доваламі зьбянтэжыла арабскага ўдзельніка, і хазарскі каган выбраў юдэйскую веру. Паводле некаторых меркаваньняў, Атэх пісала песьні, і яны захаваліся ў «хазарскіх кнігах», якімі карыстаўся Егуда Галеві, гэбрайскі летапісец хазарскае палемікі. Паводле іншых крыніцаў, Атэх першая й склала слоўнік ці энцыклапэдыю Хазараў з падрабязнымі зьвесткамі пра іх гісторыю, веру, пра чытачоў сноў. Усё гэта было ўкладзена ў цыкл песьняў, разьмешчаных паводле альфабэту, таму й палеміка пры двары хазарскага ўладара была запісаная ў паэтычнай форме. Калі ў прынцэсы Атэх спыталіся, хто пераможа ў палеміцы, яна адказала: «Калі сустракаюцца ў бітве два ваяры, перамагае той, які даўжэй будзе лячыць свае раны». Як цеста на рошчыне пачаў расьці *Хазарскі слоўнік* вакол прынцэсінага зборніку, які, паводле адной крыніцы, называўся *Аб страсьці словаў.* Калі б спраўдзілася дакладнасьць гэтых фактаў, прынцэса Атэх была б першым аўтарам гэтае кнігі, яе першатворцам. Толькі што ў тым першасным слоўніку ў хазарскай мове яшчэ не йснавала цяперашніх трох, гэта быў яшчэ адзін слоўнік і адна мова. Ад таго першапачатковага слоўніка на сёньняшні дзень захавалася вельмі мала, як ад тугі аднаго сабакі, якую дзеці перадаюць другому, пераймаючы сабачы брэх.

Калі каган, дзякуючы стараньням прынцэсы Атэх прыняў малітоўную накідку і Тору, астатнія ўдзельнікі палемікі вельмі раззлаваліся. Таму ісламскі дэман пакараў прынцэсу забыцьцём свае хазарскае мовы і ўсіх сваіх песьняў. Яна нават мусіла забыцца на ймя свайго каханка, адзінае, што засталося ў яе памяці, быў назоў аднаго плода, падобнага да рыбы. Перад тым, як гэта сталася, прадчуваючы небясьпеку, прынцэса Атэх загадала купіць вялікую колькасьць папугаяў, здольных да чалавечае гаворкі. Дзеля кожнага слова *Хазарскага слоўніка* ў двор прыносілі па адным папугаі і навучалі кожнага аднаму артыкулу, і той у любы час ведаў на памяць усе вершы, што датычылі гэтага слова. Ведама ж, тыя вершы былі ў хазарскай мове і ў той мове іх папугаі й пераказвалі. Калі настаў заняпад хазарскае веры, хазарская мова пачала хутка зьнікаць, і тады Атэх выпусьціла на волю ўсіх папугаяў, навучаных хазарскаму слоўніку. Яна сказала: — Ідзеце й навучайце іншых птушак сваім песьням, бо хутка іх ужо ніхто ня будзе ведаць... Птушкі разьляцеліся па лясох чарнаморскага ўзьбярэжжа. Там яны вучылі іншых папугаяў сваім песьням, тыя другія вучылі трэціх, і так у нейкім часе толькі папугаі ведалі тыя песьні й гаварылі хазарскаю моваю. У XVII стагодзьдзі на берагох Чорнага мора быў злоўлены адзін папугай, які ўмеў пераказаць колькі песьняў на незразумелай мове, якую ягоны ўладар, нейкі царградзкі дыплямат на ймя Аўрам Бранковіч, называў хазарскай. Ён загадаў аднаму пісару, каб той увесь час занатоўваў усё, што прамаўляе папугай, спадзеючыся тым самым аднавіць «папугайскія песьні», а папраўдзе паэзію прынцэсы Атэх. Лічыцца, што такім чынам папугайскія песьні трапілі ў Даўбманусава выданьне *Хазарскага слоўніка.*

Трэба сказаць, што прынцэса Атэх была абаронцай наймагутнейшай сэкты хазарскіх сьвятароў, гэтак званых лаўцоў або чытачоў сноў. Яе энцыклапэдыя была нічым іншым, як толькі спробаў сабраць у адным месцы запісы, якія лаўцы сноў назапашвалі стагодзьдзямі, захоўваючы сваю навуку. І яе каханак быў прыхільнікам гэтае сэкты, адным з найбольш славутых сярод іх, ён быў вельмі малады й меў найлепшыя вочы. Адна песьня прынцэсы Атэх прысьвечана гэтай сэкце першасьвятароў:

Калі мы ўвечары сьнім, то папраўдзе мы ўсе ператвараемся ў актораў і адыходзім заўсёды на іншую сцэну адыграць сваю ролю. А ўдзень? Удзень на яве мы вучымся той ролі. Часам мы не вывучваем яе як сьлед і тады не наважваемся зьявіцца на сцэне й хаваемся за іншых актораў, якія тым разам лепш за нас ведаюць свае словы й рухі.

А ты, ты той, хто прыходзіць у залю глядзець нашае прадстаўленьне, а ня граць у ім. Хай твае вочы знойдуць мяне, калі я буду добра навучаная, бо ніхто не бывае мудры й прыгожы ўсе сем дзён тыдня.

Існуе таксама адно паданьне, што гэбрайскія прадстаўнікі на хазарскім двары ўратавалі прынцэсу Атэх ад гневу арабскага й грэцкага місыянэраў тым, што за іхным хадайніцтвам замест яе быў пакараны яе каханак і хазарскі першасьвятар сэкты лаўцоў сноў. Яна пагадзілася, і яго прагналі й замкнулі ў клетцы, што вісела над вадою. І аднак гэта не ўратавала яе ад пакараньня.

Пераклаў з сэрбскахарвацкай Х.З.

найменей 15 старонак пра паняцьце насалоды, пачуцьці і ўяўленьні й г. д. Трэці раз: 20 старонак пра традыцыі падпарадкаваньня паміж мужчынамі й жанчынамі ў розных народаў сьвету. Думаю, гэтага дастаткова. Нам не патрэбны філязофскі трактат. Сёньняшні чытач хоча сэксу, сэксу й яшчэ раз сэксу. У розных відах і формах.

Марсэль Пруст. «У пошуку страчанага часу»

Гэта безумоўна сур'ёзная кніга, можа занадта даўгая, але як сэрыя ў мяккай вокладцы будзе купляцца.

Але так, як ёсьць, яна ня пойдзе. Яна патрабуе грунтоўнага рэдагаваньня. Напрыклад, трэба цалкам перарабіць пунктуацыю. Сказы занадта складаныя, часам яны займаюць цэлую старонку. Калі добра папрацаваць, скараціць кожны сказ максымум да двух-трох радкоў, парабіць больш адступаў, кнігу можна значна паправіць.

Калі аўтар ня згодны — тым горш для яго. Бо цяпер кніга занадта — так бы мовіць — астматычная.

Імануіл Кант. «Крытыка практычнага розуму»

Я папрасіў Сюзан пераглядзець гэта, і яна кажа, што пасьля Барта няма сэнсу перакладаць гэтага Канта. Аднак я ўсё роўна прачытаў рукапіс сам. Невялікая кніга пра маральнасьць магла б цудоўна падыйсьці для нашае філязофскае сэрыі, можа яе нават прынялі б у некаторых унівэрсытэтах. Аднак нямецкі выдавец кажа, што калі мы возьмем гэтую, то мусім зьвярнуцца ня толькі да папярэдняе кнігі аўтара, якая ўяўляе сабою вялізную працу як найменей на два тамы, але й да той, над якою ён цяпер працуе — пра мастацтва або пра меркаваньне, я ня памятаю дакладна. Усе тры кнігі маюць больш-менш той самы назоў, таму іх трэба было б прадаваць у адным футарале (і за цану недаступную ніякаму чытачу); інакш наведнікі кнігарняў будуць блытаць іх між сабою й думаць: «Гэта я ўжо чытаў».

Ёсьць яшчэ адна праблема. Нямецкі агент кажа мне, што нам варта было б надрукаваць і меншыя працы гэтага Канта, цэлую гару, улучна з нейкімі кнігамі пра астраномію. Я б параіў ня зьвязвацца з гэтым чалавекам; бо інакш ягонымі кнігамі будуць заваленыя ўсе нашыя склады.

Франц Кафка. «Працэс»

Цудоўная кніжка. Трылер з элемэнтамі Хічкока. Забойства ў фінале, напрыклад. Магла б мець шырокага чытача.

Аднак відавочна аўтар пісаў ва ўмовах суворае цэнзуры. Інакш на што ўсе гэтыя няясныя спасылкі, гэтыя хітрыкі зь неназываньнем людзей і мясьцінаў? І за што галоўнага героя судзяць? Калі высьветліць усе гэтыя моманты й канкрэтызаваць абстаноўку (патрэбныя факты: факты, факты, факты), тады лягчэй будзе сачыць за сюжэтам і напружаньне будзе забясьпечана. Сапраўдны пісьменьнік заўсёды мусіць памятаць пяць пытаньняў старога журналіста: Хто? Што? Калі? Дзе? Чаму? Калі нам будзе дадзена свабода ў рэдагаваньні — я б гэта ўзяў. Калі не — не.

Джэймс Джойс. «Хаўтуры па Фінэгану»

Калі ласка, скажыце загадчыку рэдакцыі, каб ён быў больш уважлівы, калі высылае кнігі на заключэньне. Я чытаю англамоўныя рукапісы, а вы даслалі мне кнігу на нейкай іншай, нявeдамай Богу мове. Вяртаю вам яе ў асобнай папцы.

Пераклад зь італійскае АА

Лёнданская лекцыя

Працяг са старонкі 13.

Дзеля таго акупант у першую чаргу стараўся калянізаваць нашыя землі сваім пэўным элемэнтам, апановываць іх адміністратыўны і гаспадарча-творчы апарат, адсоўваючы нас убок, нішчачы найбольш цэнныя культурныя адзінкі і найбольш сьведамы нацыянальны элемэнт, вывозячы яго мільёнамі ў свае недры. Яго ж «гаспадарчыя» пляны палягалі ў тым, каб парабаваць як найбольш таго, што найлягчэй даецца. Таму наша гаспадарка ніякім чынам не магла разьвівацца, бо яна эксплёатавалася, як кажуць, па–«хіжацку».

Зразумела, што такая сыстэма «гаспадараваньня» не магла ня выклікаць гаспадарчага застою, абядненьня нашага народу. Рэжым такі ня мог утрымацца інакш, як толькі пры помачы палітычнага тэрору, тыраніі. Але тыранія ня можа сяньня быць легалізаванай, бо апрача таго, што яна абурае пэўную, найбольш гуманную частку людзтва — выступае яшчэ больш важны мамэнт — агульналюдзкіх гаспадарчых інтарэсаў. Тут гэтаксама прыходзіць нам на помач адзін эканамічна-гаспадарчы закон: неразрыўны зьвязок агульнасьветавой гаспадаркі.

Немагчымасьць зрэалізаваньня аўтаркії прывяла людзтва да так званага гандлёвага абмену таварамі між паасобнымі дзяржавамі, што спэцыялізуюцца ў пэўных напрамках вытворчасьці. Кожная ж тыранія, з натуры сваёй, калі ня ў стане запанаваць над усім сьветам, дык тады, пры найменшым, замыкаецца «ў собскіх межах», у якіх ёй удалося запанаваць, а гэта выклікае параліж у іншай вольнай частцы сьвету. Гэты іншы сьвет, зразумела, ня можа з тым зьмірыцца, бо найперш — ён ня можа гэтак спаралiжавана жыць пад няўпынный пагрозай небясьпекі тыраніі, а самае галоўнае ў зьвязку з поступам сучаснай тэхнікі (вынахадам атомнай энэргіі асабліва).

Выходзячы з такіх асноў і была развалена надовячы на нашых вачох адна тыранія — гітлероўская, на руінах якой вярнуўся да жыцьця цэлы шэраг вялікіх і дробных народаў, як Францыя, Бэльгія, Галяндыя, Люксэмбург і іншыя. А цяпер падымаюцца галасы перадавых палітыкаў найвялікшых дзяржаў супраць другой тыраніі. І няма таксама сумліву, што рана ці позна сьвет пазбавіцца і гэтай другой тыраніі, а на руінах яе паўстане да жыцьця новы шэраг вольных народаў, якіх прыгнечана дарэшты прыродна-арганічнае разьвіцьцё. Сярод іх паўстане і Народ Беларускі.

Тады ў гэтым агульнасусьветным гаспадарчым і культурным жыцьці Беларускі Народ, як адно з сьветавых зьвеньняў, зойме належнае яму месца, а прыйшоўшыя да дзяржаўнага кіраўніцтва людзі, бязьмежна любячыя свой край і народ, «як самых сябе» — дадуць нармальны ход разьвіцьцю прадуктыўных і культурных сілаў Маладой Беларусі.

Зразумела, на руінах і на спустошэньні нашых земляў акупантам пачаткі будуць нялёгкія. Патрэбна будзе нямала аснаўнога, закладовага — паважную частку яго мы ўжо маем — капіталу — гэта маральныя якасьці нашага народу, яго чуцьцёвасьць, яго прыроджаны гаспадарчы розум, гарт і вытрываласьць у адпорнасьці на ўсялякія чужацкія наскокі.

Нашы ж капіталы заграніцай — гэта наша моладзь, гэта ўсе ВЫ. Трэба толькі захаваць іх на нашым «конце», каб іх не расхапалі спэкулянты, чужакі і ўсялякія хітрыя махляры. Захаваць гэты капітал і ўзгадаваць на ім яшчэ працэнт мы можам лёгка, але толькі ў сваіх собскіх беларускіх арганізацыях у штодзённай, будней працы, у дружным сяброўскім спажыцьці, еднасьці, згодзе, салідарнасьці.

Данясём гэта ўсё дадому — нічога больш ня будзе патрэбна. Рэшту ўсяго знойдзем у Беларусі — маем усяго ў дастатку.

Я пэўны, што й ВЫ так, як цяпер шчыльнымі радамі сядзіцё, гэтак жа шчыльнымі радамі, шырокім крокам пайдзяцё праз нашыя палеткі, праз вёскі, гарады пад гулкія воклікі Вашых родных — ЖЫВЕ БЕЛАРУСЬ!



Здымак А.Клешчука

У Рэспубліцы Беларусі, краінах СНГ і Балтыі «Нашу Ніву» можна выпісаць у кожным аддзяленьні сувязі. Індэкс 63125.

Калі Вас цікавіць жыцьцё на Гарадзеншчыне, Беласточчыне й Віленшчыне, дык падпішыцеся на газэту «Пагоня». У 1920 г. яна выходзіла ў Вільні й Коўне, летась аднавілася й выдаецца як рэгіянальны агляд у Горадні. «Пагоню» можна выпісаць на другое паўгодзьдзе ў любым паштовым аддзяленьні Рэспублікі Беларусі. Індэкс 631224.

РЭГІЯНАЛЬНЫ АГЛЯД:

ГОРАДНЯ
БЕЛАСТОК
ВІЛЬНЯ

Кожны тыдзень папятніцах

Падпіска ў любым аддзяленьні сувязі

Індэкс 63124

ПАГОНЯ

На выданьне «НН»

ахвяравалі:

Альбіна Чапкоўская — 500 руб.
Зьміцер Бартосік — 3000 tln.

Вялікі дзякуй!

На беларускую школу ў Вільні

ахвяравалі:

Сп. Кіпелі — $ 50
Сп. Станкевічы — $ 40
Сп. Вячаслаў Станкевіч — DM 300

На беларускае аддзяленьне факультэта ставістыкі Віленскага пэд. унівэрсытэту

ахвяравалі:

Праф. Барыс Кіт — DM 300
Сп. Юрка Сянькоўскі — DM 300
Сп. Паўла Урбан — DM 300
Сп. Ларыса Урбан — DM 300
Сп. Вячаслаў Станкевіч — DM 300

Шчыра дзякуем за дапамогу беларускай школе ў Вільні.

Загадчыца Катэдры
Беларусістыкі ВПУ Л.Плыгаўка

ПАШТОВАЯ СКРЫНКА

А.Г. з Гомля. Тое, што запомнілася: «Зьбіраю пярліны чалавечае абмежаванасьці й складаю іх разам з грашыма», «Добра быць Хрыстом, ведаючы аб будучым уваскрасеньні», «Некаторыя глядзяць Расеі ў рот і бачаць там сьвятло ў канцы тунэля», «Усе казкі адбываюцца ў вёсцы. У горадзе — навэлы», «Загад: Тралейбусы, што рухаюцца па вуліцы Камуністычнай, загадваю лічыць варожымі танкамі!». Афарызмы — асабліва агульнафілязофскага зьместу — у моры літаратуры (запісанай і вуснай) ужо, бадай, не ідэнтыфікуюцца. Як думкі. Загана жанру — у ягонай эпігоннасьці. Хоць прыродныя эпігоны звычайна афарызмаў якраз ня пішуць. Але жанр ураўняе зь імі любога. Пішыце абразкі. Гэта пакуль яшчэ ідэнтыфікуецца.

А.М. зь Менску. «Беларусь не прастытутка: ні за газ, ні за нафту маскалям не прадасца». З усіх дасланых нам вершаў мы адабралі толькі гэта — магчыма таму, што ў астатніх бракуе такой шчырай, адкрытай прастаты; ці таму, што якраз гэта ў «рэспубліканскай пэрыёдыцы», дзе Вы друкуецеся, у Вас ня возьмуць.

В.А. з Магілёву. Мабыць, у Вас знойдзецца нямала чаго сказаць на ўсякую тэму. І кожнага разу Вы будзеце скончаць глябальнымі пытаньнямі: а ці ня вычарпала сваю ролю літаратура? А ці мае пэрспэктыву адраджэньне?.. Гэта нагадвае развагі над праблемай цьвіка і сьцяны... І літаратура, і адраджэньне — гэта пэўнае дзеяньне, тым больш прадуктыўнае, чым больш канкрэтнае і прафэсійнае. Трэба добра ведаць прадмет, каб спадзявацца выказаць пра яго небанальную, дзейсную думку. Тое, што Вы пішаце, не дае адказаў і ня будзіць уяўленьне. Каб дасягуць плёну — напішыце пра сябе і пра свой горад — тое, што Вы мусіце ведаць найлепш.

НАША НІВА Беларуская газэта. Заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991. **Рэдакцыйная Рада:** Уладзімер Арлоў, Сяргей Астраўцоў, Ігар Бабкоў, Адам Глёбус, Алег Дзярновіч (афіцыйны прадстаўнік Рэдакцыі ў Менску), Сяргей Дубавец (рэдактар), Лявон Луцкевіч, Алег Мінкін, Генадзь Сагановіч, Сяргей Харэўскі (мастацкі рэдактар), Алесь Чобат, Сяргей Шупа (адказны сакратар). **Заснавальнік і выдавец** Павал Жук. **Адрасы Рэдакцыі:** Вільня, вул. Жыгімонта 12/2, **тэл.** 224161, **для дописаў:** 2041 Вільня а/с 2082, або 220123 Менск а/с 71. Афсэтны друк. Фамат А3. Агульны наклад 20 тыс.
Друкарня выдавецтва «Беларускі Дом Друку». Замова 990

ПАДПІСКА У межах Рэспублікі Беларусі *Нашу Ніву* можна выпісаць у любым аддзяленьні сувязі. Індэкс: 63125. У пытаньнях падпіскі й рассылкі за межы Беларусі й СНГ зварачайцеся на адрас: Siarhiej Šupa, Vasaros 7, 2055 Vilnia, Lithuania.